ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС
№7 (1054), ЛІПЕНЬ, 2021
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка. Эканоміка. Культура
ISSN 0320-7544

# ТАКІ ЗАПАМІНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬНЫ НАСТРОЙ



ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАННЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» — НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

## Газета для суайчыннікаў, якую чытаюць па ўсім свеце



ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● № 6 (3642) ● ПАНЯДЗЕЛАК, 21 ЧЭРВЕНЯ, 2021

ВЫДАННЕ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY

Кветкі на плітах Монтэ-Касіна. Стар. 4

Родны вобраз Еўфрасінні. Стар. 5

Кожнае слоўца душой вычувау. Стар. 6

СВЕТАПОГЛЯД

І ніяк не закончыцца тая вайна...

80 гадоў таму, 22 чэрвеня 1941 года, пераварнуўся звыклы мірны свет, у якім жылі, працавалі, гадавалі дзяцей нашы бацькі, дзяды, прадзеды

ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

Блізкія людзі з "Берега дружбы"

# ЗМЕСТ




БЕЛТА

**4** **Сімвал Незалежнасці**

З ліпеня Беларусь адзначыла сваё галоўнае свята. У гэты дзень Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка выступіў з прамовай на цырымоніі ўскладання вянкоў і кветак у мемарыяльным комплексе "Курган Славы"

**8** **З нагоды адметнай даты**

Віншаванні з Днём Незалежнасці паступілі ў адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і інтэграцыйных аб'яднанняў, замежных палітычных і грамадскіх дзеячаў

БЕЛТА




**14** **Планам наканавана спраўджвацца**

Ключавая тэма сустрэчы і абмеркаванняў на VIII Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі — дзелавыя кантакты ў эпоху высокіх тэхналогій




БЕЛТА

**21** **Супрацоўніцтва з патэнцыялам**

Палітычны ўзаемадавер Беларусі і Кітая бесперапынна ўмацоўваецца. Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Се Сяоюн на міжнароднай анлайн-канферэнцыі "Беларусь і Кітай: агульная траекторыя развіцця"

**22** **Такі запамінальны фестывальны настрой**

Удзельнікаў і гасцей юбілейнага, XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар" гасцінна сустракалі ў Віцебску

**Беларусь. Belarus**

Грамадска-палітычны часопіс

**№ 7 (1054), ліпень, 2021**
Выдаецца з 1930 года.
Адноўлены ў 1944 годзе.

**Заснавальнік:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

**Галоўны рэдактар**
Харкоў Віктар Міхайлавіч

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,
г. Мінск, Беларусь, 220013.
Тэл.: +375 (17) 287-19-19,
+375 (17) 292-66-92.
Тэл./факс: +375 (17) 287-15-26.

**www.zviazda.by**
**E-mail:** belarus.mag@mail.ru

**Падпісны індэкс** — 74820.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 8, выдадзена 16.07.2018 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Дызайн і вёрстка:**
Андрэй Сіняўскі

**Карэктар:**
Аліса Гюнгер

**«Беларусь.Belarus»** выходзіць на беларускай, англійскай і кітайскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **«Беларусь. Belarus»** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

Падпісана да друку 22.06.2021.
Фармат 60x84 ⅛.
Афсетны друк.
Папера крэйдаваная.
Ум.-друк. арк. 5,58
Ул.-выд. арк. 7,30

Агульны наклад — 684 асобнікаў (на беларускай мове — 200).

**Заказ**

Друкарня:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, Мінск,
Рэспубліка Беларусь, 220123.

© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2021

*На першай старонцы вокладкі — фота БелТА*

# ЯШЧЭ Ў НУМАРЫ

БЕЛТА




26 ДЗЕЛІМСЯ РАДАСЦЮ, ДАБРЫНЁЙ

**30 Адпачынак як падарожжа ад чалавека да чалавека**


Аграэкатурызм, безумоўна, — адзін з сучасных відаў адпачынку. Хоць і з'явіўся на хвалі несумненнай цікавасці да экалагічнай разнастайнасці навакольнага асяроддзя і настальгічнага ўспрымання жыцця ў сельскай мясцовасці


**37 Пяты помнік Францыску Скарыне**


У цэнтры Мінска, у скверы паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Цэнтральнай навуковай бібліятэкай навук імя Якуба Коласа, гэтымі днямі з'явіўся помнік Францыску Скарыне, пяты па ліку ў сталіцы. Ён — частка архітэктурна-мастацкай кампазіцыі "Залатое кола беларускай навукі" ў праекце "Алеі славы беларускай навукі"

PLANETABELARUS.BY




32 ХАДА Ў СТЫЛІ ФЭНТЭЗІ

**38 Яркія адметнасці ў алімпійскай фотахроніцы**


Калі выйдзе з друку ліпеньскі нумар часопіса, Алімпійскія гульні ў Токіа будуць у самым разгары. Нельга прадбачыць іх вынікі. Цяжка пакуль спрагназаваць, якім стане ў японскай сталіцы і выступленне беларускай алімпійскай каманды. Перамагае, як кажуць, мацнейшы




40 РАМАНТЫЧНАЯ САГА ПРЫ ПОЎНЫМ АНШЛАГУ

**44 Валянцін Губараў: "Мастацтва павінна быць шурпатым. З глянцавай паверхні ўсё саскоквае..."**


Валянцін Губараў — адзін з самых вядомых сучасных беларускіх мастакоў. Яго імя добра ведаюць знатакі выяўленчага мастацтва як у краіне, так і за яе межамі



# ПАНАРАМА

## 2 УНІКАЛЬНАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ІНАВАЦЫЙ

**Цэнтр развіцця смарт-індустрыі з'явіцца ў бліжайшы час у Брэсце**

Прыцягальны сучасны праект рэалізуецца на базе Брэсцкага навукова-тэхнічнага парка. З мінулага года тут ствараюць пілотны доследна-дэманстрацыйны цэнтр развіцця смарт-індустрыі.

— Ён зробіць унёсак у забеспячэнне пераходу Беларусі да чацвёртай прамысловай рэвалюцыі, дапаможа павысіць узровень ведаў аб смарт-індустрыі, а таксама знізіць бар'еры і перашкоды для ўкаранення яе тэхналогій, — расказвае пра перспектывы першы намеснік міністра эканомікі Беларусі Юрый Чабатар. — Бюджэт на першым этапе склаў 1 мільён долараў, з якіх 400 тысяч будуць накіраваныя на набыццё абсталявання.

Адкрыццё Цэнтра смарт-развіцця запланавана на 2022 год. Чакаецца, што ён стане важнай пляцоўкай для супрацоўніцтва з расійскім фондам "Сколкава". Гэты навукаград, створаны ў Падмаскоўі ў 2010 годзе, ужо налічвае больш за 2800 рэзідэнтаў. Брэсцкі тэхнапарк атрымае статус цэнтра камерцыялізацыі інавацый і будзе выступаць апаратарам "Сколкава" ў заходнім рэгіёне Беларусі.

Паводле слоў Юрыя Чабатара, праект пагаднення паміж Міністэрствам эканомікі Беларусі і "Сколкава" аб супрацоўніцтве ў галіне інавацыйнага, лічбавага і кластэрнага развіцця ўжо знаходзіцца на завяршальнай стадыі.

— Ключавымі напрамкамі стануць распрацоўка і рэалізацыя сумесных дзелавых і прафесійных ініцыятыў. Асаблівая ўвага — рэалізацыі беларуска-расійскіх праграм навучання. Пагадненне прадугледжвае для стартапаў і інавацыйных кампаній-рэзідэнтаў з Беларусі карыстанне ў "Сколкава" сэрвісамі экспертызы, інфармацыйнай падтрымкі прасоўвання на рынку пошуку партнёраў і пошуку спажыўцоў у праектах камерцыялізацыі сярод індустрыяльных партнёраў фонду, — вылучыў дэталі будучай сумеснай працы намеснік міністра.

Уладзімір **Хромаў**

## 1 ПЫТАННІ ДЛЯ ЎЗГАДНЕННЯ

**Узаемадзеянне ў сферы бяспекі, супрацьстаянне санкцыйнаму ціску — гэтыя і іншыя тэмы абмеркавалі Прэзідэнты Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу**

На сустрэчы Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адно з галоўных пытанняў, якім неабходна займацца, гэта эканоміка, бо не толькі ў дачыненні да Беларусі, але і да Расіі ўводзяць або падаўжаюць санкцыі. Тым не менш Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены, што краіны вытрымаюць гэты ціск: "Нават не вытрымаем — мы будзем развівацца. Гэта не пытанне. Сёння не атрымаецца манапалізаваць міжнародны парадак і націснуць на нас. Не атрымаецца! Свет змяніўся".

Аляксандр Лукашэнка назваў уцешлівым той факт, што расце тавараабарот Беларусі і Расіі. Ён пагадзіўся, што любыя санкцыі — гэта магчымасці, у прыватнасці, у плане дыверсіфікацыі эканомікі, імпартазамяшчэння.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што Беларусь застаецца для Расіі надзейным партнёрам у эканоміцы. Ён звярнуў увагу, што, нягледзячы на знешнія выклікі, санкцыі і пандэмію, эканоміка Беларусі дэманструе нядрэнныя паказчыкі. У прыватнасці, рэспубліка абслугоўвае ўсе крэдыты, больш таго, яе знешні доўг скарачаецца. "У гэтым сэнсе Беларусь — надзейны, стабільны партнёр", — заявіў расійскі лідар.

Кіраўнік РФ звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі ўпэўнена развіваецца і прамысловая вытворчасць:

— Вырасла больш чым на 16 працэнтаў — гэта вельмі добрыя паказчыкі. Я маю на ўвазе і нашу глыбокую кааперацыю ў сферы прамысловасці. Тыя вытворчыя сувязі, якія мы захавалі яшчэ з часоў Савецкага Саюза і развівалі ў апошнія гады, маюць пазітыўны эфект як для эканомікі Расіі, так і для эканомікі Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін дамовіліся, што кошт на газ для Беларусі ў 2022 годзе застанецца на ўзроўні 2021 года. Прэзідэнты таксама ўзгаднілі пытанні крэдытнай падтрымкі Беларусі ў сувязі з падатковым манеўрам у Расіі.

Кіраўнікі дзяржаў грунтоўна абмяняліся думкамі па міжнароднай абстаноўцы і рэгіянальных праблемах. На сустрэчы былі падведзены вынікі дыскусій, якія раней мелі месца ў рамках камісій высокага ўзроўню з удзелам расійскіх і беларускіх прадстаўнікоў і кіраўнікоў урадаў дзвюх краін. Прэзідэнты выпрацавалі крокі па працы ў такіх галінах, як мытнае, падатковае рэгуляванне, энергетыка.

Аляксей **Фядосаў**

# СІМВАЛ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**3 ліпеня Беларусь адзначыла сваё галоўнае свята. У гэты дзень Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка выступіў з прамовай на цырымоніі ўскладання вянкоў і кветак у мемарыяльным комплексе "Курган Славы".**

Вітаючы ўсіх прысутных, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на сімвалізм Кургана Славы, святога месца для ўсіх беларусаў. Тут у сярэдзіне мінулага стагоддзя ішлі бai за сталіцу Радзімы, вырашаўся лёс Беларусі. Па словах Кіраўніка дзяржавы, хоць цяпер цяжка ўявіць настрой воінаў, але няма сумневу, што яны былі поўныя рашучасці адпомсціць ворагу і ўзяць рэванш за тое, што адбылося ў 1941 годзе. На пачатку вайны, калі фашысты амаль не адчуваючы супраціўлення, прайшлі праз Беларусь і захапілі Мінск.

"Вызваленчая аперацыя "Баграціён" засведчыла, што ў мастацтве перамагаць савецкія войскі пераўзышлі свайго ворага. Дзень вызвалення Мінска стаў прадвеснікам нашай Перамогі ў 1945-м. Памяць пра герояў Вялікай Айчыннай вайны ўвасобілася ў рукатворным помніку. На месцы знакавых бітваў вырас Курган Славы", — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гэты мемарыял насыпалі ў літаральным сэнсе сваімі рукамі тысячы людзей, якія ведалі вайну ў твар, памяталі забітых таварышаў і страчаных сваякоў. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтая зямля ўвабрала ў сябе слёзы маці, жонак і дзяцей загінулых воінаў, боль страт мільёнаў загубленых жыццяў.

Што ж, не цяжка ўявіць тых людзей, якія тысячамі прыязджалі ў Беларусь на святую зямлю Перамогі і насыпалі гэты Курган. Тут сапраўды слёзы і настрой мільёнаў савецкіх людзей. Тут ўвасоблены іх мары. Няма, мабыць, на зямлі іншага такога рукатворнага месца, як гэта.

Удзельнікі мерапрыемства ўшанавалі памяць герояў Вялікай Айчыннай вайны хвілінай маўчання.

"Для нас, беларусаў, якія страцілі ў той вайне кожнага трэцяга жыхара, Курган Славы — гэта сакральны сімвал. Сімвал нашага незалежнага і свабоднага жыцця. Тут закладзена капсула з пасланнем будучым пакаленням — нам з вамі і тым, хто прыйдзе пасля нас. Яго сутнасць простая і заўсёды актуальная, а ў наш час асабліва: берагчы памяць пра Вялікую Айчынную вайну і быць патрыётамі сваёй Айчыны", — нагадаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што ў савецкі час тут прымалі дзяцей у піянеры, давалі клятву камсамольцы, а ў нашы дні гучаць словы ваеннай прысягі. Сюды прыходзяць у Дзень Перамогі і ў Дзень Незалежнасці.

***"Для нас, беларусаў, якія страцілі ў той вайне кожнага трэцяга жыхара, Курган Славы — гэта сакральны сімвал. Сімвал нашага незалежнага і свабоднага жыцця. Тут закладзена капсула з пасланнем будучым пакаленням — нам з вамі і тым, хто прыйдзе пасля нас. Яго сутнасць простая і заўсёды актуальная, а ў наш час асабліва: берагчы памяць пра Вялікую Айчынную вайну і быць патрыётамі сваёй Айчыны"***

Аляксандр Лукашэнка

Так, сучаснае пакаленне памятае, што героі Вялікай Айчыннай вайны падарылі ім жыццё, і імкнецца пражыць яго дастойна памяці гэтых герояў. Памяці тых, хто стварыў гэты помнік, хто адстаяў страчаныя ў 90-ыя традыцыі і аднавіў мемарыяльны комплекс, надаўшы яму сучаснае аблічча, падкрэсліў Прэзідэнт, падзякаваўшы прафсаюзам, якія выканалі даручэнне Прэзідэнта і прынялі на свой баланс гэты помнік, прывялі яго ў належны стан. І таксама кіраўніцтву Мінскай вобласці, якое заўсёды дапамагала даглядаць за гэтым светлым месцам.

"У Беларусі няма нават маленькага помніка закінутага, і гэта наш гонар. У нас іх тысячы. Гэтая зямля не проста палітая крывёю савецкіх людзей, беларусаў, партызан, падпольшчыкаў, ўсіх членаў супраціўлення. Гэтая зямля ўсеяная трупамі нашых людзей", — канстатаваў Кіраўнік дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, тая вайна не закончылася, сёння яна набыла іншыя формы. Прэзідэнт звярнуўся да студэнтаў, у першую чаргу гістарычных факультэтаў, курсантаў Ваеннай акадэміі, Акадэміі МУС, маладых упраўленцаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый: "Вы — будучыня нашай краіны, гэта не бальшчына. Тут амаль 100 працэнтаў упэўненых патрыётаў нашай радзімы. Вельмі хацелася б, каб вы не страцілі гэтую краіну. Менавіта вы прыйшлі да кіраўніцтва краінай і захавалі тое, што мы стварылі за чвэрць стагоддзя. Наша пакаленне ўжо адзначылася, мы, атрымаўшы абрубак савецкай імперыі, стварылі суверэнную дзяржаву, першую за шматвекавую гісторыю. Гэтым наша пакаленне адзначылася, абараніўшы тую Перамогу, якую нам падорылі. Цяпер справа за вамі. Вы нікому не павінны аддаць нашу краіну, нашу зямлю. У некаторых з вас ужо ёсць дзеці. Вы павінны пераканаць іх, што іншай зямлі ў вас не будзе, што гэта — іх зямля, ваша зямля. І вы падумайце, пакаленне, якое ідзе на змену нашаму, чым вы адзначыцеся ў гэтым жыцці. Усе мы павінны пакінуць нешта на гэтай зямлі, кожны асабіста і ўсе разам".



БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Курган Славы — гэта сімвал гераічнай гісторыі і калі яе не абараніць сёння, заўтра і гэты курган зраўнуюць з зямлёй. Зраўнуюць, як сімвал некаму ненавіснай Вялікай Перамогі, а з ім кануць у мінулае свабода і незалежнасць Беларусі.

Прэзідэнт заклікаў усіх не забываць, не загаворваць галоўны факт сучаснасці, што нашу гісторыю хочуць перапісаць, нашу Вялікую Перамогу ў нас хочуць адабраць. На яго думку, хтосьці ганарыцца сваім багаццем ў выглядзе прыроднага газу, нафты, золата, металаў, але няма больш каштоўнага і дарагога падарунка, чым Вялікая Перамога.

"Чаму яна нам вельмі дарагая, таму што толькі беларусы заплацілі за яе кожнага трэцяга. Як казаў калісьці вялікі Ленін, трэба задаць сабе пытанне: ад якой спадчыны мы адмаўляемся. Тыя, хто хоча забыць гэтую Перамогу, — яны проста вар'яты. Яны не думаюць пра тое, што мы можам страціць. Але праўда і ў тым, гэта прэтэнзія да нашага пакалення, што мы не ўмелі паднесці аблудным і іншым за мяжой нашай дзяржавы сутнасць нашай Перамогі. Мы не дамагліся ад іх, каб яны шанавалі гэтую Перамогу, а праз нашу Перамогу шанавалі нас, што мы іх выратавалі, што мы ім падарылі жыццё", — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да прадстаўнікоў маладога пакалення, папрасіў іх мець гэта на ўвазе і выправіць гэтую памылку старэйшага пакалення. Па яго словах, гэта ўжо пачалі рабіць, расследуючы злачынствы нацызму на беларускай зямлі.

"Гэта падобна да беларускага Халакосту, або Халакосту беларускага народа. Яўрэі ж змаглі гэта даказаць. Увесь свет сёння схіляецца перад імі, нават баяцца пальцам у іх паказаць, а мы — такія талерантныя, такія добрыя — нікога не хацелі пакрыўдзіць. Даскакаліся да таго, што нас пакрыўдзілі. Таму мы пачалі гэты працэс, але вам варта яго працягнуць. Гэта вельмі важна, гэта не менш важна, чым перамогі ў эканоміцы, вынікі ў эканоміцы, у фінансах, таму што гэта тычыцца сэрцаў і душ кожнага чалавека. Калі мы страцім сэрцы і душы, мы паўторым тое, што было ў мінулым годзе, можа быць, яшчэ ў больш горшым варыянце", — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз заклікаў ўсіх прыходзіць да помнікаў Вялікай Айчыннай вайны, прыводзіць сюды дзяцей, расказваць ім пра пра подзвігі народа, вучыць любіць родную зямлю і берагчы мір.

"Тады гэты Курган Славы, які імкнецца ў неба, адкуль глядзяць на нас героі, якія пайшлі, будзе вечна захоўваць памяць аб іх. Пра тых, хто падарыў беларусам жыццё і свабоду. Памятайце, нішто на гэтай зямлі не вечна. Ні мы, ні вы не вечныя. Мы ўсе некалі сыйдзем туды. І як мы будзем ставіцца да тых, хто пайшоў, так



БЕЛТА

Сувязь пакаленняў



БЕЛТА



БЕЛТА

будуць ставіцца да нас і нашы дзеці, новае пакаленне. Памятайце гэта, паважаныя сябры і наша моладзь", — акцэнтаваў увагу Кіраўнік дзяржавы.

У заключэнне выступлення Прэзідэнт павіншаваў усіх з Днём Незалежнасці, самым галоўным, святым і светлым святам. Па яго словах, гэты дзень таксама трэба адстойваць: "Ні ў якім разе нельга растварыць гэтае свята ў рознага роду заявах і прапановах аб тым, што не тады святкуем, трэба ў іншы час і гэтак далей. З гэтага пачынаецца знішчэнне любой ідэі. Гэта наша свята, ўсенародна прызнанае, прызнанае на рэферэндуме. Гэта светлае свята, каштоўнае свята для нашага народа — Дзень Незалежнасці".

Адразу пасля ўрачыстасцяў цырымоніі ўскладання вянка да падножжа Кургана Славы, Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з удзельнікамі свята і адказаў на пытанні. Члены экспедыцыі на Эверэст падорылі Прэзідэнту Беларусі Дзяржаўны сцяг і копію Сцяга Перамогі, якія альпіністы паднялі на самую высокую кропку планеты. У маі гэтага года міжнародная экспедыцыя, у складзе якой былі і беларускія альпіністы, разгарнулі дзяржаўныя сімвалы на вяршыні самай высокай гары свету. "Гэта, мабыць, сёння будзе асноўнай святыняй у Палацы Незалежнасці", — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт падкрэсліў, што ганарыцца камандай альпіністаў, як і беларускімі ўдзельнікамі экспедыцыі.

Студэнты гістарычных факультэтаў з розных ВНУ краіны падчас размовы з Кіраўніком дзяржавы расказалі, што актыўна займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю, звязанай з тэмай Вялікай Айчыннай вайны. Маладыя педагогі-гісторыкі папрасілі Прэзідэнта параіць, як ім выхоўваць малодшае пакаленне, каб зрабіць іх сапраўднымі патрыётамі сваёй радзімы. У адказ на гэта Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галоўнае заўсёды — сумленна працаваць. Прэзідэнт прапанаваў маладым спецыялістам стварыць падручнік па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён расказаў, што некалі марыў, каб у Беларусі была такая кніга і яе зрабілі, але належнага эфекту яна не выклікала: "Калі вы, моладзь, на падставе таго, што ўжо створана, новых фактаў, а таксама падручнікаў савецкіх часоў (тады яны нядрэнныя былі, хоць нешта замоўчвалі, чагосьці сароменіся), зробіце годны навучальны дапаможнік — гэта будзе найвялікшая перамога. Таму што галоўнае для студэнтаў — каб падручнік быў носьбітам ведаў".

Такая кніга павінна быць у кожнага маладога чалавека, каб паказаць, які ўнёсак зрабілі беларусы ў Перамогу, перакананы Прэзідэнт: "Падручнік мы можам дапоўніць дакументамі тых часоў і тымі дакументамі, якія мы сароменіся паказваць, каб кагосьці не пакрыўдзіць. Займіцеся гэтым, калі можаце. Нам гэта вельмі трэба", — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што да стварэння такога падручніка варта падключыць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Адміністрацыю Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў краіне створана нямала помнікаў, да якіх трэба прыводзіць дзяцей і расказваць ім пра падзеі ваенных гадоў, у тым ліку і пра зверствы фашыстаў, якія яны тварылі на беларускай зямлі. Паводле яго слоў, будучыя пакаленні павінны пра гэта ведаць, пра гэта трэба нагадваць і заходнім краінам.



БЕЛТА

Размова з удзельнікамі экспедыцыі на Эверэст



БЕЛТА



БЕЛТА



БЕЛТА

### *Працягваючы традыцыі*

Падчас свайго выступлення Аляксандр Лукашэнка звяртаўся да маладых людзей, у прыватнасці, да курсантаў Ваеннай акадэміі, падкрэсліваючы, што яны — будучыня краіны, і заклікаў яе не страціць. Курсанты Ваеннай акадэміі, якія прыстунічалі на свяце, расказалі, што кіраваліся менавіта такой устаноўкай, калі выбіралі для сябе прафесію. "Сёняшні дзень — гэта памяць аб маіх продках. Мне з дзяцінства падабаліся самалёты і хацеў абараняць мірнае неба Беларусі і таму абраў для сябе авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі", — расказаў Дзмітрый Родзін, курсант трэцяга курса авіяцыйнага факультэта. Такіх прынцыпаў будучыя афіцэры плануюць прытрымлівацца і ў далейшым жыцці. Таму зварот Прэзідэнта хлопцы прынялі блізка да сэрца.

"Сёння для мяне як і для ўсіх грамадзян нашай краіны — вялікае свята. Па-першае, гэта памяць аб подзвігу, які здзейснілі нашы продкі. І сёння мы сабраліся на Кургане Славы, каб ушанаваць памяць гэтых герояў. І спадзяюся, што бы будзем працягваць традыцыі, якія закладзеныя ў нашай дзяржаве з самага яе пачатку. Гэта вельмі правільна і мы будзем працягваць гэта надалей і ўкладваць нешта сваё", — падзяліўся Антон Собалеў, курсант трэцяга курса агульнавайсковага факультэта.

Так, на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу разгарнулася сапраўднае свята. Асаблівую цікавасць у яго гасцей выклікала ваенна-тэматычная пляцоўка, дзе была прадстаўлена тэхніка, якая знаходзіцца на узбраенні беларускай арміі. Кожны госць свята мог пачаставацца свежым армейскім хлебам. Тыя, хто цікавіцца ваеннай тэматыкай менш, знайшлі сабе заняткі па інтарэсах у гарадзе майстроў, які размясціўся на алеях комплексу. Свята на Кургане Славы сабрала не толькі мінчан, але і жыхароў бліжэйшых населеных пунктаў. Антаніна Котава разам са сваімі калегамі з прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу прадстаўлялі Барысаўскі раён. "Незалежнасць Беларусі для мяне значыць магчымасць быць самастойнай краінай, самой вырашаць усе пытанні ўнутры свайго грамадства. Таму мы павінны выразна разумець, што мы хочам і як мы павінны жыць, працаваць, вучыцца дзеля сваёй краіны. Для мяне гэта вельмі важны дзень. Сёння яшчэ і 77-ая гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, таму мы як маладое пакаленне павінны пра гэта памятаць. І пра людзей, якія аддалі жыццё, каб мы сёння жылі. Для сваёй краіны хочацца зрабіць як мага больш, каб нашы дзеці жылі ў прыгожай краіне", — сказала яна.

Свята ў падножжа Кургана Славы стала адметнай падзеяй у цэлым шэрагу мерапрыемстваў да Дня Незалежнасці. Яно нагадала пра сапраўдныя каштоўнасці і значэнне гэтага Дня.

Аляксандр **Піменаў**

# З НАГОДЫ АДМЕТНАЙ ДАТЫ

## Віншаванні з Днём Незалежнасці паступілі ў адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і інтэграцыйных аб'яднанняў, замежных палітычных і грамадскіх дзеячаў

Кіраўніка дзяржавы і беларускі народ павіншавалі Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш, Папа Рымскі Францыск, кіраўнікі Расіі, Кітая, Азербайджана, Казахстана, Таджыкістана, Узбекістана, Кыргызстана, Вялікабрытаніі, Сербіі, Турцыі, Туркменістана, Ізраіля, Егіпта, ААЭ, Саудаўскай Аравіі, Кубы, Ірана, Сірыі, В'етнама, Тайланда, Сінгапура, Шры-Ланкі, Малайзіі, Алжыра, Кеніі, Нікарагуа, Марока, Уганды, Эфіопіі, Палесціны, Мальтыйскага ордэна.



"3 ліпеня — знамянальная дата ў гісторыі Беларусі. Вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала адной з важнейшых перамог, атрыманых нашымі бацькамі і дзядамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", — гаворыцца ў віншаванні ***Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна***.

Расійскі лідар адзначыў, што традыцыі братэрскай дружбы і ўзаемавыручкі, загартаваныя ў суровы ваенны час, і сёння служаць надзейнай асновай развіцця расійска-беларускіх адносін. "Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы будзем і надалей умацоўваць саюзніцкія сувязі, канструктыўнае двухбаковае супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, а таксама развіваць узаемавыгадныя інтэграцыйныя працэсы на еўразійскай прасторы. Гэта ў поўнай меры адпавядае інтарэсам дружалюбных народаў нашых краін", — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

Свае віншаванні Аляксандру Лукашэнку таксама адрасавалі прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Мішусцін, старшыня Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка і старшыня Дзяржаўнай думы Вячаслаў Валодзін.



***Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін*** пажадаў Беларусі працвітання і магутнасці, а беларускаму народу — шчасця і дабрабыту. Кіраўнік КНР падкрэсліў, што надае вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін і цэніць глыбокую дружбу з Кіраўніком беларускай дзяржавы.

"У апошнія гады пад вашым моцным кіраўніцтвам Беларусь дабілася несумненных поспехаў у розных сферах дзяржаўнага будаўніцтва. Кітай, як добры сябар і партнёр, шчыра рады гэтаму. Кітай, як і раней, будзе падтрымліваць шлях развіцця, выбраны Беларуссю ў адпаведнасці са сваімі нацыянальнымі ўмовамі, аказваць цвёрдую падтрымку па пытаннях, якія датычацца карэнных інтарэсаў Беларусі, і гатовы прадаўжаць аказваць пасільную дапамогу сацыяльна-эканамічнаму развіццю Беларусі", — гаворыцца ў віншаванні кітайскага лідара.



***Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган*** выказаў задавальненне ўзроўнем адносін з Беларуссю. "Я веру, што дружба і супрацоўніцтва, якія развіваюцца на аснове ўзаемнай выгады і павагі больш як чвэрць стагоддзя, будуць дыверсіфікавацца і развівацца ў многіх розных галінах дзякуючы нашым сумесным намаганням", — адзначыў у сваім віншаванні турэцкі лідар.



"Высокі ўзровень даверу і супрацоўніцтва паміж Азербайджанам і Беларуссю на трывалай аснове традыцыйных вузаў дружбы і ўзаемападтрымкі, актыўнае ўзаемадзеянне нашых краін па шырокім спектры пытанняў выклікае асаблівае задавальненне, — падкрэсліў у сваім пасланні ***Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў***. — Упэўнены, што паспяховая рэалізацыя дамоўленасцяў, дасягнутых у час вашага візіту, надасць важны імпульс далейшаму развіццю і пашырэнню азербайджана-беларускага стратэгічнага партнёрства".



У віншавальным пасланні ***Прэзідэнта Казахстана*** адзначаецца, што Беларусь упэўнена ідзе па шляху мадэрнізацыі грамадска-палітычнага жыцця, будаўніцтва эфектыўнай і самадастатковай эканомікі. "Нашы сумесныя намаганні нададуць магутны імпульс далейшаму развіццю казахска-беларускага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, у тым ліку ў рамках рэгіянальных інтэграцыйных аб'яднанняў, на карысць і ў інтарэсах нашых народаў", — адзначыў ***Касым-Жамарт Такаеў***.



***Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў*** адзначыў, што пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі Беларусь упэўнена ідзе па шляху ўмацавання суверэнітэту і незалежнасці, абароны і пашырэння нацыянальных інтарэсаў, забеспячэння ўстойлівага эканамічнага развіцця. "Мы ва Узбекістане надаём вялікае значэнне развіццю традыцыйна цесных адносін дружбы і партнёрства з Беларуссю. Маем цвёрды намер і далей паглыбляць канструктыўны палітычны дыялог, пашыраць узаемавыгаднае гандлёва-эканамічнае і культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва", — гаворыцца ў віншаванні ўзбекскага лідара.



***Эмамалі Рахмон, Прэзідэнт Таджыкістана***, канстатаваў, што за гады незалежнасці Беларусь дабілася

значных поспехаў у справе дзяржаўнага будаўніцтва і ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця. "Адносіны стратэгічнага партнёрства з Рэспублікай Беларусь былі і застаюцца прыярытэтам знешняй палітыкі Таджыкістана. Мы даражым непарушнымі вузамі, якія гістарычна склаліся і звязваюць абодва народы і дзяржавы", — падкрэсліў ён.



"Дата 3 ліпеня ўвайшла ў гісторыю Беларусі яркай старонкай гераічнай доблесці франтавікоў і працаўнікоў тылу, якія вызвалілі краіну, заваявалі свабоду для народа і адстаялі незалежнасць", — гаворыцца ў пасланні ***Прэзідэнта Кыргызстана Садыра Жапарава***. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Кыргызстан надае вялікае значэнне ўмацаванню шматбаковага супрацоўніцтва з Беларуссю ва ўсіх абласцях узаемнага інтарэсу.



***Прэзідэнт Сербіі Аляксандр Вучыч*** выказаў упэўненасць, што на трывалай аснове традыцыйнай дружбы бакі прадоўжаць умацоўваць сербска-беларускія адносіны і развіваць усебаковае супрацоўніцтва. "Я карыстаюся гэтай магчымасцю, каб зноў выказаць сваю ўдзячнасць Рэспубліцы Беларусь і вам асабіста за традыцыйную падтрымку захавання тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту Сербіі", — гаворыцца ў віншаванні сербскага лідара.



Пажаданні міру і працвітання беларускім грамадзянам перадаў ***Папа Рымскі Францыск***.



***Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш*** адрасаваў беларускаму народу самыя цёплыя віншаванні. "Я разлічваю, што Рэспубліка Беларусь дапаможа ўмацаваць Арганізацыю Аб'яднаных Нацый і пабудаваць лепшы і больш спакойны свет для ўсіх", — адзначыў ён.



"Пад вашым кіраўніцтвам Беларусь паступальна і дынамічна ідзе па шляху мадэрнізацыі ўсіх бакоў жыцця грамадства, а ваш багаты палітычны вопыт і высокі прафесіяналізм дазваляюць цвёрда і паслядоўна абараняць і адстойваць нацыянальныя інтарэсы краіны", — гаворыцца ў віншаванні ***генеральнага сакратара Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Уладзіміра Норава***.



"Перадаю вам і беларускаму народу самыя сардэчныя віншаванні з нагоды нацыянальнага свята Рэспублікі Беларусь і яшчэ раз пацвярджаю волю Кубы да ўмацавання сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі", — падкрэсліў у сваім пасланні ***Прэзідэнт Кубы Мігель Дыяс-Канель Бермудэс***.



***Прэзідэнт Ізраіля Рэўвен Рыўлін*** адзначыў, што адносіны паміж ізраільскай і беларускай нацыямі заснаваны на доўгай сумеснай гісторыі. "Многія прадстаўнікі яўрэйскага народа жылі ў Беларусі на працягу стагоддзяў, іміграваралі ў Дзяржаву Ізраіль і зрабілі каштоўны ўнёсак у развіццё дзяржавы. Супольнасць выхадцаў з Беларусі ў Ізраілі выступае ў якасці "жывога моста", які ўмацоўвае адносіны паміж нашымі краінамі", — гаворыцца ў віншаванні. Рэўвен Рыўлін пажадаў Аляксандру Лукашэнку асабістага дабрабыту, а беларускаму народу — няспыннага прагрэсу і росквіту.



***Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў*** у віншавальным пасланні кіраўніку беларускай дзяржавы выказаў перакананне, што традыцыйна дружалюбныя туркмена-беларускія адносіны, заснаваныя на прынцыпах раўнапраўя, узаемнай павагі і даверу, будуць і ў далейшым развівацца і ўмацоўвацца на карысць двух народаў.



"Карыстаючыся выпадкам, хачу выказаць маю глыбокую ўдзячнасць за сяброўскія адносіны і супрацоўніцтва, якія звязваюць нашы дзве краіны. Пацвярджаю маю шчырую зацікаўленасць у іх далейшым развіцці на ўсіх узроўнях на карысць нашых дружалюбных народаў", — гаворыцца ў віншаванні ***Прэзідэнта Егіпта Абд-эль Фатаха ас-Сісі***.



***Прэзідэнт Сірыі Башар Асад*** пацвердзіў імкненне сваёй краіны развіваць адносіны з Беларуссю і ўмацоўваць сумеснае супрацоўніцтва ва ўсіх абласцях. "Выказваю вам нашу поўную салідарнасць у вашым процістаянні перад тварам любога націску і санкцый супраць суверэнітэту Беларусі і ўмяшання ў яе ўнутраныя справы", — падкрэсліў ён.



Шчасця і дабрабыту беларускаму народу пажадаў ***Прэзідэнт Ірана Хасан Рауҳані***. "Выказваю надзеі, што ў святле сумесных намаганняў велізарны патэнцыял дзвюх краін, асабліва ў эканамічнай сферы, будзе рэалізаваны для далейшага развіцця і паляпшэння адносін паміж дзвюма краінамі ў розных галінах", — гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Ірана.



"Мы заўсёды ўважліва сочым і з радасцю адзначылі шматлікія поспехі, дасягнутыя беларускім народам пад вашым кіраўніцтвам у развіцці краіны і ажыццяўленні палітыкі дыверсіфікацыі знешніх сувязей. Мы ўпэўнены, што з паспяховай рэалізацыяй пастаўленых планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусь стане яшчэ больш развітой, што адпавядае пажаданням народа, і захавае дастойную пазіцыю ў рэгіёне і ў свеце", — падкрэсліў ***Прэзідэнт В'етнама Нгуен Суан Фук***.



Ад імя народа Сінгапура віншаванні беларусам з Днём Незалежнасці перадала ***Прэзідэнт гэтай краіны Халіма Якаб***. Яна пажадала Беларусі і яе грамадзянам міру, шчасця і працвітання.

Пасланні Кіраўніку беларускай дзяржавы таксама накіравалі ***Кароль Саудаўскай Аравіі Сальман бен Абдэль-Азіз Аль Сауд і Наследны прынц гэтай краіны Мухамед бен Сальман, Прэзідэнт ААЭ Халіф бен Заід аль-Нахаян, віцэ-прэзідэнт, прэм'ер-міністр і кіраўнік Дубая Мухамед бен Рашыд Аль-Мактум і Наследны прынц Абу-Дабі Мухамед бен Заід аль-Нахаян***. Яны пажадалі Аляксандру Лукашэнку моцнага здароўя і шчасця, а Ураду і дружалюбнаму народу Беларусі — далейшага прагрэсу і росквіту.

Уладзімір **Веліхаў**

# УРАЧЫСТЫ МОМАНТ ДЛЯ ЎСІХ

## У рэгіёнах краіны прадстаўнікоў розных пакаленняў аб'яднала свята беларускай дзяржаўнасці — Дзень Незалежнасці

***Мінск***

У праграме сёлетняга Дня Незалежнасці ваенны парад прадугледжаны не быў, аднак абаронны складнік свята, вядома ж, прысутнічаў. У сталіцы на сямі пляцоўках былі разгорнутыя выставы ваеннай тэхнікі.

На адной з пляцовак, побач з культурна-спартыўным комплексам "Чыжоўка Арэна", перад гараджанамі паўстала каля 20 адзінак ваеннай тэхнікі рознага прызначэння. Асноўнымі наведнікамі экспазіцыі сталі сем'і з дзецьмі. Малыя з задавальненнем залазілі ў кабіны транспартных сродкаў і прасілі бацькоў падсадзіць на танк. Дарослым жа аб асаблівасцях прадстаўленай тэхнікі падрабязна распавядалі вайскоўцы. Азнаёміцца з экспазіцыяй прыйшлі не толькі мінчане — шмат было і жыхароў прыгарада сталіцы.


БЕЛТА

Святочны гала-канцэрт у сталіцы

Больш за 250 веласіпедыстаў прынялі ўдзел у велапрабегу "Цэнім мінулае. Верым у сучаснасць. Ідзем у будучыню разам" ў Фрунзенскім раёне Мінска.

На чале калоны з вялікім беларускім сцягам — Серафіма Татур, выкладчык фізічнай культуры сярэдняй школы № 41:

— Вельмі значнае, урачыстае свята для ўсіх. І мы палічылі, што было б сімвалічна прыняць удзел ад нашага раёна ў гэтым велапрабегу. Таму што спорт — гэта рух, гэта жыццё. І гэтае свята таксама пра жыццё і будучыню.

Фінішавалі ўдзельнікі прабегу ў парку імя Уга Чавеса, дзе кожнаму дастаўся памятны медаль. Да моманту прыезду веласіпедыстаў там ужо разгарнулася канцэртная праграма, пачалі сваю працу інтэрактыўныя відовішча, гульнявыя пляцоўкі і выстава ваеннай тэхнікі, адкрыў свае дзверы музей "Акіянарыум".


БЕЛТА

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей уручыў дыпломы лаўрэатам конкурсу "Чалавек года"

***Мінская вобласць***

Да мемарыяльнага комплексу "Курган Славы" ў Смалявіцкім раёне з'ехаліся адзначыць Дзень Незалежнасці людзі і са сталіцы, і з усёй вобласці. Выставы, кірмашы, інтэрактыўныя пляцоўкі, фотазоны — забавы на любы густ і ўзрост. Напрыклад, усіх ад малога да вялікага ўразіла грандыёзная выстава ваеннай тэхнікі, прадстаўленая Міністэрствам абароны.

Традыцыйна ў Мінскай вобласці свята маштабна адзначаецца ў адным з райцэнтраў з удзелам кіраўніцтва рэгіёна. Сёлета вялікі канцэрт з лазерным шоу і феерверкам прайшоў у Беразіно, жыхары якога таксама святкавалі і 520 годдзе горада.

***Гомельская вобласць***

— Я тут, таму што я — беларуска і выступаю за незалежнасць маёй краіны, — так лаканічна і выразна сказала аб сваім удзеле ў шэсці ў гонар Дня Незалежнасці студэнтка Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Анастасія Кузняцова.

Нараўне з працоўнымі калектывамі, актывамі прафсаюзаў і грамадскіх аб'яднанняў, цэлыя сем'і і групы маладых людзей, якія лічаць гэтае свята найважнейшым у годзе, сабраліся ў Гомелі на вуліцы Савецкай. Канчатковай кропкай у маршруце стаў мемарыял "Вечны агонь". Тут прайшлі ўрачысты мітынг, ускладанне кветак і хвіліна маўчання ў памяць аб героях, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.


БЕЛТА

Святкаванне Дня Незалежнасці ў Віцебску

Працягвалася свята ўшанаваннем пераможцаў конкурсу "Чалавек года". Уладальнікамі ганаровага звання сталі сем жыхароў рэгіёна — работнікі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, культуры, праваахоўных органаў.

— Гэты конкурс — свайго роду сацыяльная Алімпіяда, у якой зма-

гаюцца шырынёй душы, колькасцю добрых спраў і гатоўнасцю прыйсці на дапамогу, — адзначыў, уручаючы ўзнагароды, старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей. — Для гэтых людзей няма чужога гора, і яны заўсёды гатовыя ахвяраваць сваімі інтарэсамі для дасягнення высокіх мэтаў і гуманных каштоўнасцяў.

***Віцебская вобласць***

Кранальныя мелодыі песень ваенных гадоў гучалі 3 ліпеня з усіх галоўных пляцовак вобласці. Сотні людзей сабралі ў абласным цэнтры святочны мітынг і наступны вялікі канцэрт з удзелам лепшых творчых калектываў горада.

У Полацку 3 ліпеня адзначылі масавым заплывам на байдарках і каноэ па Заходняй Дзвіне. А жыхары Кастрычніцкага сельсавета ў Віцебскім раёне аб'ядналіся, каб павіншаваць з Днём Незалежнасці двух сваіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. У сувязі са станам здароўя па тэлефоне прымаў віншаванні Валянцін



БЕЛТА

Падчас салюта ў Брэсцкай крэпасці

Максімавіч Антанішын. Асабіста — Міхаіл Уладзіміравіч Ратамскі. У свае 95 гадоў ён вядзе актыўны лад жыцця, часта сустракаецца з вучнямі Капцянскай сярэдняй школы, дзе працаваў настаўнікам. З галоўным дзяржаўным святам Беларусі яго павіншавалі работнікі культуры і сельвыканкама, моладзь, сябры і аднавяскоўцы. З кветкамі прыйшоў практычна кожны. Невялікі, але вельмі душэўны канцэрт і шматлікія пажаданні здароўя і даўгалецця ад усіх удзельнікаў цёплай сустрэчы расчулілі ветэрана:

— Ва ўсе часы трэба памятаць, што незалежнасць — галоўнае багацце народа, якое трэба берагчы, і трэба разумець, да чаго можа прывесці яе страта. Я веру ў нашу моладзь, нашых дзяцей. Яны захаваюць памяць пра трагічныя падзеі вайны і здолеюць зберагчы нашу родную зямлю.

***Брэсцкая вобласць***

Актыўны ўдзел у святочных мерапрыемствах у Дзень Незалежнасці ў Брэсце прыняла моладзь. Каля кінатэатра "Беларусь" на вуліцы Савецкай маладыя людзі зладзілі яркі флэшмоб "Дзень вышыванкі". Удзельнікі акцыі выканалі папулярную кампазіцыю "Сэрца Беларусі", запусцілі ў неба паветраныя шары ў колерах нацыянальнай сімволікі.




БЕЛТА

Акцыя "Спяём гімн разам" у Гродна

У мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой" па традыцыі ўсклалі кветкі на плошчы Цырыманіялаў з удзелам кіраўніцтва аблвыканкама і горада, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый. Памяць загінуўшых абаронцаў Айчыны ў Брэсце ўшанавалі і на плошчы Свабоды ля манумента ў гонар войскаў 1-га Беларускага фронту.

Увечары на пляцоўцы перад галоўным уваходам у мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" прайшоў святочны канцэрт.

***Гродзенская вобласць***

З ускладання вянкоў і кветак да помніка загінулым воінам і партызанам у парку імя Жылібера пачыналася святкаванне 3 ліпеня ў Гродне. Аддаючы даніну памяці абаронцам Радзімы, парадным строем прайшлі вайскоўцы Гродзенскага гарнізона, прагрымеў салют са стралковай зброі.

Святочнымі галасамі гучалі ў гэты дзень усе райцэнтры рэгіёну, дзе імкнуліся парадаваць і здзівіць сваіх жыхароў. Так, спецыяльны падарунак — канцэрт на балконе — гродзенцам і гасцям горада падрыхтавалі артысты абласной філармоніі. У праграму яны ўключылі самыя лепшыя музычныя творы са свайго рэпертуару.

Замест ваеннага парада ў Лідзе ўпершыню правялі сельскагаспадарчы парад. Калона з толькі што закупленых мясцовымі сельгасарганізацыямі збожжаўборачных камбайнаў і іншых машын праехала ад Кургана Неўміручасці да кальца на выездзе з вуліцы Камуністычнай.

***Магілёўская вобласць***

Больш за пяць тысяч магіляўчан і гасцей горада сабраліся 3 ліпеня на легендарным Буйніцкім полі. Тут прайшлі святочны канцэрт і тэатралізаваная рэканструкцыя баёў абароны Магілёва ў 1941 годзе.



БЕЛТА

На Буйнічскім полі

Старшыня грамадскай арганізацыі "Магілёўская абласная асацыяцыя малалетніх вязняў фашысцкай няволі" Галіна Рыбцова падзялілася:

— Дзень Незалежнасці — наша агульнае свята. І я хачу пажадаць краіне росквіту, а сваім суайчыннікам — жыць у дружбе і згодзе пад мірным небам Беларусі.

Аляксей **Фядосаў**

БЕЛТА




# НЕ ПРОСТА ДОБРЫЯ СУСЕДЗІ

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПРАПАНАВАЎ РАСПРАЦАВАЦЬ ДОЎГАТЭРМІНОВУЮ СТРАТЭГІЮ ІНТЭГРАЦЫІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**У самым канцы чэрвеня і пачатку ліпеня ў Мінску і Маскве прайшоў VIII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. За сем гадоў працы гэтая пляцоўка даказала сваю запатрабаванасць. Не здарма за мінулы час заключана каля чатырохсот пагадненняў і кантрактаў амаль на тры мільярды долараў. Цяперашні форум дадасць у гэтую скарбонку яшчэ 800 мільёнаў. Усё гэта накіравана на развіццё нацыянальных эканомік дзвюх краін, на карысць нашых народаў, гаварылі напярэдадні прэзідэнты Беларусі і Расіі на пленарным пасяджэнні форуму, якое прайшло ў фармаце відэаканферэнцсувязі.**

***Лічбавы парадак дня***

Аляксандр Лукашэнка прыкмеціў той факт, што без цеснага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусь і Расія ніколі б не мелі такіх блізкіх, саюзніцкіх адносін. А ў сучасных умовах гэта актуальна ўдвая. Сёння Беларусь падтрымлівае цесныя кантакты больш чым з 70 рэгіёнамі Расіі — ад Смаленска да Сахаліна. Кожны год Мінск прымае не менш дзясятка дэлегацый, узначаленых расійскімі губернатарамі. Паводле слоў Прэзідэнта, Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі стаў найважнейшым эканамічным і камунікацыйным праектам Саюзнай дзяржавы:

— На еўразійскай прасторы няма іншай маштабнай інтэграцыйнай пляцоўкі, дзе беларуска-расійскае супрацоўніцтва развівалася б гэтак паспяхова.

На думку Кіраўніка беларускай дзяржавы, прыйшоў час выпрацаваць сумесны лічбавы парадак дня, арыентаваны на практыку:

— Добрай падмогай для рэалізацыі гэтай ідэі павінны быць праграмы Саюзнай дзяржавы. Большасць з іх дазваляе нам ствараць і тыражыраваць высокатэхналагічныя матэрыялы і вытворчасці. Тым больш што супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх навукоўцаў па лініі акадэмічнай навукі інтэнсіўна развіваецца.

Гэта тычыцца, у прыватнасці, узаемадзеяння ў даследаванні космасу, стварэння высокапрадукцыйных сістэм апрацоўкі інфармацыі, нанаматэрыялаў. Але самым грандыёзным і паспяховым беларуска-расійскім праектам апошніх дзесяцігоддзяў Аляксандр Лукашэнка назваў будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі:

— Літаральна нядаўна ўведзены ў прамысловую эксплуатацыю першы блок Беларускай АЭС. Праз год запрацуе другі. Гэта яркае сведчанне таго, што ў беларусаў і расійцаў ёсць усе магчымасці і надалей пашыраць эканамічныя, культурныя і проста сяброўскія сувязі.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што Расія не толькі адгукнулася на просьбу Беларусі пабудаваць атамную электрастанцыю, але і пагадзілася падключыць да ўзвядзення аб'екта айчынных спецыялістаў, каб яны атрымалі каштоўны вопыт працы на такіх унікальных праектах.

— Мы таксама з Прэзідэнтам Расіі дамовіліся, што пры неабходнасці (а такая неабходнасць ужо ёсць) будзем гатовыя сумесна з расіянамі ажыццявіць такія праекты за межамі Беларусі і Расіі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

***Прыярытэты супрацоўніцтва***

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі адбываецца на фоне росту напружанасці на міжнароднай арэне, дзе пакуль пераважаюць дэструктыўныя тэндэнцыі. Сур'ёзным выпрабаваннем на трываласць стала пандэмія. Кажучы аб сучасных геапалітычных выкліках, Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што заходнія дзяржавы зрабілі стаўку на сілу, адкрыта ўмешваюцца ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, пастаянна мяняюць правілы гульні, ігнаруючы базавыя дамоўленасці:

— Мы бачым, якія намаганні прыкладае кіраўніцтва Расіі, каб захаваць крохкі баланс сіл на планеце. Аднак, на жаль, на калектыўным Захадзе, у Вашынгтоне і Брусэлі, не заўсёды хочуць чуць канструктыўныя прапановы. Нашы апаненты тармозяць усе разумныя, пазітыўныя ініцыятывы і правакуюць новыя крызісы. Па сутнасці, наўмысна руйнуецца архітэктура бяспекі, створаная пасля Другой сусветнай вайны, за якую мы заплацілі амаль 30 мільёнамі жыццяў савецкіх людзей.

Па перакананні Аляксандра Лукашэнкі, спачатку былыя саюзнікі выгадавалі пакаленне, якому казалі, што развязаў вайну Сталін, а выйгралі Злучаныя Штаты і Англія. А цяпер яны перапісваюць гісторыю і спрабуюць рэабілітаваць нацызм. Асобныя постсавецкія краіны ўжо ў поўнай меры адчулі гэта на сабе, але рэалізаваць падобны сцэнарый у Беларусі не ўдалося, канстатаваў Прэзідэнт:

— Таму мы падвяргаемся непрыкрытаму эканамічнаму і палітычнаму прэсінгу. Ён, можа быць, і не спатрэбіўся б цяпер, калі б яны выйгралі той бліцкрыг, які пачалі ў жніўні мінулага года. Нешта ў іх пайшло не так. Разам з тым зразумела, што ўсе санкцыі — проста бесцырымонныя спробы ліквідаваць эканамічных канкурэнтаў і накласці лапу на чалавечыя і матэрыяльныя рэсурсы нашых дзяржаў. Захад нацэлены на стрымліванне развіцця, зрыў інтэграцыйных праектаў і змену курсу беларускай дзяржавы (і не толькі беларускай). Таму асаблівае значэнне набываюць умацаванне адзінства і пашырэнне супрацоўніцтва.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Прэзідэнту Расіі і ўсім расіянам за падтрымку ў барацьбе за захаванне суверэнітэту і незалежнасці Беларусі.

***Мы павінны разлічваць толькі на ўласныя сілы і кааперацыю. Менавіта прамысловая і навуковая кааперацыя бачыцца галоўным рухавіком інтэграцыі***




БЕЛТА

***Вектары далейшага развіцця***

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў распрацаваць доўгатэрміновую стратэгію інтэграцыі Саюзнай дзяржавы. У 2022 годзе завяршаецца рэалізацыя прыярытэтных напрамкаў і першачарговых задач развіцця Саюзнай дзяржавы, якія традыцыйна зацвярджаюцца на чатыры гады:

— Прапаную разгледзець магчымасць падрыхтоўкі доўгатэрміновай стратэгіі інтэграцыі Саюзнай дзяржавы (напрыклад, да 2030 года), напоўніць яе канкрэтнымі праектамі з улікам ключавых прыярытэтаў і вектараў развіцця.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Расія заўсёды была, ёсць і будзе стратэгічным партнёрам Беларусі, а братэрскі саюз — гэта каштоўнасць, якую неабходна захаваць, прымножыць і перадаць будучым пакаленням.

— Беларусь для нас не проста добры сусед, але перш за ўсё — бліжэйшы саюзнік, — падкрэсліў у сваім выступленні Уладзімір Пуцін, адзначыўшы, што адносіны паміж дзвюма краінамі будуюцца на прынцыпах узаемапавагі, падтрымкі і ўліку інтарэсаў адзін аднаго. І дадаў:

— Мы прадоўжым аказваць усебаковую дапамогу брацкаму беларускаму народу ў цяперашняй не самай простай унутрыпалітычнай абстаноўцы ў Беларусі ва ўмовах бесперапыннага палітычнага і санкцыйнага ціску, зацятых спробаў звонку разгайдаць сітуацыю. Лічым, што забарона на пастаўку ў краіны ЕС з Беларусі шэрагу тавараў наносіць шкоду інтарэсам бізнесу і звычайным грамадзянам. Вось аб чым трэба было б падумаць тым, хто здзяйсняе такія дзеянні.

Прэзідэнт Расіі лічыць, што пытанне захавання памяці аб Вялікай Перамозе, недапушчэнне спробаў фальсіфікацыі гісторыі, патрыятычнае выхаванне моладзі павінна быць у фокусе ўвагі Саюзнай дзяржавы:

— Быць спадчыннікамі пакалення пераможцаў — не толькі вялікі гонар, але і велізарная адказнасць за захаванне традыцый баявога братэрства, узаемадапамогі, загартаваных у суровыя ваенныя гады.

Васіль **Харытонаў**

# ПЛАНАМ НАКАНАВАНА СПРАЎДЖВАЦЦА

БЕЛТА




КЛЮЧАВАЯ ТЭМА СУСТРЭЧ І АБМЕРКАВАННЯЎ НА VIII ФОРУМЕ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ — ДЗЕЛАВЫЯ КАНТАКТЫ Ў ЭПОХУ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ. ВЫНІКАМ ПРАЦЫ ТРОХДЗЁННАЙ ПЛЯЦОЎКІ СТАЛА ПАДПІСАННЕ КАНТРАКТАЎ НА РЭКОРДНУЮ СУМУ.

**Нягледзячы на няпростую эпідэмічную сітуацыю, фармат форума застаўся нязменным — пленарнае пасяджэнне з удзелам кіраўнікоў дзяржаў, праца профільных сесій і мерапрыемствы па ўмацаванні гандлёва-эканамічнага сектара паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі. Праўда, большая частка перамоў і сустрэч прайшла ў рэжыме анлайн. Відэаканферэнцыі, у прыватнасці, звязалі верхнія палаты парламентаў: у Маскве — Савет Федэрацыі, у Мінску — Савет Рэспублікі.**

***Лічбавыя тэхналогіі — у парадку дня***

У пленарным пасяджэнні VIII Форуму рэгіёнаў, прысвечаным навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву дзвюх краін у эпоху цыфравізацыі, прынялі ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава і старшыня Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка.

— Лічбавыя і іншыя навукаёмістыя тэхналогіі літаральна пранізваюць усе сферы жыцця, становяцца фактарам і эканамічнага развіцця дзяржаў, і росту дабрабыту нашых грамадзян. У Расіі і Беларусі, безумоўна, ёсць перавага: нас заўсёды адрознівалі высокі ўзровень акадэмічнай галіновай навукі, імкненне эфектыўна выкарыстоўваць вынікі перадавых даследаванняў і распрацовак. Заканамерна, што супрацоўніцтва ў сферы навукі і тэхналогій з першых гадоў Саюзнай дзяржавы ўваходзіла ў лік прыярытэтаў нашай агульнай працы, — адзначыла Валянціна Мацвіенка.

Кіраўнік верхняй палаты беларускага Парламента Наталля Качанава звярнула ўвагу, што цыфравізацыя — гэта не толькі акно магчымасцяў, але і крыніца глабальных выклікаў:

— Кібертэхналогіі — магутная зброя, якая нярэдка выкарыстоўваецца ў супрацьпраўных мэтах. Яе мішэнню з'яўляюцца не толькі асобныя грамадзяне. Рэальнасцю сталі развязаная Захадам супраць нашых краін інфармацыйная вайна, масіраваны санкцыйны ціск. Іх мэта — аслабіць нас, у тым ліку тэхналагічна.

На думку ўдзельнікаў пленарнага пасяджэння як з беларускага, так і з расійскага боку, адзіна верным выхадам з сітуацыі, якая склалася, будзе згуртаванае супрацьстаянне пагрозам звонку.

— У 80-ю гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны мы можам цвёрда сказаць: у той вайне мы выстаялі, таму што былі адзіныя. Нам, заканадаўцам, трэба дзейнічаць на апярэджанне. Мы абавязаны паставіць надзейны прававы заслон прапагандзе гвалту, распальвання злосці і нянавісці, правакацыям, фэйкам і псіхозу ў сетцы. Забяспечыць дзейсную абарону персанальных дадзеных і асабістай прасторы чалавека ад усёпранікальнага электроннага кантролю. Сумесная выпрацоўка падыходаў да рэгулявання лічбавай сферы дазволіць прымаць на нацыянальным узроўні ўзважаныя рашэнні, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Я прапаную стварыць на двухбаковай аснове групу высокага ўзроўню як для прапрацоўкі пытанняў удасканалення заканадаўства ў гэтым кірунку, так і для пошуку шляхоў яго эфектыўнага ператварэння ў жыццё.

Паводле слоў Наталлі Качанавай, Беларусь і Расія выступаюць за актыўнае выкарыстанне лічбавых тэхналогій у падрыхтоўцы кадраў, запатрабаваных эканомікай, навучэнцаў і маладых навукоўцаў для навуковай дзейнасці:

— Аб'ядноўваючы свой патэнцыял, мы спрыяем умацаванню суверэнітэту і незалежнасці нашых краін. Галоўны рэсурс у пабудове эканомікі ведаў — чалавек. Мы па праве ганарымся тым, што не толькі захавалі з савецкіх часоў высокі ўзровень адукацыі і навуковыя школы, але і асвоілі новыя кірункі: IT, бія- і нанатэхналогіі, біяінфарматыку. Патрэбы галін народнай гаспадаркі ў спецыялістах, здольных эфектыўна ўжываць перадавыя тэхналогіі, імкліва растуць. Таму так важна аб'яднаць намаганні Беларусі і Расіі ў забеспячэнні апераджальных тэмпаў развіцця кадравага патэнцыялу.

***Перспектывы, заснаваныя на ўпэўненасці***

Паколькі супрацоўніцтва ў межах Саюзнай дзяржавы ўсё шырэй выходзіць на лічбавыя прасторы, менавіта працы з інавацыямі і сучаснымі тэхналогіямі ва ўсіх сферах жыцця была прысвечана значная частка форуму.

— Мы вельмі вялікую ўвагу (і гэта прыемна) надаем пытанням інфармацыйнай бяспекі, інфармацыйных адносін і наогул развіццю нашага грамадства ў эпоху цыфравізацыі. Важна, што ў межах адносін Расіі і Беларусі мы

гаворым не толькі аб газе, аб пытаннях будаўніцтва, гандлю і прамысловасці, але і аб такіх важных рэчах, як навакольнае асяроддзе, адукацыя і навука ў эпоху цыфравізацыі, — заўважыў дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алег Макараў.

Перспектывы саюзнай партнёрства ва ўмовах пандэміі, інфармацыйных войнаў, санкцый акрэсліў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч:

— Беларусь і Расія валодаюць значным навукова-тэхнічным, тэхналагічным патэнцыялам, які дазваляе заняць вядучыя пазіцыі ў свеце па многіх кірунках у сферы лічбавых тэхналогій. Большасць рэгіёнаў нашых краін удзельнічаюць у сумесных адукацыйных і навуковых праектах. З 2000 года рэалізавана 57 праграм Саюзнай дзяржавы ў радыёэлектроніцы, мікраэлектроніцы, сферы касмічных тэхналогій і іншых галінах.

Аднак, на думку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея Рачкова, рэальныя вынікі саюзных праграм можна адчуць толькі праз укараненне навуковых дасягненняў у вытворчы працэс:

— Нягледзячы на наяўную станоўчую дынаміку высокатэхналагічных вытворчасцяй у рэальным сектары эканомікі Беларусі і Расіі, у гэтым напрамку працу варта выводзіць на больш высокі ўзровень. Ключавую ролю ў працэсе павінна адыграць інтэграцыя навуковых, адукацыйных і вытворчых арганізацый для стварэння і вываду на сусветны рынак новых сумесных тэхналогій і прадуктаў.

Інфармацыйную бяспеку будучага неабходна фарміраваць ўжо сёння. Намеснік міністра навукі і вышэйшай адукацыі Расіі Наталля Бачарова падкрэсліла, што нават у пандэмійны 2020 год дзвюм дзяржавам удалося не зменшыць абароты ў сферы адукацыйнага супрацоўніцтва. Сёння больш за 10 тысяч беларускіх студэнтаў навучаюцца ў Расійскай Федэрацыі, з іх каля чатырох тысяч — на бюджэтнай аснове. У 2021 годзе нават была павялічана квота для беларускіх абітурыентаў і атрымана каля 900 заявак на навучанне па квотах.

— Плануем з Дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем Мезенцавым прыняць удзел у адкрыцці летніх універсітэтаў, якія будуць праходзіць у 12 нашых ВНУ на тэрыторыі сямі федэральных акругаў. Ахоп — ад Калінінграда да Уладзівастока. Пры гэтым каля 700 беларускіх студэнтаў змогуць прайсці ў іх двухтыднёвае навучанне. Праект прадугледжвае 19 адукацыйных праграм і сем інтэнсіваў, — расказала Наталля Бачарова.

***Поспех — у канкрэтных справах***

Узаемадзеянне эканомік і прамысловая кааперацыя ў Саюзнай дзяржаве — яшчэ адна актуальная тэма ў інтэграцыйным парадку.

— Форум рэгіёнаў даказаў сваю слушнасць, выніковасць. Пра гэта гавораць тыя пагадненні і кантракты, якія падпісваюцца на палях форуму. Гэта тая пляцоўка, дзе сустракаюцца суб'екты рэгіянальнага гаспадарання, абмяркоўваецца ўжо практыка прымянення існуючых заканадаўстваў і тыя праблемныя моманты, пытанні, якія перашкаджаюць яшчэ далейшаму збліжэнню. Тады яны выносяцца на больш высокі ўзровень, дзе ўжо прымаюцца адпаведныя заканадаўчыя акты, — заявіў намеснік старшыні



БЕЛТА

Падчас работы форуму

БЕЛТА



На форуме абмяркоўваліся актуальныя тэмы

Савета Рэспублікі Анатоль Ісачанка на міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву. — Ва ўмовах санкцыйнага ціску з боку калектыўнага Захаду пытанні інтэграцыі, аб'яднання, уніфікацыі заканадаўстваў па асобных напрамках набываюць важнае значэнне.

Сёння каля 80 расійскіх рэгіёнаў удзельнічаюць у супрацоўніцтве з Беларуссю. Адзін з самых актыўных — Башкартастан, на тэрыторыі якога дзейнічае 14 прадпрыемстваў, створаных пры ўдзеле беларускага капіталу. А цяпер ужо абмяркоўваецца пытанне не толькі аб пашырэнні паставак у рэгіён беларускай аўтамабільнай, сельскагаспадарчай і будаўнічай тэхнікі, але і аб наладжванні яе зборкі на месцах.

— Іншы прыклад — Курская вобласць, дзе налічваецца больш за 80 фірменных магазінаў беларускіх вытворцаў, а ў самім горадзе Курску Мазырскі домабудаўнічы камбінат ажыццяўляе забудову жылога комплексу "Беларускі квартал", — падзяліўся поспехамі намеснік старшыні Савета Федэрацыі Юрый Вараб'ёў. — Калі глядзець у цэлым, то па выніках мінулага года ўзаемны тавараварот паміж краінамі склаў 29,5 мільярда долараў. У першым квартале бягучага года па адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года ён вырас на 21 працэнт. Беларусь займае чацвёртае месца сярод гандлёвых партнёраў Расіі, а сярод краін СНД — першае. Больш таго, расійскія інвестыцыі ў беларускую эканоміку ў мінулым годзе перавысілі 4 мільярды долараў. Буйнейшым сумесным інвестыцыйным праектам з'яўляецца будаўніцтва двухблочнай Беларускай атамнай станцыі. І ўсё гэта стала магчымым дзякуючы актыўнай працы не толькі зверху, але і на ўзроўні асобных рэгіёнаў, кампаній, людзей.

Гаварылі на Форуме і аб сумеснай працы ў сферы імпартазамяшчэння.

— Зроблены першыя крокі — разгледжаны праект па комплекснаму авіябудаванню. Беларускі бок гатовы выступіць пляцоўкай для праектаў з высокім эканамічным эфектам — гэта тое, што называецца праектамі будучыні ў галіне інавацыйнай аховы здароўя і фармацэўтыкі, стварэння разумнага горада. Мы зацікаўлены, каб да рэалізацыі гэтых задум далучыўся расійскі бок, — выступіў з прапановамі першы намеснік міністра эканомікі Беларусі Юрый Чабатар.

Добрая традыцыя ў межах Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі — пасяджэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва. Сёлета на пляцоўцы быў падпісаны шэраг камерцыйных кантрактаў на суму звыш 70 мільёнаў долараў у сферы нафтахіміі і прамысловасці.

На думку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяны Рунец, на этапе пасткавіднага аднаўлення і дзяржава, і асобна ўзяты бізнес вырашаюць складаныя задачы, каб выйсці на траекторыю ўстойлівага росту, эфектыўна і паслядоўна развіваць свае канкурэнтныя перавагі, умацоўваць інвестыцыйны патэнцыял.

— У вырашэнні гэтых задач для суб'ектаў гаспадарання Беларусі і Расіі важную ролю адыгрывае фактар інтэграцыі, напрацаваныя сувязі паміж асобнымі рэгіёнамі нашых краін. Дадзеныя гандлёвага балансу пацвярджаюць гэты тэзіс. Разлічваем, што наш узаемны тавараварот будзе і далей прырастаць, — падкрэсліла сенатар.

У цэнтры ўвагі Савета дзелавога супрацоўніцтва на VIII Форуме рэгіёнаў аказалася ліквідацыя бар'ераў на шляху пашырэння эканамічнага супрацоўніцтва, паляпшэння ўмоў для працы бізнесу ў абедзвюх краінах. На думку саюзных экспертаў, рэалізацыя сумесных праектаў, механізмы падтрымкі кааперацыі і ўзаемных інвестыцый — ключавыя ўмовы для паўнавартаснай інтэграцыі і далейшага будаўніцтва Саюзнай дзяржавы.

## МЕРКАВАННІ

***Дзмітрый Мезенцаў, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы:***

— Падтрымка міжрэгіянальнага супрацоўніцтва мае найважнейшае значэнне, і ў тым ліку на пляцоўцы верхніх палат Парламента. Там традыцыйна адказваюць за ўвагу да рэгіёнаў, за ўлік іх запытаў. Тэма цыфравізацыі нацыянальнай эканомікі, укаранення сучасных тэхналогій у практыку рэгіянальнага і муніцыпальнага кіравання прымушае падтрымаць мясцовыя ўлады ў гэтым важным кірунку. Больш за тое, шэрагу рэгіёнаў ужо сёння трэба спрабаваць выкарыстоўваць той пазітыўны вопыт, які маецца ў Беларусі і Расіі.

***Андрэй Худык, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:***

— З Расіяй нас аб'ядноўвае блізкасць тэрыторый, біяразнастайнасць, трансгранічны перанос забруджвальных рэчываў, ахова вод, стварэнне сумесных біялагічных рэзерватаў. Разам з тым ёсць больш глабальныя і надзённыя праблемы. Гэта перш за ўсё абыходжанне з адходамі. Супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй у гэтай сферы ў нас не выклікае ніякіх сумненняў. Ёсць сур'ёзныя дамоўленасці і перспектывы. Безумоўна, Беларусь сёння выйшла ў гэтым плане наперад як мінімум на постсавецкай прасторы. Расійскія калегі вельмі зацікаўленыя нашым прыкладам, і мы гатовыя дзяліцца з імі вопытам. Ужо цяпер распрацоўваюцца сумесныя мерапрыемствы па мінімізацыі наступстваў для эканомік краін у сувязі з увядзеннем ЕС вугляроднага падатку. Гэтыя пытанні абмяркоўваюцца на сумесных калегіях і ў экспертных групах. На Форуме рэгіёнаў мы дамовіліся аб стварэнні дарожнай карты.

***Ягор Макарэвіч, старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Беларусі:***

— Калегі з Расійскай Федэрацыі падтрымалі нашу прапанову, каб у наступным годзе ў рамках Форуму рэгіёнаў і яго маладзёжнай парламенцкай павесткі мы правялі Беларуска-Расійскі моладзевы эканамічны форум. У нас вялікая колькасць маладых прадпрымальнікаў, маладых кіраўнікоў у дзяржаўных і прыватных арганізацыях. Таму вельмі важна, каб і на ўзроўні моладзі выстройваліся эканамічныя, кааперацыйныя сувязі. Чаму б не запрасіць, напрыклад, паспяховых кіраўнікоў ІТ-сферы, абмеркаваць праблемныя моманты, прадпрымальніцтва "да 30"? Гэта вельмі перспектыўная ініцыятыва.

***Уладзімір Каранік, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:***

— На форуме падпісалі пагадненні аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве з Рэспублікай Башкартастан і Томскай вобласцю. Пры гэтым у Гродзеншчыны ўжо маецца 25 пагадненняў аб супрацоўніцтве з Расійскай Федэрацыяй. Наша вобласць экспартуе туды больш за 50 працэнтаў прадукцыі. Мы плануем і надалей развіваць гэты кірунак, пашыраць геаграфію паставак, асартымент і наменклатуру прадукцыі, якая пастаўляецца. Аднак яшчэ большую каштоўнасць набывае навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне. Гэта сумесныя праекты, распрацоўкі, якія будуць не толькі стымуляваць узаемны гандаль, але і павысяць канкурэнтаздольнасць нашых кампаній на знешнім рынку за кошт укаранення найбольш удалых распрацовак беларускіх і расійскіх навукоўцаў. Гэтаму спрыяе і работа ў межах форуму. Жыццё наглядна паказала, што COVID-19 рана скідваць з рахункаў і нашы краіны павінны быць гатовыя да align рознага роду выклікаў і ўмець стварыць тую эканоміку, якая будзе ўстойлівая да знешніх уздзеянняў.

## НАША ДАВЕДКА

І Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі прайшоў у Мінску ў 2014 годзе. Удзел у ім тады прынялі каля трохсот чалавек. У беларускую сталіцу прыехалі прадстаўнікі 19 расійскіх рэгіёнаў. Тэматычным складнікам абмеркаванняў стала эфектыўнае развіццё аграпрамысловых комплексаў як найважнейшая ўмова харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы, а па выніках было падпісана чатыры пагадненні.

Пасля форум прымалі Сочы, Мінск, Масква, Магілёў, Санкт-Пецярбург. Штогод арганізатары выбіралі ключавы акцэнт для наладжвання новых кантактаў у міжрэгіянальным супрацоўніцтве — прамысловасць, сацыяльная сфера, ІТ-тэхналогіі і інавацыі, гандлёва-эканамічныя сувязі, гуманітарныя праекты, эканоміка. Прычым кожны раз Форум рэгіёнаў даваў рэальны вынік не толькі на словах, але і ў выглядзе заключаных кантрактаў. За сем гадоў працы ў скарбонцы рэгіянальнага партнёрства дзелавыя дагаворы з агульнай сумай 3 мільярды долараў і каля 400 пагадненняў аб супрацоўніцтве на ўзроўні асобных ведамстваў, гарадоў, абласцей, прадпрыемстваў і кампаній.

У мінулым годзе з-за складанай эпідэмічнай абстаноўкі пляцоўкай для сустрэч упершыню выступіў інтэрнэт: тэматычныя секцыі і пленарнае пасяджэнне прайшло ў фармаце відэаканфэрэнцый. Зрэшты, гэта не перашкодзіла беларуска-расійскім партнёрам падпісаць кантракты на рэкордную суму звыш 700 мільёнаў долараў.

Уладзімір **Міхайлаў**

# АРГУМЕНТЫ НА КАРЫСЦЬ СТАСУНКАЎ

**Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк "Вялікі камень", што знаходзіцца паблізу ад Мінска, зарэкамендаваў сябе не толькі прывабнай пляцоўкай для вядзення бізнесу, але і стаў месцам правядзення сустрэч, калі разглядаюцца пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў самым шырокім кантэксце. Вось і спачатку ліпеня менавіта тут прайшоў Беларуска-кітайскі форум, падчас якога эксперты абмеркавалі вынікі сумеснай працы дзвюх краін у навукова-эканамічнай, медыйнай і культурнай сферах.**

Варта мець на ўвазе, што такое прадстаўнічае мерапрыемства ў "Вялікім камені" праходзіла пад знакам 100-годдзя Камуністычнай партыі Кітая, якая, як адзначыў мадэратар форуму старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй Крывашэеў, шмат у чым паўплывала не толькі на лёс кітайскага народа, але і на лёсы народаў свету:

— Мы хацелі б па-новаму глыбока пераасэнсаваць партыйнае будаўніцтва КНР, паколькі цяпер Беларусь праходзіць вельмі важны этап у сваім развіцці: ідзе працэс мадэрнізацыі Асноўнага Закона нашай краіны — Канстытуцыі, фарміруецца новае палітычнае і партыйнае поле.

Як адзначыў дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алег Макараў, адзін з феноменаў — адаптыўнасць кітайскай мадэлі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця. У гэтым сэнсе адметным з'яўляецца тое, што Беларусь і КНР дасягнулі значнай ступені інтэграцыі, якая прызнана ва ўсім свеце. Дзве краіны вызначылі такі ўзровень узаемадзеяння як жалезнае братэрства.

Па словах дэкана факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзіма Гігіна, кітайская мадэль шмат у чым унікальная. Перш за ўсё з-за сваёй гнуткасці і прадукцыйнага выкарыстання канструктыўнага патэнцыялу грамадства.

Як перакананы старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Марзалюк, супрацоўніцтва Беларусі і Кітая вельмі плённае. Гэта тычыцца як эканамічных паказчыкаў, так і гуманітарных узаемасувязяў.

На думку намесніка міністра інфармацыі Ігара Бузоўскага, ва ўмовах вострай канкурэнцыі і супрацьстаяння на сусветнай арэне Кітай атрымаў цывілізацыйную перамогу. Актыўна адбываецца супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Паднябеснай у медыясферы. Адзін з адметных праектаў — выданне кнігі старшыні КНР Сі Цзіньпіна аб дзяржаўным кіраванні на беларускай мове.

БЕЛТА



Урачыстае адкрыццё Беларуска-кітайскага форуму

У сваю чаргу старшыня ЦК Камуністычнай партыі Беларусі Аляксей Сокал, ацэньваючы ўзровень супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, заўважыў, што ініцыятыва "Адзін пояс і адзін шлях" стала найбуйнейшай у свеце платформай для дзелавога супрацоўніцтва:

— Дзякуючы асаблівым, дружалюбным адносінам кіраўнікоў нашых дзяржаў і заслузе Кампартыі Кітая дзве краіны выбудоўваюць трывалыя эканамічныя сувязі. Толькі за мінулы год тавараразварот Беларусі і Кітая склаў больш за 4,5 млрд долараў, экспарт беларускай прадукцыі павялічыўся практычна на дзесяць працэнтаў. Па выніках мінулага года Кітай стаў другім гандлёвым партнёрам нашай краіны пасля Расіі. І гэты патэнцыял з кожным годам нарошчваецца.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Се Сяоюн, выступаючы на форуме, падкрэсліў, што Беларусь — важны ўсебаковы стратэгічны партнёр Кітая і адна з першых краін, якая адгукнулася на ўдзел у ініцыятыве "Адзін пояс і адзін шлях":

— У апошнія гады кітайска-беларускія адносіны дазваляюць нарошчваць супрацоўніцтва ў розных галінах і прыносяць плённыя вынікі.

Пасол высока ацаніў міжрэгіянальную кааперацыю. У супрацьэпідэміялагічным супрацоўніцтве дзве краіны таксама, паводле яго слоў, паказалі, што "дружба даражэй золата".

Падчас форуму выступіла каля паўтара дзясятка спікераў. Па тэматыцы дакладаў адбыліся ажыўленыя дыскусіі. У межах мерапрыемства для яго ўдзельнікаў была праведзена азнаямляльная экскурсія па навукова-даследчаму цэнтру "Вялікага каменя".

Кіраўнік адміністрацыі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка Аляксандр Ярашэнка звярнуў увагу на тое, што ўжо на працягу многіх гадоў Кітай — стратэгічны партнёр Беларусі:

— Нашы краіны нарошчваюць ўзаемадзеянне, актыўна рэалізуюць ініцыятывы і праекты. "Вялікі камень" — самы буйны праект паспяховага двухбаковага супрацоўніцтва. Гэта адна з вузлавых платформаў ініцыятывы "Адзін пояс і адзін шлях", шмат у чым праект садзейнічае яе развіццю, прыцягваючы перадавыя ідэі і тэхналогіі.




БЕЛТА



БЕЛТА

Старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй Крывашэеў



БЕЛТА

Старшыня адміністрацыі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка "Вялікі камень" Аляксандр Ярашэнка

Пра тое, што сёння супрацоўніцтва ў сферы адукацыі паміж Беларуссю і Кітаем рухаецца ў рэчышчы двухбаковага палітычнага і эканамічнага дыялогу, актыўна набірае абароты, гаварыла на форуме першы намеснік міністра адукацыі Ірына Старавойтава. Яна ж адзначыла, што аснову гэтых адносін заклалі кіраўнікі дзвюх дзяржаў. Дзякуючы іх намаганням сфарміраваны каласальны патэнцыял для развіцця двухбаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. "Мы са свайго боку прыкладзем усе намаганні, каб забяспечыць далейшае ўмацаванне плённага ўзаемадзеяння на карысць нашых краін у сферы адукацыі. Менавіта такое ўзаемадзеянне, фарміруючы інтэлектуальны, навуковы, творчы і тэхналагічны патэнцыял, стварае аснову для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржаў і з'яўляецца гарантам сацыяльнай стабільнасці грамадства", — удакладніла Ірына Старавойтава.

Сапраўды, дзякуючы сумесным намаганням апошнім часам удалося істотна нарасціць дынаміку і змест беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння. Так, сфарміраваную некалькімі пагадненнямі міжурадавага і міжведамаснага ўзроўню дагаворна-прававую базу ў сферы адукацыі паміж Беларуссю і Кітаем дапаўняюць каля пяцісот прамых дагавораў аб супрацоўніцтве паміж установамі адукацыі дзвюх краін. Рэалізуюцца звыш дваццаці сумесных адукацыйных праграм першай ступені вышэйшай адукацыі і больш за дзесяць — другой ступені. На базе ўстаноў адукацыі дзвюх краін функцыянуюць дзве сумесныя адукацыйныя структуры і чатыры навуковыя лабараторыі.

Безумоўна, прыкметным этапам стала рэалізацыя ў 2019 годзе такой

БЕЛТА



На форуме вялася зацікаўленая дыскусія

адметнай ініцыятывы ў беларуска-кітайскіх адносінах як Год адукацыі Беларусі ў Кітаі. У цесным узаемадзеянні бакам удалося правесці на высокім арганізацыйным узроўні шэраг змястоўных мерапрыемстваў з шырокім удзелам акадэмічнай і маладзёжнай грамадскасці Беларусі і Кітая.

Важнае значэнне ў межах супрацоўніцтва дзвюх краін у галіне адукацыі надаецца папулярызацыі, падтрымцы і пашырэнню магчымасцяў для вывучэння кітайскай мовы. У Беларусі функцыянуюць профільныя інстытуты Канфуцыя, пункты Канфуцыя, класы Канфуцыя і Цэнтры вывучэння кітайскай мовы пры беларускіх установах вышэйшай адукацыі.

— Несумненна, дасягнутыя поспехі пераконваюць нас у правільнасці абранага шляху, а таксама стымулююць да пошуку новых прарыўных формаў узаемадзеяння, якія дазваляюць вывесці яго на якасна новы ўзровень, — падагульніла Ірына Старавойтава.

Дарэчы, з новага навучальнага года на базе факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'явіцца кафедра комплекснага вывучэння развіцця КНР. Пра гэта на форуме заявіў рэктар БДУ Андрэй Кароль. Кафедра, на яго думку, будзе садзейнічаць умацаванню дзяржаўных адносін паміж Беларуссю і Кітаем.

— Гэта вельмі важны вектар, які сёння неабходны ўніверсітэту і ў цэлым розным плыням нашага грамадства, — сказаў рэктар.

Андрэй Кароль адзначыў таксама дынаміку супрацоўніцтва БДУ і КНР, вынікам якога сталі першы выпуск 78 дыпламаваных спецыялістаў сумеснага кітайска-беларускага інстытута, рост папулярнасці беларускай ВНУ сярод кітайскіх грамадзян. Сёння іх у БДУ каля трох тысяч чалавек, што складае 64 працэнты ад агульнай колькасці замежных студэнтаў універсітэта. Усяго БДУ ўзаемадзейнічае з кітайскімі ўніверсітэтамі і навуковымі інстытутамі ў межах 77 дагавораў. У ліку апошніх мемарандум, які рэгламентуе супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі з універсітэтам Цінхуа. Гэты ўніверсітэт з'яўляецца адным з вядучых у Кітаі, уваходзіць у склад дзевяці элітных кітайскіх ВНУ Лігі С9. Паводле рэйтынгу QS ён знаходзіцца на 15-м месцы ў табліцы лепшых універсітэтаў свету і пастаянна ўзначальвае нацыянальны рэйтынг кітайскіх універсітэтаў. Сярод яго выпускнікоў шмат вядомых навукоўцаў, дзеячаў мастацтва і палітыкаў. У іх ліку два апошніх старшыні КНР — Ху Цзіньтаа і Сі Цзіньпін.

Рэктар БДУ падзякаваў прадстаўнікам Пасольства КНР у Беларусі за падтрымку ініцыятыў, якія рэалізуюцца ў межах беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, і выказаў упэўненасць у далейшым пашырэнні і паглыбленні партнёрскіх адносін з Кітаем.

Між іншым, пасля таго як Беларуска-кітайскі форум дзелавога, навуковага, медыйнага і культурнага супрацоўніцтва завяршыў сваю працу, яго ўдзельнікі маглі сачыць, як у рэжыме відэасувязі праходзіў саміт КПК і палітычных партый свету з нагоды 100-годдзя Камуністычнай партыі Кітая. У саміце прыняў удзел Старшыня КНР Сі Цзіньпін, які выступіў з праграмнай прамовай.

Уладзімір **Хромаў**

# СУПРАЦОЎНІЦТВА З ПАТЭНЦЫЯЛАМ



БЕЛТА

Се Сяоюн

**Палітычны ўзаемадавер Беларусі і Кітая бесперапынна ўмацоўваецца. Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Се Сяоюн на міжнароднай анлайн-канферэнцыі "Беларусь і Кітай: агульная траекторыя развіцця".**

"У наступным годзе адбудзецца знамянальная падзея — 30-годдзе ўстанаўлення кітайска-беларускіх дыпламатычных адносін. За апошнія 30 гадоў, дзякуючы бесперапыннай працы двух бакоў і асабістаму клопату лідараў дзяржаў, падтрымліваецца стабільнае і здаровае развіццё ўзаемаадносін. Дзелавая супольнасць у розных сферах бесперапынна падымаецца на новую прыступку і прыносіць выдатныя вынікі на карысць народаў дзвюх краін", — адзначыў Се Сяоюн.

На думку Пасла, у цяперашні час развіццё беларуска-кітайскіх адносін характарызуецца адметнымі асаблівасцямі. "Па-першае, палітычны ўзаемадавер паміж двума бакамі бесперапынна ўмацоўваецца. Абедзве дзяржавы падтрымліваюць цесныя і частыя абмены на высокім і вышэйшым узроўнях, цесную каардынацыю ў міжнародных справах, а таксама цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго ў пытаннях, якія тычацца ключавых інтарэсаў дзвюх краін, — канстатаваў Се Сяоюн. — Па-другое, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва захоўвае добрую дынаміку развіцця. Нягледзячы на ўплыў пандэміі, аб'ём гандлю паміж Кітаем і Беларуссю летась паказаў значны рост, павялічыўшыся на 10 працэнтаў. Са студзеня па красавік гэтага года агульны аб'ём імпарту і экспарту тавараў паміж краінамі склаў $1,25 млрд, павялічыўшыся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 58 працэнтаў. Кітай стаў другім па велічыні гандлёвым партнёрам Беларусі. Бакі дасягнулі новых вынікаў у сумесным будаўніцтве ініцыятывы "Пояс і шлях", а Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк "Вялікі камень" стаў знакавым праектам гэтай ініцыятывы".

Кіраўнік дыпламатычнай місіі адзначыў, што гуманітарныя абмены таксама становяцца ўсё больш цеснымі. "Павялічваецца колькасць сумесных навукова-даследчых праектаў паміж дзвюма краінамі, якія прыносяць плённыя вынікі. У 2020 годзе ў Беларусі навучалася больш за 5 тысяч кітайскіх студэнтаў, а ў Кітаі — звыш 1 тысячы беларускіх. У Беларусі функцыянуюць заснаваныя Кітаем інстытуты Канфуцыя і Кітайскі культурны цэнтр у Мінску", — сказаў Се Сяоюн.



БЕЛТА

Анлайн-канферэнцыя "Беларусь і Кітай: агульная траекторыя развіцця"

Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва стала новым пунктам росту для развіцця двухбаковых адносін. Усе шэсць абласцей Беларусі і горад Мінск усталявалі пабрацімскія адносіны з правінцыямі і гарадамі Кітая. "Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва бесперапынна ўзбагачаецца новым зместам і адыгрывае больш важную ролю ва ўмацаванні і паглыбленні кітайска-беларускага супрацоўніцтва і традыцыйнай дружбы паміж двума народамі, — падкрэсліў дыпламат. — Акрамя таго, супрацоўніцтва ў перыяд пандэміі яшчэ больш умацавала сяброўства паміж двума народамі. Пасля пачатку ўспышкі COVID-19 Кітай і Беларусь прадастаўлялі адзін аднаму матэрыяльную дапамогу, абменьваліся вопытам у барацьбе з эпідэміяй. У студзені і маі ўрад Кітая бязвыплатна прадаставіў беларускаму боку партыі вакцын супраць каранавіруса".

На думку кіраўніка дыпламатычнай місіі, дасягнутыя ў розных сферах вынікі дэманструюць высокі ўзровень узаемадзеяння і асаблівасці ўзаемаадносін дзвюх краін, сведчаць аб глыбокай дружбе паміж Беларуссю і Кітаем.

"Кітайска-беларускае супрацоўніцтва мае вялікі патэнцыял і шырокія перспектывы развіцця. Перад краінамі стаіць агульная задача — абарона свайго суверэнітэту, бяспекі, а таксама міжнароднай справядлівасці. Неабходна пераўтварыць велізарныя палітычныя перавагі, дружалюбныя адносіны дзвюх дзяржаў у асаблівыя рухаючыя сілы для бесперапыннага пашырэння ўсебаковага абмену ў галіне адукацыі, навукі, тэхналогій, культуры, павялічваць абмен паміж "фабрыкамі думак" і моладдзю, а таксама бесперапынна ўмацоўваць паразуменне і сяброўства паміж народамі", — падкрэсліў кітайскі Пасол.

Аляксей **Фядосаў**

# ТАКІ ЗАПАМІНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬНЫ НАСТРОЙ

## УДЗЕЛЬНІКАЎ І ГАСЦЕЙ ЮБІЛЕЙНАГА, XXX МІЖНАРОДНАГА ФЕСТЫВАЛЮ МАСТАЦТВАЎ "СЛАВЯНСКІ БАЗАР" ГАСЦІННА СУСТРАКАЛІ Ў ВІЦЕБСКУ

Па традыцыі ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" прыняў удзел Прэзідэнт Беларусі. Звяртаючыся да шматлікай аўдыторыі Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, падкрэсліў:

— Мы, прысутныя тут, перш за ўсё беларусы, як і раней, з гэтай культурнай пляцоўкі заклікаем краіны і нацыі ўзводзіць масты, а не сцены. Свята захоўваць славянскае братэрства, умацоўваць сяброўства з усімі дзяржавамі свету.

Прэзідэнт нагадаў і пра тое, што калі на карце з'явіліся новыя славянскія і еўразійскія дзяржавы, калі ў гісторыі розных народаў пачалася новая эпоха, людзям, разгубленым і адарваным адзін ад аднаго, як ніколі патрэбна была надзея на захаванне духоўных і брацкіх сувязяў. Гэтую надзею, на думку Прэзідэнта Беларусі, падарыў фестываль у Віцебску. Ён даў усім упэўненасць у будучыні, падмурак якой быў закладзены савецкімі традыцыямі міжнацыянальнага свету. А для беларусаў, заўважыў Аляксандр Лукашэнка, фестываль стаў адным з сімвалаў незалежнай дзяржавы:

— З ім вырасла цэлае пакаленне нашых людзей. Нядзіўна, што фестываль укараніўся на зямлі, якую па праве можна лічыць калыскай беларускай самабытнасці. Віцебшчына, якая падарыла нам Шагала, Пэна, Азгура, Быкава і Фрадкіна, стала цэнтрам прыцягнення для творчых людзей у XXI стагоддзі. Сёння фестываль у Віцебску — гэта аўтарытэтны міжнародны конкурс менавіта прафесійнага вакальнага майстэрства. Падкрэслю: конкурс прафесійнага майстэрства, а не шоу-тэхналогій, створаных толькі для іміджа і жадання пацешыць чыёсьці самалюбства. Ён існуе



БЕЛТА

БЕЛТА



Рухія з Казахстана стала пераможцам конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2021"

БЕЛТА



Ірына Арсеніевіч з Сербіі заняла на конкурсе першае месца

ў імя людзей, дружбы і адзінства, таму што толькі ў адзінстве народаў ёсць сіла, якая пераадольвае любыя перашкоды.

Дарэчы, білет на фестываль дазваляе наведаць нашу краіну грамадзянам 74 дзяржаў без віз.

— Ну а сябрам Беларусі запрашэнне ніколі і не было патрэбна. Мы заўсёды рады гасцям, па-беларуску рады, і соты раз паўтараем: прыязджайце, паглядзіце на нашу краіну — нам ёсць чым ганарыцца і чым вас прыемна здзівіць! — адзначыў у выступленні Прэзідэнт.

Між іншым на фестывалі ў Віцебску кожны год робяць свае першыя творчыя крокі ўдзельнікі дзіцячага музычнага конкурсу.

— Гэта будучыня нашых краін, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Бо ў канчатковым выніку ўсё гэта адбываецца для таго, каб захаваць пераемнасць пакаленняў, асвятліць шлях творчай моладзі — паказаць лепшыя прыклады, але ў той жа час даць прастору для рэалізацыі новых ідэй і кірункаў. І мы верым, што наша моладзь напіша яшчэ шмат яркіх старонак у жыцці фестывалю, годна працягне пачатае намі. Хай у новым фармаце, хай нават на незразумелай нам мове, але з той жа светлай мэтай: "Праз мастацтва — да міру і паразумення!"

Фестываль вулічнага мастацтва, выставы, спектаклі, паказы і кірмашы народных майстроў — усё гэта акрамя галоўнага песеннага конкурсу адбывалася сёлета на 30 розных пляцоўках "Славянскага базару". Адным словам, ён жыве і развіваецца.

Між тым, да конкурснай і музычнай праграм тут па-ранейшаму ставяцца вельмі сур'ёзна. Як і вельмі адказна да таго, каб слова "міжнародны" ў назве форуму не было намінальным. І лічбы, вядома, уражваюць: за гэтыя гады на гасціннай віцебскай зямлі пабывалі артысты амаль з 80 (!) дзяржаў. І гэта, упэўнены ў дырэкцыі фестывалю, яшчэ не мяжа.

Сёлета ўпершыню на конкурс выканаўцаў эстраднай песні ў Віцебск прыехаў прадстаўнік Эквадора. Дакладней, прадстаўніца — 23 гадовая Іванна Ірэн Барэйра Гарсія, якая выходзіла на сцэну пад псеўданімам Ванна. У Віцебску, сказала артыстка, з першых хвілін адчула сябе як дома: сапраўднае лета! У тыя дні горад і сапраўды нагадваў распалены паўднёвы курорт, такога надвор'я на фестывалі не ўзгадвалі нават старажылы.

— З задавальненнем прыехала ў Віцебск, хоць пра Беларусь практычна нічога не ведала. Але цяпер буду ўсім распавядаць, як тут класна, музычна, прыгожа і ўтульна. Калі шчыра, то нават не чакала. Сябры, якім я дасылаю фота і відэа, цяпер таксама хочуць у Беларусь. Так што хутка я стану амбасадарам вашай краіны ў Эквадоры, — усміхалася Іванна.

А вось прадстаўніца Сербіі Ірына Арсеніевіч пра фэст не проста штосьці чула раней. Некалькі гадоў таму дзяўчына прымала ўдзел у дзіцячым конкурсе "Віцебск". Цяпер вярнулася, але ўжо на дарослы.

— Людзі ў Віцебску ўсе такія ж гасцінныя, а горад, мне здаецца, стаў яшчэ прыгажэйшым, — дзялілася ўражаннямі спявачка. — "Славянскі базар", дарэчы, вельмі папулярны ў балканскіх краінах, многія маладыя выканаўцы мараць прыехаць у Віцебск.

Журы конкурсу сёлета ўзначальваў народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік ансамбля "Сябры" Анатоль Ярмоленка. Кампанію яму склалі італьянскі спявак і кампазітар

БЕЛТА



Уладальнік Гран-пры дзіцячага конкурсу "Віцебск-2021" Комнен Вуковіч

БЕЛТА



Анастасія (Грузія)

БЕЛТА



Марыя Лаура (Італія)

БЕЛТА



Канстанцін Мазуркевіч (Беларусь)

БЕЛТА



Элізабэт Захарыева (Балгарыя)

Мікеле Пома, народны артыст Малдовы Канстанцін Масковіч, украінская эстрадная спявачка Таісія Павалій, расійскі спявак Сяргей Пенкін, саліст французскай групы Ottawan Патрык Жан Батыст і зорка з Казахстана Дзімаш Кудайберген. Дзімаш прызнаваўся:

— "Славянскі базар" — тая пляцоўка, дзе сціраюцца межы паміж краінамі і ўсе людзі пачынаюць размаўляць на адной мове — мове музыкі.

Нездарма падчас круглага стала "Славянскі базар" — 30 гадоў. Поспехі і перспектывы" міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў заявіў, што Міжнародны фестываль стаў эталонай творчай пляцоўкай для артыстаў і гледачоў многіх краін.

— За гэты час з'яўлялася і знікала столькі фестываляў і мерапрыемстваў! І многія з іх не параўнаюцца з форумам мастацтваў, што праходзіць у Віцебску і запатрабаваны артыстамі, якія з задавальненнем удзельнічаюць у ім. Ёсць нават нейкая канкурэнцыя і суперніцтва: хто трапіў на фестываль, хто не трапіў, хто як выступіў.

Быў на фестывалі і Дзень Саюзнай дзяржавы. Акрамя вялікага канцэрта майстроў мастацтваў Беларусі і Расіі ў Летнім амфітэатры, у Мастацкім музеі прайшлі выставы "Залатая хахлама — душа Расіі" і "Таржокскае залатое шыццё", а на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа прайшла прэзентацыя праекта, прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння Сяргея Ясеніна. І гэта толькі частка мерапрыемстваў, што чакалі фестывальную публіку ў гэты дзень.

Так, цяперашні юбілейны "Славянскі базар у Віцебску" быў шмат у чым асаблівым. Нават традыцыйныя мерапрыемствы ў гэтым годзе праходзілі ў незвычайным фармаце. Узяць для прыкладу фэст вулічнага мастацтва "На сямі вятрах". Звыклыя спектаклі замяніліся вулічнымі перформансамі, а большасць мерапрыемстваў набыло перасоўны фармат. Сотні музыкантаў, мастакоў, акцёраў, танцораў, перформераў, якія выступалі ў розных кутках горада, стваралі ў фестывальным Віцебску сапраўды карнавальную атмасферу. Для аматараў актыўнага адпачынку былі прадугледжаны спартыўныя спаборніцтвы і тэматычныя экскурсіі. Гасцям прапаноўваліся як займальныя падарожжы па горадзе, у тым ліку на цеплаходзе, так і турмаршруты па знакавых месцах бліжэйшых раёнаў і гарадоў. Ахвочым гатовыя былі паказаць славутасці Полацка, Оршы, музей-сядзібу Ільі Рэпіна "Здраўнева".

І ўсё ж, галоўнае месца на "Славянскім базары ў Віцебску" па традыцыі займалі музычныя праекты. Самыя доўгачаканыя падзеі — XXX Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2021" і XIX Міжнародны дзіцячы музычны конкурс "Віцебск-2021". Увогуле ў фестывальныя дні ў Віцебску немагчыма было засумаваць. Кожны мог знайсці сабе тут прастору па душы. Неверагодную атмасферу свята можна было адчуць праз экраны тэлевізараў і камп'ютараў. Канцэртныя і конкурсныя праграмы паказвалі ў жывым эфіры тэлеканалы. Акрамя таго, сёлета арганізатары "Славянскага базару ў Віцебску" дамовіліся аб трансляцыі асноўных падзей фестывалю з найбуйнейшым стрымінгавым сэрвісам OK LIVE.

Дарэчы, каля галоўнай канцэртнай пляцоўкі фестывалю як заўсёды было найбольш ажыўлена. Моладзь палявала за аўтографамі любімых артыстаў. Сустрэць іх тут, асабліва

калі ідуць рэпетыцыі, перад канцэртам або падчас яго, было нескладана. Некаторыя фанаты, даведаўшыся, дзе жыве любімы артыст, наўпрост накіроўваліся туды. Да прыкладу, у гасцініцу "Эрыдан". Цікава, ці цяжка персаналу выконваць усе патрабаванні зорак?

— Хоць артысты яны і вядомыя, але вельмі простыя прыемныя людзі, непераборлівыя. Галоўнае патрабаванне — нумар катэгорыі люкс. Як і ўсе, хочуць адпачыць, пабыць у цішыні. Як усе, выходзяць гуляць у горад, але, напэўна, каб іх менш заўважалі, апранаюць сонцаахоўныя акуляры, касыначкі. Супрацоўнікі гатэля разумеюць, што людзі стамляюцца ад пастаяннай увагі, таму стараемся лішні раз іх не трывожыць, — распавяла адміністратар гасцініцы Алена Косікава.

Дарэчы, у гасцініцы таксама можна было набыць на памяць аб фестывалі ў Віцебску эксклюзіўныя сувеніры ручной працы, якія мастакі і рамеснікі звычайна прадаюць толькі на "Славянскім базары", а тут яны ёсць цэлы год.

Так, віцебскі фестываль адчуваўся ўсе гэтыя дні не толькі ля галоўнай пляцоўцы форуму — летняга амфітэатра. Атмасфера свята запоўніла ўсе вуліцы і плошчы горада. У гэтыя дні тут лёгка можна было сустрэць эстрадную зорку ў сувенірнай краме, паспрабаваць эксклюзіўны дэсерт у кафэ, прыгатаваны спецыяльна да фестывалю, паўдзельнічаць у незвычайным шоу. Адным словам, прыемныя эмоцыі былі гарантаваныя. Вочы разбягаліся ад разнастайнасці дызайнерскага адзення, розных аксесуараў. На вуліцы Талстога, напрыклад, нельга было прайсці міма аўтарскіх сумачак і ўпрыгожванняў з натуральнай скуры, створаных Ірынай Данілавай з Вялікага Ноўгарада, якая ўпершыню прыехала на "Славянскі базар":

— Да пандэміі і ў нас у горадзе праходзіла шмат мерапрыемстваў, у тым ліку міжнародных, а цяпер іх няма. У Беларусь на фестываль я збіралася даўно: паглядзець вырабы іншых майстроў і свае працы паказаць. Калі іх раблю, хочацца, каб жанчына, выходзячы ў свет, адчувала сябе каралевай. Папулярызацыя народных традыцый — нязменны элемент фестывалю. Пра багацце на вуліцах горада карцін, прапанаваных мастакамі і казаць не даводзіцца: тут і пейзажы, і партрэты, і нацюрморты на любы густ. Нямала на прылаўках усялякіх стыльных штучак для дэкору дома ці офіса. У адной з палатак ўвагу прыцягвалі крэатыўныя вырабы са звычайных, але, падобна, расплаўленых бутэлек: гадзіннікі, падносы. Іх прывёз за паўтары тысячы кіламетраў з Самары Грант Пагосаў. Ён працуе па экалагічнай праграме "Ачысціць планету ад бутэлек" і таксама ўпершыню быў у Віцебску па запрашэнні арганізатараў фестывалю.

Ну а калі ж хтосьці стамляўся хадзіць па фестывальнаму гораду, заўсёды была магчымасць прысесці і паслухаць вулічных музыкаў — навучэнцаў музычных школ, каледжаў, часам прафесіяналаў. То тут, то там сустракаліся жывыя скульптуры, паказальныя выступленні студыі танцаў. Бліжэй да амфітэатра каларытныя бабулькі, не выпускаючы момант, прапаноўвалі кветкі: раптам вы сабраліся на канцэрт, а пра букет для артыста забыліся. А менавіта ж яны, любімыя артысты, перш за ўсё дарылі ў гэтыя ліпеньскія дні добры настрой гледачам. Усім, каго не мог пакінуць абыякавым юбілейны, XXX Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Уладзіслаў **Ерамееў**



БЕЛТА

Ваенга



БЕЛТА

Анатолій Ярмаленка



БЕЛТА

Наталья Гардзіенка




БЕЛТА

Дзімаш Кудайберген

БЕЛТА




# ДЗЕЛІМСЯ РАДАСЦЮ, ДАБРЫНЁЙ

**Гісторыя найстаражытнага народнага свята Купалле ў сучасным фармаце пачалася з 2010 года: гэта цяпер маштабны фэст у Александрыі, у Шклоўскім раёне Магілёўшчыны, на маляўнічым беразе Дняпра. І ўжо ў 2012-м александрыйскае Купалле набыло міжнародны статус, стаўшы адным з цэнтраў прыцягнення для шматлікіх турыстаў. Папулярнасць фэсту год ад года расце, павялічваецца колькасць яго ўдзельнікаў і гасцей, пашыраецца іх геаграфія.**

Па традыцыі і на гэты раз Купалле ("Александрыя збірае сяброў") наведаў Прэзідэнт Беларусі. Выступаючы, Аляксандр Лукашэнка сказаў:

— Сёння мы зноў сабраліся тут, у адным з самых маляўнічых куткоў Беларусі. Сабраліся разам, каб зберагчы настрой найстаражытнага народнага свята, якое заўсёды было нашым нацыянальным здабыткам... У ноч на Купалле, дзе б мы ні жылі — у маленькай вёсцы ці вялікім горадзе, мы імкнемся туды, дзе гараць Купальскія вогнішчы, а рэкі, азёры ўпрыгожваюць вянкі з лугавых траў і кветак, гучаць любімыя мелодыі і песні. Мы імкнемся туды: да сваіх вытокаў. Туды, дзе ўсё пачыналася. Таму што ў сэрцы кожнага прачынаецца невытлумачальнае жаданне стаць бліжэй да прыроды: удыхнуць водары лесу, сагрэцца ля агню і ўбачыць самае галоўнае: чыстае начное неба.

Паводле слоў Прэзідэнта, важна тое, што гэтае свята ў Александрыі дорыць не толькі радасць сустрэчы з роднымі, блізкімі і сябрамі, але на імгненне вяртае нас у глыбіню стагоддзяў, дае магчымасць дакрануцца да старажытных ведаў, досведу ўсіх пакаленняў і чалавецтва ў цэлым, нагадвае людзям пра тое, што яны — дзеці роднай зямлі.

Прамова Аляксандра Лукашэнкі поўнілася пранікнёнасцю і ўзвышанасцю:

— Традыцыі, якія пакінулі нам гэтыя слаўныя, мудрыя і моцныя людзі тысячу гадоў таму, фактычна сталі часткай нашай культуры, леглі ў аснову сучаснага ладу жыцця. У іх ёсць усё, што сёння паядноўвае нас, беларусаў, як народ. Гэта сакральныя веды аб прыродных стыхіях, гаючых травах і абярэгах. Веды, якія вучаць любіць прыроду, шанаваць яе дары і берагчы прыгажосць. Гэта сувязь язычніцкіх абрадаў і хрысціянскіх сімвалаў, якая стала асновай верацярпімасці і талерантнасці. Гэта вытокі нашай аддачнасці традыцыйным каштоўнасцям, галоўныя з якіх — сям'я, клопат пра дзяцей, павага да старэйшых пакаленняў. Вось адкуль наш характар, нашы звычаі, нашы традыцыі — адтуль, з глыбінь тысячагоддзяў.

Аляксандр Лукашэнка таксама заначыў, што імкненне беларусаў да незалежнасці таксама ў даўніне мае свае карані:

— Мы ведаем, што імкненне беларусаў да незалежнасці тлумачыцца непакорнасцю і свабодалюбствам нашых продкаў, якія ніколі не былі ні рабамі, ні гаспадарамі рабоў. І ніколі ў гісторыі яны не былі агрэсарамі, але заўсёды імкнуліся зберагчы мір і згоду з бліжэйшымі суседзямі. Таму адзінства народа Беларусі ў яго этнічнай, культурнай і

канфесійнай разнастайнасці непарушнае. Мы і сёння імкнемся прытрымлівацца тых традыцый. Адсюль уся наша палітыка. Мы не прэтэндуем на чужыя землі. Мы не хочам дапякаць нашым суседзям і далёкім народам. Мы хочам жыць у міры і згодзе з усімі, — падкрэсліў Прэзідэнт.

— Мы — народ. Народ, які ўпершыню за сотні гадоў пабудаваў сваю незалежную і суверэнную дзяржаву, якая заўсёды вылучаецца сярод іншых сваім характарам, сваімі норавамі, традыцыямі. Мы — беларусы, якім уласцівыя ўсе нацыянальныя рысы як народа. Яны адтуль — з глыбіняў. Гэта не я іх прыдумаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. І адзначыў, што рэспубліканскае свята не выпадкова называюць "Александрыя збірае сяброў":

— Гэта таксама спрадвечная традыцыя: дзяліцца радасцю з тымі, хто прыходзіць у наш дом дзяліцца святлом і дабрынёй. І мы, беларусы, заўсёды гатовыя прыняць у сваю вялікую сям'ю ўсіх, каму блізкія нашыя каштоўнасці, лад жыцця, наша гістарычная памяць.

Прэзідэнт адзначыў, што на свяце выступалі прадстаўнікі розных краін, і ўсе гэтыя гады яны дарылі ўдзельнікам і гасцям Купалля часцінку сваёй культуры.

— Гісторыя Купальскай ночы ў Александрыі не перарывалася, нягледзячы на пандэмію і знешнія палітычныя рознагалоссі. Так будзе заўсёды. Не стаў выключэннем і гэты год. Таму што зберагальнікі гэтай традыцыі мы — народ, які выбірае свой лёс і жыццёвы шлях сваім сэрцам.

Аляксандр Лукашэнка шчыра падзякаваў усім, хто стварае гэтае свята, а таксама артыстам, музыкантам, якія ўпрыгожваюць Купальскі вечар талентамі, творчасцю. Таксама, завяршаючы выступленне, Прэзідэнт пажадаў усім прысутным:

***"Гэта спрадвечная традыцыя: дзяліцца радасцю з тымі, хто прыходзіць у наш дом дзяліцца святлом і дабрынёй. І мы, беларусы, заўсёды гатовыя прыняць у сваю вялікую сям'ю ўсіх, каму блізкія нашыя каштоўнасці, лад жыцця, наша гістарычная памяць."***

Аляксандр Лукашэнка

— Няхай атмасфера любові, дружбы і згоды, якая пануе тут, падорыць усім нам, як магічную папараць-кветку, веру ва ўласныя сілы, натхніць на новыя здзяйсненні ў імя мірнай і шчаслівай будучыні роднай Беларусі.

Нягледзячы на тое, што самыя важныя падзеі Купалля — пусканне вянкоў па вадзе і пошукі папараць-кветкі — пачаліся бліжэй да поўначы, Александрыя пачала шумець-весяліцца з самага ранку. Увесь аграгарадок быў, як вялікі кірмаш, абавязкова з канцэртам (сёлета яшчэ і з тэатрам), куды прыехалі артысты і народныя ўмельцы як мінімум з трох краін — Беларусі, Расіі ды Украіны. Тысячы гасцей: сталыя ўдзельнікі, турысты і VIP-персоны. Свята ў Александрыі — гэта прыцягальная і зразумелая на любой мове традыцыя новай Беларусі.

Больш за кіламетр гандлёвых радоў, шмат музыкі, розных інтэрактыўных пляцовак для гасцей розных узростаў — аграгарадок Александрыя ў Шклоўскім раёне акунуўся ў атмасферу вялікага свята.

Галоўная тэма Купалля ў Александрыі — ручнік як сімвал народнага адзінства. Майстрыхі Магілёўскай вобласці прадставілі амаль 200 ручнікоў — усе яны вытканыя ці вышытыя ўручную. А ручнікі, як вядома, гэта вельмі шматзначная і сімвалічная рэч у беларускай культуры. На трох шэрагах-вуліцах, якія прадстаўлялі Мінск і вобласці Беларусі, размяшчаліся экспазіцыі з прэзентацыяй старадаўніх і рэканструяваных ручнікоў. На працягу дня тут ішлі віктарыны, конкурсы, тэатралізаваныя прадстаўленні з удзелам творчых груп, выступленні самадзейных калектываў. І ва ўсіх гасцей свята была магчымасць пазнаёміцца з ткацкім мастацтвам і ўнікальнай культурнай спадчынай — ткачыхі на аўтэнтычных кроснах XVIII-XIX стагоддзяў праводзілі майстар-класы па вырабе ручнікоў з узорамі, з вышыўкай. Таксама гледачы ўбачылі працу майстрых Сенненскага раёна — ручнік-абярэг, арнамент якога

БЕЛТА




БЕЛТА



Галоўнай тэмай свята быў ручнік як сімвал народнага адзінства

быў пакладзены ў аснову дзяржаўнай сімволікі нашай краіны. Яшчэ арганізатары здзівілі публіку аўтэнтычным Купальскім ручніком родам з Чавускай зямлі. Яго ўзрост — больш за 150 гадоў. А яшчэ, што цікава, у часе творчай прэзентацыі ручнікоў на пляцоўцы каля сцэны былі ўстаноўлены два ткацкія станкі. Беларускія майстрыхі ў рэжыме рэальнага часу выткалі сапраўдны ручнік народнага адзінства.

Александрыя — выдатнае свята яднання людзей. Пра тое казала і ткачыха Таццяна Кавалёва з Хоцімскага раёна, калі ў поўную моц працавалі тэматычныя падворкі.

Дарэчы, у намёце "Белпошты" кожны ахвочы мог адправіць тэматычную паштоўку ў любы пункт нашай краіны прама са свята: унікальная паслуга была бясплатнай.

Гандлёвыя рады на Купальскім полі працягнуліся амаль на паўтара кіламетра! Тут размяшчаліся пункты грамадскага харчавання, тэматычныя інсталяцыі, ладзіліся цэлыя прадстаўленні ад вядучых прадпрыемстваў краіны. Сёлета госці Купалля ў Александрыі па акцыйных цэнах змаглі набыць смачныя прадукты, кандытарскія і хлебабулачныя вырабы — кожны мог знайсці нешта на свой густ.

Яркім пунктам на святочнай карце традыцыйна сталі гандлёвыя рады народных умельцаў і майстроў — ад асартыменту прадстаўленых вырабаў разбягаліся вочы. Тут былі ўпрыгажэнні, адзенне ручной работы, прадметы побыту і вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Удзельнікамі выставы-кірмашу сталі больш за 800 майстроў. Сёлета ў Александрыю прыехалі ўмельцы нават з Камчаткі! Свае работы прадставілі рамеснікі з Дагестана, Чарнігаўскай ды Івана-Франкоўскай абласцей Украіны. Акрамя таго, яны паказалі на свяце і свае традыцыйныя ручнікі.

— Сённе ў Александрыі сабраліся чацвёра прадстаўнікоў народнасцяў Камчаткі. І ўсе прывезлі свае традыцыйныя вырабы: упрыгажэнні з костак жывёл, у тым ліку бранзалеты з рыбіных хрыбтоў, футравыя вырабы, традыцыйныя касцюмы народаў Поўначы, вырабы з рыбінай скуры. З лускі дзікага ласося нават пашылі касцюм. Асаблівасць нашых вырабаў — гэта ўсе прыродныя матэрыялы. Наш край вельмі чысты, у нас няма буйных заводаў. Таму і наваколле захавалася практычна ў першапачатковым стане. Прывезлі з сабой і гарбату з традыцыйных траваў, — распавёў прадстаўнік Камчацкай дэлегацыі Андрэй Адуканаў. — Мы ўпершыню прыехалі ў Беларусь, на свята ў Александрыі. Дабіраліся, вядома ж, доўга. Аўтобусы, снегаходы, сабачыя запрэжкі, цягнікі — мы змянілі шмат відаў транспарту. Свята яшчэ толькі пачалося, але людзі актыўна падыходзяць паглядзець, нешта спытаць, даведацца пра тое-сёе. Пазнаёміліся мы і з працамі калег — у беларусаў вельмі цікавая і шматгранная культура. Нават купілі сабе нешта на памяць. Цудоўна, што ёсць такія святы, што ў нас ёсць магчымасць паказаць сваю культуру і пазнаёміцца з традыцыямі беларусаў, украінцаў.

Яшчэ адна прадстаўніца дэлегацыі з Камчаткі, Лідзія Кручыніна, распавяла, што набыла сабе некалькі беларускіх сувеніраў:

— Мы збіраем свой музей з прадметаў тых месцаў, якія наведваем. Выдатна, што на беларускай зямлі ёсць такое свята. Яно на самай справе паядноўвае людзей. І хоць у нас такія непадобныя культуры, але мы ўсё роўна застаемся брацкімі народамі. Вельмі тут прыязная абстаноўка, добры настрой.

Прадстаўлена была ў Александрыі і культура Дагестана: можна было ўбачыць пры Дняпры дываны ручной працы, вырабы з дрэва ва ўнікальнай тэхніцы — унцукульскае арнаментальнае насяканне па дрэве. Працы ў гэтай тэхніцы прывёз майстар у трэцім пакаленні Магамедалі Магамедаліеў з Дагестана. Вось што ён сказаў:

— Мы ўжо трэці раз становімся ўдзельнікамі свята ў Александрыі. За гэты час у нас з'явіліся тут прыхільнікі. Унцукульскае арнаментальнае насяканне па дрэве — гэта складаны від прыкладнога мастацтва. Я шмат езджу па свеце, але яшчэ нідзе не сустракаў такіх жа прац. Мне вельмі падабаецца фестываль, з кожным годам ён становіцца ўсё лепшым. Гэта і выдатная



БЕЛТА

Купалле — гэта паўсюдны святочны настрой






Самых розных майстроў сустрэнеш на фэсце




магчымасць пагутарыць са старымі сябрамі, сустрэць новых. Сёлета пасля Купалля ўпершыню паедзем у Віцебск на "Славянскі базар". Такія святы — выдатная магчымасць паглядзець зблізку на іншую культуру.

Разнастайную і насычаную праграму падрыхтавалі арганізатары і для гасцей маладзёжнай пляцоўкі. Асвоіць сучасныя тэхналогіі па кіраванні робатамі, паспрабаваць сябе ў якасці блогераў, прымерыць салдацкую форму часоў Першай і Другой сусветных войнаў — усё гэта было магчыма.

Для аматараў літаратуры беларускія пісьменнікі старэйшага і малодшага пакалення прадставілі аўтарскія кніжныя навінкі.

І для самых маленькіх гасцей рэспубліканскага свята было шмат усялякіх забавак. Традыцыйна праводзілася "Свята цырка". З новых пляцовак — паказ спектакля і перформанс ад Магілёўскага абласнога тэатра лялек.

— Мы ўсе вельмі чакаем Купалле ў нашым аграгарадку. Хоць і не першы год яно праходзіць, але заўсёды шмат усяго новага і цікавага. Атмасфера свята падабаецца і дзецям, і дарослым. Да нас прыязджае шмат гасцей — сваякоў і знаёмых. Едуць з Мінска і Мінскай вобласці, Гродна, Брэста — хочуць паўдзельнічаць у свяце. Некаторыя назапашваюць адгулы, хтосьці спецыяльна бярэ адпачынак на гэты час. Таму што свята застаецца актуальным, — гаварыла жыхарка Александрыі Ляна Саковіч. — Назваць нейкую адну пляцоўку, якая найбольш падабаецца, складана. Радуюць і разнастайныя гандлёвыя шэрагі, дзе можна знайсці прадукцыю з усёй Беларусі. Заўсёды шмат станоўчых уражанняў пасля гала-канцэрта, шмат інтэрактыву для моладзі, пляцовак для дзяцей: яны таксама вельмі любяць і кожны год з нецярпеннем чакаюць Купалле. У жыцці аграгарадка гэта вельмі важная падзея.

Сваімі меркаваннямі пра тое, як развіваецца Купалле ў Александрыі, падзяліўся з журналістамі намеснік Прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка:

— Штогод свята ў Александрыі дадае новыя творчыя формы і фарматы. І гэты год не стаў выключэннем. Асноўная тэма свята — ручнік. Гэта той пачатак, які спалучае многае ў адным, ідзе да нас з глыбінь стагоддзяў, і перадаецца нам ад продкаў іх энергетыка, якая ўвасабляецца ў культуры стварэння гэтых ручнікоў. Сёння мы ўбачылі, наколькі наша краіна багатая на таленавітых народных майстроў, якія не толькі зберагаюць традыцыі, але і перадаюць іх далей, сваім вучням. Яны перадаюць моладзі не толькі свой досвед, але і ўсё тое, чаму іх навучылі мамы, бабулі, прабабулі. Я маю надзею, што гэтая дзівосная беларуская традыцыя будзе мець працяг. Бо нельга спыніць тое, што належыць усёй нацыі.

На Купаллі ў Александрыі пануе дух далучанасці да адзінай народнай сям'і. Такім меркаваннем з журналістамі падзяліўся Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў:

— Мы ўсе любім гэтае свята. На ім ёсць асаблівы дух і атмасфера пачуцця прыналежнасці, адзінай народнай сям'і. Я ўжо трэці раз прыязджаю сюды. І бачу, што не зменьваецца з гадамі арыентаванасць людзей на сваю малую радзіму. Толькі завяршылася Трохгоддзе малой радзімы, цяпер ідзе Год народнага адзінства, і ён адметны для беларусаў. Для нас вельмі важныя такія зносіны: па-за кабінетамі, паперамі, тэлефоннымі званкамі, калі глядзіш адзін аднаму ў вочы. Мы больш разумеем душы беларусаў і расіян.

Як вядома, для гасцей і жыхароў Александрыі прайшоў незвычайны гала-канцэрт. Асноўная фішка: яго рэпертуар складалі па заяўках жыхароў аграгарадка Александрыя. У аснове фінальнага шоу ярка выявілася ідэя духоўнага адзінства. Нібы сабраліся за адным сталом сябры ды пагаварылі пра важныя для нас каштоўнасці: сям'я, духоўнасць.

Канцэрт доўжыўся больш за дзве гадзіны. Пасля жыхары Александрыі, яе госці змаглі ўбачыць прыгожы феерверк над Дняпром. Фінальным акордам свята стала дыскатэка пад адкрытым небам.

Міхаліна **Чаркашына.**

З выкарыстаннем матэрыялаў БелТА.

# АДПАЧЫНАК ЯК ПАДАРОЖЖА АД ЧАЛАВЕКА ДА ЧАЛАВЕКА

**Аграэкатурызм, безумоўна, — адзін з сучасных відаў адпачынку. Хоць і з'явіўся на хвалі несумненнай цікавасці да экалагічнай разнастайнасці навакольнага асяроддзя і настальгічнага ўспрымання жыцця ў сельскай мясцовасці. Нельга сказаць, што аграэкатурызм імкліва здабыў мноства сваіх прыхільнікаў па ўсім свеце. Але ёсць рэгіёны, дзе ён, сапраўды, стаў вельмі папулярным. Перш за ўсё, дзякуючы энтузіястам гэтага турыстычнага кірунку, якія своечасова адчулі вострую яго запатрабаванасць. У Беларусі ля вытокаў аграэкатурызму было грамадскае аб'яднанне "Адпачынак у вёсцы". А значыць, цалкам абгрунтаванай з'яўляецца наша размова на гэтую тэму са старшынёй праўлення аб'яднання Валерыяй Кліцуновай.**



Валерыя Кліцунова на выставе ў Бергама

***— Аграэкатурызм заявіў аб сабе ў Беларусі ўсё ж такі параўнальна не вельмі даўно. Цікава, ці можна казаць, што ён, пры ўсім пры тым, здолеў заняць сваю нішу ў досыць сфарміраванай турыстычнай галіне?***

— Гісторыя аграэкатурызму ў Беларусі бярэ свой пачатак у 2002 годзе, калі была створана грамадская арганізацыя па яго развіцці і энтузіясты гэтага руху зрабілі першыя крокі, стаўшы на зусім новую для сябе сцежку. Цяпер Беларускае грамадскае аб'яднанне "Адпачынак у вёсцы" — добра вядомае, аб нашым аграэкатурызме кажуць як у Беларусі, так і за яе межамі. Гэты від турызму, без перабольшання, становіцца брэндам краіны.

Паводле апошніх звестак, цяпер у нас налічваецца каля трох тысяч сядзіб, якія вельмі запатрабаваныя. Адпачынак у іх — ужо не дзіва або даніна модзе, а жаданне разам з усім рэальна адчуць звыклы складнік ладу жыцця беларусаў. Абставіны апошніх двух гадоў моцна перафарматавалі турызм. Адпачынак, звязаны з перасячэннем межаў, значна паменшыўся ў сувязі з COVID. Як вынік, увага, у тым ліку нашых суайчыннікаў, зрушылася ў бок роднага краю. Патрабаванні да сацыяльнай дыстанцыі, самаізаляцыя ды іншыя меры засцярогі змянілі характар вольнага часу. Многія літаральна ўпершыню адкрылі для сябе адпачынак у сядзібах. І тут нам ёсць што прапанаваць.

***— Ці можна вылучыць нейкі пэўны рэгіён краіны, дзе агратурызм атрымаў найбольшае развіццё? Калі так, то што гэтаму спрыяла? Чаму менавіта так адбылося? Альбо агратурызм адразу стаў аднолькава папулярным ва ўсіх абласцях Беларусі?***

— Калі паглядзець на карту нашай краіны, то стане відавочна, што размяшчаюцца аграсядзібы нераўнамерна. Гэтая тэндэнцыя назіраецца і ў іншых краінах. Там, дзе ёсць адпаведныя перадумовы — сядзіб значна больш. Па іх колькасці ў нас лідзіруе Мінская вобласць (972 сядзібы). Гэта і зразумела, Мінск — велізарны мегаполіс і людзям трэба недзе адпачываць, нават кароткачасова. Наступная вобласць-лідэр — Віцебская (670 сядзіб). Гэта наш азёрны край і адпачынак (больш працяглы) там вельмі запатрабаваны.

Ну і вядома ёсць тэрыторыі паменей, свайго роду "агратурыстычныя курорты" — Браслаўскія азёры, возера Нарач, Глыбоцкі раён, Белавежская пушча... Гэта месцы высокай рэкрэацыйнай каштоўнасці з вельмі вялікай канцэнтрацыяй сядзіб.

Узнікаюць і новыя перспектыўныя для агратурызму рэгіёны — Кобрынскі, Бярозаўскі, Іванаўскі, Мiёрскі, Ваўкавыскі раёны. Думаю, хутка пра іх мы пачуем.

***— Што сёння найбольш запатрабавана ў беларускіх аграсядзібах? Чым яны прывабныя для турыстаў, якія жадаюць адпачыць у вёсцы?***

— У нашай краіне за амаль дваццаць гадоў фактычна з'явілася новая індустрыя і сфера эканомікі — аграэкатурызм. Са сваімі прафесіяналамі, дастаткова добрым сэрвісам, аўтэнтычнасцю, экалагічнасцю і, што асабліва важна, крэатыўнасцю. Мы жывем ужо не ў эпоху інфармацыйных тэхналогій, а ў эпоху эканомікі ўражанняў. Менавіта яны, уражанні, становяцца самым запатрабаваным таварам. Інакш кажучы, яркія прапановы беларускіх вёсак сёння у трэндзе. Цікава, калі ёсць магчымасць пячы хлеб, прайсціся па балотнай сцежцы, зрабіць самім "прыродную" касметыку, атрымаць асалоду ад усходу сонца і спеваў птушак, паспрабаваць ежу з печы, навучыцца спяваць беларускія песні і танцаваць нашы танцы, пачуць унікальныя і кранальныя гісторыі мясцовых жыхароў, пакатацца на лодцы, на веласіпедах ці на конях. Спіс можна працягваць да бясконцасці.

Так, цяпер ужо можна з упэўненасцю казаць, што аграэкатурызм не проста заняў сваю нішу, але стаў лідарам рынку па прывабнасці і запатрабаванасці сваіх паслуг і, сапраўды, вядомым брэндам нашай краіны. І таму ёсць шмат доказаў. У 2016 і 2018 гадах Беларусь, напрыклад, стала краінай агратурызму па выніках прэстыжнага конкурсу National Geographic "Traveler Awards, Russia". А Сусветная турысцкая арганізацыя (UNWTO) плануе правесці наступнай вясной форум па сельскім турызме менавіта ў Беларусі.

Сёння прапановы аграсядзіб вельмі разнастайныя па набору паслуг і па ўзроўню сэрвісу. Мне здаецца, цяпер у

нас можна знайсці ўсё: ад выдатнай інфраструктуры для святаў, вяселляў і семінараў да адасобленых экалагічных дамоў ва ўнікальных месцах для энергетычнага аднаўлення і перазагрузкі.

Ёсць прапановы для самых розных сегментаў. Гэта, напрыклад, сямейны адпачынак. Ці актыўны адпачынак для вялікіх і малых груп. Дзіцячыя лагеры, адукацыйныя праграмы, майстар-класы, звязаныя з засваеннем новага рамяства — ганчарства, валяння з воўны, кавальскай справы, вырабу сыроў, прыгатавання травяной гарбаты. Адным словам, нашы аграсядзібы гатовыя задаволіць самых патрабавальных турыстаў і зрабіць іх адпачынак цікавым, разнастайным і змястоўным. Ну а калі хто-небудзь пажадае проста цішыні і спакою — гэта таксама магчыма.

***— Вы ўжо доўгі час узначальваеце Беларускае грамадскае аб'яднанне "Адпачынак у вёсцы". На якога роду дапамогу з боку аб'яднання могуць разлічваць тыя, хто хоча развіваць сельскі турызм?***

— Наша арганізацыя аказвае вялікую падтрымку руху аграэкатурызму. Мы імкнемся абараняць і адстойваць інтарэсы людзей, занятых яго развіццём, на заканадаўчым узроўні. Дарэчы, умовы для вядзення гэтага бізнесу ў нас вельмі ліберальныя.

Мы праводзім шмат навучальных праграм, трэнінгаў, семінараў і вэбінараў. У нас ёсць свой youtube-канал з вялікай адукацыйнай "фільматэкай" уласнай вытворчасці. Мы кансультуем тых, хто пачынае справу ў гэтай сферы, звязваем іх са спецыялістамі, экспертамі. Распрацоўваем розныя праекты, знаходзім фінансаванне і рэалізуем іх. Што асабліва важна, аб'ядноўваем людзей у адну каманду, практычна сям'ю. Разам мы — сіла!

Заўсёды імкнуліся мець свой твар, канкурэнтную перавагу. У якасці слогана мы першапачаткова ўзялі словы вядомага беларускага літаратара Уладзіміра Караткевіча "Гэта край раскрытых душ і дзвярэй!". Я думаю, што менавіта "душэўнасць" — наша галоўная якасць. Літаральна ўсе гаспадары аграсядзіб імкнуцца яе засведчыць. Хоць яны і вельмі розныя — па ўзросце, інтарэсах, характарах.

***— Усё ж, на што могуць разлічваць турысты, якія прыедуць адпачыць у беларускую аграсядзібу? Як тут сустракаюць гасцей?***

— Абсалютна ўпэўненая, што турысты з самымі рознымі патрэбамі, якія прыязджаюць у Беларусь, заўсёды знойдуць тут "сваю" сядзібу, дзе ім будзе вельмі ўтульна. Ну а яе гаспадары, як сапраўдныя мінітурапераатары, абавязкова забяспечаць ім цікавую і разнастайную праграму. Калі сам турыст гэтага, вядома, пажадае. Ёсць і іншы варыянт — пакінуць турыстаў у спакоі, прапанаваўшы ім прытулак і мінімальнае харчаванне. А гаспадарыць і адпачываць яны будуць самастойна. Гэта, калі людзі стаміліся ад мітусні і прыехалі на пэўны час за спакоем.

Адным словам, магчымы самыя розныя формы адпачынку ў вёсцы. Практычна ўся інфармацыя ёсць у інтэрнэце і па запыце можна атрымаць шмат прапаноў. Напрыканцы толькі хацелася б падкрэсліць, што знаходжанне ў нашых аграсядзібах — гэта падарожжа не ад дома да дома, а ад чалавека да чалавека. Наведваючы беларускія сядзібы, турысты абавязкова знойдуць тут шматлікіх сяброў.

Аляксандр **Піменаў.**
Фота аўтара.



Агратурызм — гэта цікава!







Мазаіка адпачынку



# ХАДА ў стылі фэнтэзі

## Нататкі пра пешае падарожжа, якое ніхто пакуль не паўтарыў

*Працяг. Пачатак ў №2,3,4,6*

***Ігнацішкі — лес за вёскай Камарова. Людзі ў вёсцы Міхалішкі. Першы сюрпрыз з правым калясом Лялечкі. Роля мужчыны і жанчыны ў сутворчасці. Пачатак нашай доўгай "хаджэнскай дыскусіі". Дзед Адольф.***

Вызначаемся з каардынатамі для чытачоў, якія вандруюць вакол Беларусі разам з намі. Мы — пад Лынтупамі, на Пастаўшчыне. Адпраўляемся ў дарогу ў 9.40, ідзем на Камарова. І ў адну з передышак запісваем у дзённік: "Месца начлегу было цудоўнае. Мы ўжо такія брудныя. Шчасце, калі нават у невялічкім балотцы памыеш твар і рукі. Але прыстасавацца можна да ўсяго. Вось такая істота — чалавек. За гадзіну мы ў сярэднім робім (праходзім) 5 км. Надвор'е па-ранейшаму нам спрыяе. Ды ніяк не выпрацуем распарадак дня — не знаходзім часу на чытанне, мыццё шкарпэтак, пісанне тэкстаў у Мінск. Лялечка паціху паскрыпвае. Начавала ў лесе ўпершыню і яна".

Уваходзім ў вёску Альшэва, на рацэ Страча. Запіс у дзённіку: "Бурная плынь унізе, а мы сядзім-адпачываем прама на мосце. На душы спакой. Адпачынак зладзілі, прайшоўшы праз вёску". З дзённіка запіс Валянціны: "Іван пайшоў па сшытак, будзе пісаць верш, які народзіцца з нашага цудоўнага душэўнага стану. І з маёй пяшчоты і ўдзячнасці таксама. Так яно і адбылося. Праўда, у яго сваё меркаванне на гэты конт. Вось што ён сказаў: "А мне падаецца: калі верш набліжаецца, то я знаходжуся ў стане натхнёнасці — якую і адчувае Валя..." Валя кідае рэпліку: "Гэта ўсё роўна — мы ў адной паэтычнай звязцы, не толькі ў пешай"..." А сама выказваецца: "Ты, Ваня, пераварочваеш сваім тэзісам "усе касмічныя законы", накшталт: менавіта жанчына сцягвае і дае кірунак ідэям, якія мужчына ўвасабляе".

Такіх творчых дыскусій наперадзе яшчэ нямала. Зрэшты, Іван і не адпрэчвае: "Была б іншаю сітуацыя ў зносінах паміж намі — магло б і ўвогуле не быць і падарожных вершаў. А як быць з такой рэальнасцю: у расстанні з любімай паэты пішуць вельмі цікавыя творы. Хто ў такім выпадку "сцягвае і дае кірунак"? Безумоўна, жанчына, бо ў тузе па ёй паэт творыць. Хоць яе можа і ўвогуле не быць побач, ды і ў гэтым свеце. Ды ўсё роўна містыкі сцвярджаюць, што роля жанчыны ў мужчынскай творчасці — першасная...". Значыць, я мела рацыю, жартаўліва сказала Валя.

У той "лірычны" дзень мы норму па хадзе выканалі — 27 км. І, прачнуўшыся, паснедалі ды пайшлі ў наш дзясяты дзень.

Некаторыя дні, бывала, былі падобныя адзін на другі. Асабліва ў Чарнобыльскай зоне. Але пра гэта пазней. Учарашні ж дзень быў адзначаны тым, што ледзь не зламалася каляска. Як мы жартавалі — падвывіх правай нагі Лялечкі. Калясо было падобнае на 8. Але Іван справіўся, падрамантаваў.

Начавалі зноў у лесе. Упершыню не было холадна. Нават горача ў спальніку. Іван кажа: сёння бярэм Астравец. Нарэшце сустрэлі людзей — мясцовую міліцыю. Ужо нават засумавалі без сустрэчных... А вось і яны: у Міхалішках. Купілі там на адным падвор'і малака. Вяскоўцы гавораць: раней жылося лепш. Усяго за жыццё хапала. Сустрэлі цікавага дзеда. Ромашу Адольфу Феліксавічу 76 гадоў. Вёска Міхалішкі стаіць на рэчцы Віллі. Калгас імя Кірава, тут Астравецкі ўжо раён. Дзед

мае каня, хацеў бы яшчэ зямлі набыць, акрамя тых 22-х прысядзібных сотак, якія мае, ды больш яму не даюць, "хоць і зарастае кустамі". Абрабляў бабкі мясцовай агарод — а яна памерла ўжо — і касіў там, і бульбу садзіў. Сусед яму дапамагае. На каня, кажа, больш харчу патрэбна, чым на карову.

Мы разважалі пра людзей добрых і дрэнных, і ці мае значэнне ў гэтым пытанні вера. А бабкі нам казалі: "Залежыць, які чалавек — а не якая вера ў яго".

Дзед Адольф умее загаворваць "ад гадаў", калі чалавека змяя ўкусіць ды цела распухне. "Памалюся — і пройдзе. Мне тое перадаў старэйшы чалавек — а можна перадаваць толькі маладзейшаму. А ў нас тут усе загаворваюць. Ад рожы бывае".

У Міхалішках нам расказалі: які ўзровень вады ў Віллі — такі і ў мясцовых калодзежах. Мы ж паглядзелі на гэтую цікавую з'яву як своеасаблівы сімвал суаднесенасці агульнага (супольнага) і прыватнага.

Ля мясцовага магазіна паглядзелі на спідометр і зразумелі, што прайшлі ад пачатку маршрута ўжо 254 км. Паставілі пячатку круглую ў мясцовай аптэцы. "МЗ БССР. Гродненское областное производственное об'единение "Фармация" Аптека № 97 д. Михалишки Островецкого района". У аптэцы фармацэўты хваляць нашу чыстую беларускую мову ды самі ўдакладняюць: "А мы гаворым на нейкай мешанцы".

***Камарова — Філіпаны. Газа, Больнікі, Варнянскі касцёл. Хлопцы, якія хочуць быць вядомымі. Блаславенне ксяндза. Анёл на дарозе.***

Прыйшлі ў вёску Газа. Там зрабілі невялічкі адпачынак. Да нас падышлі тры хлопцы. Цытуем дзённік: "Віктар, Дзмітры, Андрэй растуць без бацькоў. Кажуць: добра быць журналістамі, падарожнічаць. Яны — дзевяцікласнікі. Хлопцы распытвалі: калі ды дзе пра нас напішаце? Такое натуральнае жаданне: каб пра іх ведалі ў свеце. Мы спыталі: "Ну і што пра вас напісаць? Што вось вы двое без шапак, а адзін з вас сустрэўся нам у Газе ў шапцы? Што хочаце ўсе паступаць у прафесійна-тэхнічнае вучылішча? Дык тое ёсць у кожнай вёсцы... А чым вы адметныя?" Яны пераглянуліся — не ведаем, адказалі.

СЯРГЕЙ ЛЕСКЕЦЬ



Бабуля Ядзвіга выкарыстоўвае свой дар лекаркі на карысць людзям

З АСАБІСТАГА АРХІВУ ІЛЛІ РУДЖОНІСА



Ілля Руджоніс разам з бацькам

RADZIMA.NET



Такія рарытэтныя хаткі, як гэтая ў Больніках у 1996-м, і цяпер сустракаюцца ў беларускіх вёсках вельмі рэдка



Касцёл Святога Юрыя ў Варнянах. Малюнак Напалеона Орды.




Час непадуладны над сучасным велічным храмам Святога Юрыя

Раней у школах так "прафарыентавалі": маўляў, працуй на зямлі ўдарна — і станеш вядомым і багатым. То, можа, варта растлумачваць школьнікам вясковым, што можна рэалізавацца і ў любой творчасці (пішы вершы, малюй, спявай, танцуй, іграй на скрыпцы ці гармоніку, займайся народнымі промысламі...).

Далей ідзем праз вёску Загазь. Там размаўляем з мясцовай лекаркай-шаптухай. Яніна Аляксандраўна Рынкевіч вядомая ў рэгіёне тым, што лечыць рожу. Бацька перадаў, малітву пераказаў — навучыў, запаведаў дапамагаць "першаму і апошняму чалавеку". Субяседніца дзеліцца сакрэтам: "Трэба гаварыць малітву "адным дыханнем". Тры разы. Адзін раз прагавару — аддыхну. Да ўсходу сонца і на захадзе тое трэба рабіць. Грошай з людзей не бяру. Неяк адна жанчына прыходзіла, дык я два гады яе хваробу загаворвала. Святое ўсё, святыя словы. Хрышчуся перад тым як лячыць. Дзевачку прывозілі — вадырамі цела было абсыпана. Дробна, як макам. То спалі паступова. Урачы нічога не маглі зрабіць: ідзі, сказалі, да бабкі".

Што цікава, рыхтуючы гэтыя нататкі, мы знайшлі ў інтэрнэце інтэрв'ю (2013 год) калегі Сяргея Лескеця з лекаркай. І нават здымак "нашай" бабулі.

Перад вёскай Больнікі па дарозе нам сустрэўся — хочаце верце, хочаце не — анёл. Інакш і не скажаш. Праўда, крылкаў у яго не было. Крыжык на шыі на вяровачцы. Мы потым успаміналі таго прыгожага хлопчыка падчас усёй нашай вандроўкі. Ды і цяпер, калі вобраз пяшчотнай дзіцячай постаці ўсплывае ў памяці, ахінаемся цяплом. Адкуль ён узяўся на той дарозе паміж нейкім хутарам на ўзгорачку ўдалечыні ад нас і вёскай... Маленькі, светлавалосы, зусім не бойкі, але і не баязлівы... Да Больнікаў далекавата... Адзін на вялікай пустой дарозе... Вочы шэра-блакітныя, у стаптаных сандаліках, у светлай льняной кашулісарочцы, а ў ручках — ёлачныя ўпрыгажэнні... У красавіку! І дзе ён іх узяў...

— Ты хто? — пытае Валя, прысеўшы на кукішкі.

Хлопчык гаворыць:

— Рудзоніс.

— Куды ідзеш?

— Да Андрэйкі гуляць.

— А колькі табе гадоў?

Паказвае на пальчыках: тры. І пытае, гледзячы на каляску:

— А что это ты везешь?

Як маглі, расказалі, хто мы такія. І дагэтуль шкадуе Валя, што ў нас нават цукерак не было, каб яго пачаставаць.

Дзе ты, Рудзоніс? Табе цяпер 28. Гадоў дзесяць назад мы пісалі ў Больнікі, шукалі гэтага хлопчыка, каб пераслаць яму часопіс з нашымі ўспамінамі пра сустрэчу на дарозе. Але адказ так і не прыйшоў. І вось, калі пішуцца гэтыя радкі, Валя патэлефанавала ў вёску, запытала пра Рудзоніса. Аказалася, што там такая сям'я жыве. А Рудзоніс — не імя, а прозвішча. Больш таго, правільна казаць: Руджоніс. Паабяцалі ўдакладніць, ці жывуць там такія.

Пакуль не дайшлі да касцёла ў вёсцы Варняны, усё пра нашага маленькага анёльчыка гаварылі, разважалі пра тое, якім складзецца яго лёс. На жаль асабіста з "Рудзонісам", якому сапраўды сёння 28 гадоў, мы не гаварылі. Ілля Руджоніс — гэта сапраўднае імя нашага падарожнага "анёльчыка" — з'ехаў з Больнікаў разам з сястрою, як паведаміла яго аднавяскўка Марына, некуды ў Расію — на заробкі. Дадала яшчэ, што маці іх памерла, бацька жывы-здаровы, працуе. Спадзяемся, з часам даведаемся больш пра лёс Іллі, які жыве і не ведае, што двое мінскіх журналістаў час ад часу згадваюць пра яго і жадаюць яму поспехаў на жыццёвай дарозе.

Касцёл Святога Юрыя збудаваны ў 1769 годзе, сама ж вёска ўпершыню згадваецца ў дакументах у 1492-м. Калі мы былі ў касцёле ў 1996-м, якраз пасля свята Юр'я, то даведаліся, што ў Гродна, для семінарыстаў збіраюць варнянскія вернікі прадукты — а у семінарыі там сто клірыкаў вучацца. Час, узгадаем, быў пасля развалу Савецкага Саюза няпросты. Бачылі мы ў скрынках, што стаялі ў касцёле, хатулькі з яйкамі, крупой, макаронамі, брускі масла, сала. Запісалі ў дзённік: "Колькі ж у гэтых прадуктах энергіі дабрыні прыхажан, якія цяпер і самі не маюць у дамах нічога лішняга! Па суботах у касцёл ходзяць школьнікі. Ёсць арган, на ім іграе дзяўчына Аня. Ксёндз Піку-

СЯРГЕЙ ПЛЫТКЕВІЧ



Касцёл Святога Архангела Міхаіла ў Міхалішках. Сучасны выгляд.

RU.WIKIPEDIA.ORG



Храм у1871 годзе

Ахвяраванні на будаўніцтва храма былі зробленыя Янам Бжастоўскім ў 1662-м. Аўтарам вядомага помніка культавай архітэктуры лічыцца архітэктар бельгійскага паходжання Крыштаф Пэнс. Гэты архітэктар заснаваў цэлую дынастыю архітэктараў і дэкаратараў у ВКЛ. Аўтарам унутраных інтэр'ераў сумесна з архітэктарам Пэнсам з'яўляецца італьянскі мастак Джавані П'етра. Акрамя яго над інтэр'ерамі касцёла працавалі Джавані Марыя Галі і віленскі майстар Мацей (Мікалай) Жылевіч. Храм быў асвячоны ў гонар Святога Міхаіла Архангела ў 1700-м віленскім біскупам Кіпрыянам Паўлам Бжастоўскім. У тыя часы Святога Архангела Міхаіла лічылі галоўным абаронцам і нябесным заступнікам усяго ВКЛ.

ла, з якім мы пазнаёміліся і размаўлялі, тут служыць 6 гадоў. У будынку 42 гады быў клуб, а шэсць гадоў таму храм аднавілі мясцовыя жыхары на свае сродкі. Абразы з Вільні прывезлі. Святар Пікула два гады служыў клірыкам у Паўднёвай Амерыцы, у Балівіі. Расказаў нам, як з суседніх парафій на свята Юрыя ў Варнянскі касцёл прыязджалі ксяндзы — бо ён узведзены ў гонар Святога Юрыя. Было вялікае свята. Службу правілі 20 ксяндзоў".

Бабка нам адна там жа, у касцёле, расказвала: "Маліліся і па-беларуску, але мы тое праз слова разумеем. А папольску нам звычней, мы ж палякі. А на Беларусі, можа і моляцца па-беларуску". Ну прама бяда: зусім не адчувае сябе вяскоўка з Варнян грамадзянкай Беларусі... Разважанні свае запісалі ў дзённіку: "Што палякі — гэта зразумела: у Беларусі жывуць прадстаўнікі больш чым 160 розных нацыянальнасцяў, і польская дыяспара надзвычай моцная і вялікая. Але не адчуваць, што жывеш у Беларусі..." Думаем, за той час, што прайшоў з часу нашага "Хаджэння ў трыдзясятае царства", за гады беларускай Незалежнасці нешта ў светапоглядзе варнянскіх палякаў такі змянілася.

Ксёндз Пікула ў Варнянах мае свой дом. Сябруе са старшынёй мясцовага калгаса, дырэктарам школы, моладдзю. Ён паказаў нам, як зменьваецца павольна адна выява на алтары на другую: здаецца, Езус Хрыстус — на Маці Боскую.

Ксёндз у адказ на нашае пытанне, як ставіцца касцёл да бабак-шаптух, разважыў: "Ад Бога кожнаму даецца розны дар. І калі яна лечыць з малітваю і "пенёндзы" (грошы) не бярэ, не шарлатанка — то так тое і трэба". Нам падалася такая развага простай і разумнай. Бо калі часам так званая нетрадыцыйная, народная медыцына ставіцца царквой альбо чыноўнікамі ад "афіцыйнай" медыцыны па-за законам, то такая практыка не на карысць усеагульнаму здароўю. Народны досвед лекавання заслугоўвае ўвагі. Іншая справа: індывідуальны падыход павінен быць да кожнага такога лекара. На думку ксяндза, розныя "дары" мы атрымліваем ад Бога — розныя і людзі карыстаюцца імі, а для кагосьці дар лекавання можа быць непамерна цяжкім.

На развітанне ксёндз Пікула блаславіў нас, пажадаў "шчэньсьця й добрай дрогі".

CHURCH.BY




Помнік слыннаму жыхару-дыпламату Іосіфу Гашкевічу ў Астраўцы. Таксама ёсць і яго скульптура на камені ў вёсцы Малі, якая, дзякуючы ёй, стала вядомай у свеце.

***Філіпаны — Медрыкі — Малі. Ванда-паэтка. Начлег на сене. Сустрэча з калегамі з "Астравецкай праўды".***

Дзень адзінаццаты, 25 красавіка. Пасля начлегу на сенавале з яго травянымі водарамі адчуваем прыліў сіл. Пасля Варнянаў дарога была з пакатымі ўзгоркамі, шырока абсаджана елкамі. Учора ішлі пры святле месяца. Шукалі: дзе б спыніцца? Урэшце заначавалі ў вёсцы Філіпаны: у Ванды і Генадзя Радзевічаў. Іх хата стаіць пры дарозе справа. Папрасіліся на сенавал. І нам не адмовілі. Унізе пад намі рохкала свіння, бо мы ж яе патрывожылі тым, што лезлі ў хляве на гарышча. Паслалі там на сене коўдру гаспадыніну і свае спальнікі. Камфорт! І гаспадарам асаблівага клопату няма — іх не сцяснілі.

Спадарыня Ванда пакарміла нас зранку смажанай бульбай з малаком. Цікавілася нашым падарожжам. А як даведалася, што Іван піша вершы, то чытала і свае. Адзін верш — своеасаблівая просьба да Бога — пра тое, як трэба зямлю аберагаць. Потым гаспадыні трэба было некуды хутка ісці — здаецца, яна працавала на жывёлагадоўчым комплексе. Ну і мы хуценька сабраліся ў дарогу. Адыходзячы з Філіпанаў, бачылі, як Ванда залазіла ў кузаў машыны, каб ехаць на працу. Дзякуй добрым людзям, што далі нам прытулак!

Далей па нашым маршруце была вёска Малі. Там зайшлі ў кантору калгаса "Чырвоны Кастрычнік", яго спецыялізацыя — збожжавыя культуры і жывёлагадоўля. Штамп квадратны калгасны ў дзённік паставіў нам адміністратар канторы Валеры Кулевіч. На адбітку чытаем "Госагропром БССР. Островецкое районное агропромышленное объединение. Колхоз "Красный Октябрь".

Побач у дзённіку і круглая пячатка паштовага аддзялення сувязі ў Астраўцы, ці штамп з датай. На ёй чытаем: "СССР. Гродн. Островец. Астравец. 25.04.96"

Заглянулі да калег у рэдакцыю раённай газеты "Астравецкая праўда". Сустракаліся, гутарылі з загадчыцай аддзела грамадска-палітычнага жыцця Сямёнавай Таісай Сямёнаўнай. Яна паведаміла нам, што ў вёсцы Малі раней жылі прадстаўнікі дваранства. У прыватнасці, дыпламат Іосіф Гашкевіч, які памёр у 1875 годзе. У бібліятэцы ёсць куточак, яму прысвечаны, і кніга Віталія Гузанава "Адысей з Белай Русі". Заўважым, што Іосіф Гашкевіч — асоба вядомая, ён лічыцца першым дыпламатам-ураджэнцам Беларусі. Наш зямляк працаваў у Кітаі ды Японіі — пра тое цяпер ёсць публікацыі ў інтэрнэце. Бронзавыя бюсты Іосіфа Гашкевіча ўстаноўлены ў японскім горадзе Хакадатэ, а цяпер і ў беларускім Астраўцы. І музей створаны ў школе — а на той час мы прайшлі Малі як вёску, нічым непрыкметную.

З запісаў пасля размовы з калегай у дзённіку: "У Астравец прывозяць антэны дэцыметровыя з Літвы, яны каштуюць ад 150 да 200 тысяч рублёў, і "ўсё цягнуць" — і Санкт-Пецярбург, і іншыя тэлеканалы прымаюць. А дамы ў горадзе ад тых антэн — як вожыкі. Працы ж у горадзе мала. Бо "амаль усё стаіць". Камбінат будматэрыялаў, завод "Радыёдэталь" працуюць "ад выпадка да выпадку". Будаўнікі ўзводзяць банк. Жылля не будуюць. Затое людзі шмат сіл і часу ўкладваюць у агароды, дачы: "зямелька ратуе". Таіса Сямёнава ў Астраўцы жыве 8 гадоў".



Сучасны Астравец



Каплічка пры дарозе на Медрыкі

Сёння Астравец — атамгорад, як пра яго гавораць. Тут будуюць не дамамі, а мікрараёнамі. За апошнія пяцьшэсць гадоў у Астраўцы з'явіліся 2 новыя мікрараёны, пачата будаўніцтва трэцяга. Прычым побач з дамамі адначасова будуюцца школы, дзіцячыя сады, крамы.

"Даатамны" Астравец (у 18 км ад горада будуецца Беларуская АЭС) , які мы бачылі ў 1996-м, гэта 8200 жыхароў, а сёння ў ім — звыш 14 000 чалавек. І гэта, кажуць, не мяжа...

Калі ішлі па Астраўцы, то Валю рассмяшыла аб'ява на мясцовай вуліцы: "Прадаецца карова ў г.п. Астравец па тэлефоне..." Прадаваць карову па тэлефоне — гэта як? А яшчэ яна захапляецца прыгожымі назвамі вёсак: Філіпаны, Медрыкі, Малі... У кожнай з іх свая цікавая гісторыя, і кожная з іх — нечым адметная і ў гісторыі нашага "Хаджэння".

Валянціна і Іван **Ждановічы**

# ПЯТЫ ПОМНІК **ФРАНЦЫСКУ СКАРЫНЕ**

**У цэнтры Мінска, у скверы паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Цэнтральнай навуковай бібліятэкай навук імя Якуба Коласа, гэтымі днямі з'явіўся помнік Францыску Скарыне, пяты па ліку ў сталіцы. Ён — частка архітэктурна-мастацкай кампазіцыі "Залатое кола беларускай навукі" ў праекце "Алеі славы беларускай навукі".**

По прапанове Прэзідыума НАН распрацоўкай праекта займалася архітэктурна-інавацыйнае бюро БНТУ. Ім кіруе Армэн Сардараў — дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ. Архітэктурна-інавацыйнае бюро выконвае навукова-даследчыя праекты, навуковым кіраўніцтвам на аб'ектах гісторыка-культурнай каштоўнасці. У прыватнасці, спецыялістамі бюро распрацаваны праект сквера ў Нясвіжы, праект устаноўкі металічнай копіі самалёта "Іл-2" у музейнай экспазіцыі мемарыяльнага комплексу "Курган Славы", помнік Антонію Тызенгаўзу ў Паставах і шмат чаго іншага.

— Спачатку Акадэмія навук замовіла ў нас праект па добраўпарадкаванні скверу, але не толькі для таго, каб можна было там адпачыць, абмеркаваць нешта на свежым паветры. Вядома, трэба было надаць гэтай рабоце нейкае грамадскае значэнне, і таму было вырашана зрабіць там алею выдатных айчынных вучоных. Назву "Залатое кола беларускай навукі" прапанаваў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Гусакоў, — падзяліўся Армэн Сардараў. — Так нарадзілася ідэя ратонды з помнікамі беларускіх грамадскіх дзеячаў, якія заклалі падмурак беларускай навукі.

Будаванне ратонды пачалося ў 2020 годзе. Гэтая ратонда быццам дапаўняе архітэктуру самой Акадэміі навук, стылізавана пад знешні выгляд галоўнага будынка. Яе калоны зроблены з шэрага граніту.

У "Залатым коле беларускай навукі" запланавана паставіць помнікі (акрамя ўжо гатовага Францыску Скарыне) Кірылу Тураўскаму, Сімяону Полацкаму, Яўхіму Карскаму, Усеваладу Ігнатоўскаму, Яўстафію Тышкевічу і Казіміру Семяновічу. Па словах Армэна Сардарава, работу разлічваюць скончыць гэтым летам. Каля кожнага помніка ўжо зроблены картушы, на якіх знаходзяцца знакамітыя выказванні гэтых навуковых дзеячаў. Побач з Францыскам Скарынам на картушы напісана: "Слова вучыць, выкрывае, выпраўляе і паказвае шлях да праўды!"

Каб зрабіць гэтыя помнікі, запрасілі скульптараў Алену і Аляксея Хараберушаў.

Таксама Армэн Сяргеевіч падзяліўся меркаванымі планамі НАН на адкрыццё кампазіцыі:

— У цэнтры ратонды стаіць вертыкальная стэла, на якой зроблена капсула часу ў выглядзе зямнога шара. У гэтую капсулу часу павінна быць закладзена пасланне нашчадкам ад беларускіх вучоных нашага часу.



ZVIAZDA.BY

Цікава і тое, што гэта ўжо пяты помнік Францыску Скарыне ў сталіцы. Адзін з помнікаў знаходзіцца ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, другі зрабілі каля Нацыянальнай бібліятэкі, трэці помнік, прысвечаны асветніку, — "Веды — моц", чацвёрты, каменны, стаіць у парку Янкі Купалы.

Наталля **Драздова**



# ЯРКІЯ АДМЕТНАСЦІ Ў АЛІМПІЙСКАЙ ФОТАХРОНІЦЫ

**Калі выйдзе з друку ліпеньскі нумар часопіса, Алімпійскія гульні ў Токіа будуць у самым разгары. Нельга прадбачыць іх вынікі. Цяжка пакуль спрагназаваць, якім стане ў японскай сталіцы і выступленне беларускай алімпійскай каманды. Перамагае, як кажуць, мацнейшы. Але ж дакладна вядома: на папярэдніх Алімпійскіх гульнях беларуская каманда ніколі не гублялася. Пра гэта, дарэчы, нагадвае і фотавыстава "НАК Беларусі — 30 гадоў. Гісторыі нашых перамог!", якая размясцілася на плошчы Свабоды ў Мінску.**

Выстава расказвае аб славутым мінулым беларускага спорту. Любы жадаючы здольны ў даступнай форме атрымаць кароткую інфармацыю аб алімпійскай спадчыне краіны. Пазнаёміцца з тымі відамі спорту, у якіх беларускія алімпійцы заваёўвалі медалі з 1992 па 2018 гады.

На выставе "НАК Беларусі — 30 гадоў. Гісторыі нашых перамог!" прадстаўлены фатаграфіі чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў незалежнай Беларусі. Інакш кажучы, на здымках адлюстраваныя найярчэйшыя імгненні нацыянальнай алімпійскай біяграфіі: удзел у першай для суверэннай гісторыі краіны Алімпіядзе ў Ліллехамеры, заваяванне першага залатога медаля Кацярынай Карстэн, залаты забег Юліі Несцярэнкі, сенсацыйная перамога Андрэя Арамнава ў Пекіне-2008, перамога Максіма Мірнага і Вікторыі Азаранкі ў Лондане-2012, трыумф Дар'і Домрачавай у Сочы-2014 і біятлоннай чацвёркі ў Пхёнчхане-2018, залатыя скачкі фрыстайлістаў, заезды весляроў на байдарках і каноэ.

Віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Дзмітрый Даўгалёнак так расказаў пра задуму праекта: "Экспазіцыя выставы ўключае ў сябе ўсе Алімпійскія Гульні і алімпійскіх прызёраў, пачынаючы з 1992 года. Тут цалкам прадстаўлены ўсе нашы героі, якія заваявалі медалі ў суверэннай краіне. Для людзей гэта цікава".

Двухразовы прызёр Алімпіяды па мастацкай гімнастыцы Ксенія Санковіч па-свойму падзялілася ўласнымі ўражаннямі ад выставы:

"Гэта, вядома, важна, каб краіна памятала сваё мінулае. Важна для будучага пакалення. Я спадзяюся, што для кагосьці гэта будзе стымулам аддаць сваіх дзяцей у спартыўную секцыю. Таксама думаю, што выстава будзе цікавая людзям, якія ў свой час самі займаліся спортам".

А вось што сказаў алімпійскі чэмпіён Пекіна-2008 Аляксей Абалмасаў: "Разглядваючы гэтыя кадры, адчулася настальгія па мінулым. Напэўна, гэта былі мае самыя лепшыя гады ў спартыўным жыцці. Не забыцца пра тыя яркія моманты — ўзнагароды, п'едэстал. Цяпер гэтага трошкі не хапае".

Сапраўды, выстава распавядае аб багатай спадчыне беларускага спорту. З улікам таго, што экспазіцыя будзе дапаўняцца новымі фатаграфіямі з удзелам беларускіх спартсменаў, цалкам можна чакаць, што яна будзе абноўлена і па выніках Алімпійскіх гульняў у Токіа.

З затрымкай на год праводзіцца чарговая летняя Алімпіяда. Такой карэкціроўкі запатрабаваў каранавірус, і арганізатары да гэтага прыслухаліся. Цяперашні фармат гульняў — самы незвычайны за ўсе гады.. Тым не менш, яны важныя і як жыццесцвярджальны сімвал у супрацьстаянні пандэміі, і як знак добрай волі народаў. Аляксандр Лукашэнка ў наказе нацыянальнай алімпійскай камандзе папярэджваў аб тым, што спаборніцтвы ў Токіа не будуць лёгкімі:

— Усе мы — і спартсмены, і балельшчыкі — доўга чакалі гэтыя Гульні. Абсалютна перакананы, што адкладзены старт спаборніцтваў, назапашаная энергія, падзеі ў краіне і свеце зробяць маючую адбыцца барацьбу за медалі як ніколі жорсткай і бескампраміснай.

Што ж, застаецца толькі пажадаць удалага выступлення нацыянальнай алімпійскай камандзе на цяперашніх Гульнях. Будзем чакаць і спадзявацца, што неўзабаве ў экспазіцыі выставы "Гісторыі нашых перамог!" з'явіцца новая фотахроніка — аб поспехах беларускіх алімпійцаў у Токіа.

Уладзімір **Міхайлаў.**

Фота аўтара.


ИСТОРИИ
НАШИХ
ПОБЕД!
30
ЛЕТ НОК
БЕЛАРУСИ


СЕРЕБРО
ДМИТРИЙ
ДАШИНСКИЙ


АФИНЫ 2004
ВАНКУВЕР 2010


ЗОЛОТО
СОЛТ-ЛЕЙК-СИТИ 2002
SALT LAKE 2002
64
9


ЛОНДОН 2012




БРОНЗА
АЛЕКСЕЙ
ГРИШИН
Игры XXVIII Олимпиады
АФИНЫ 2004
ATHENS 2004
151
23
ВАНКУВЕР 2010

# РАМАНТЫЧНАЯ САГА ПРЫ ПОЎНЫМ АНШЛАГУ

**Дзіўныя легенды таямнічых балот Палесся ажылі ў адной з лепшых беларускіх опер "Дзікае паляванне караля Стаха" на сцэне Вялікага тэатра Беларусі. Гэтым прэм'ерным спектаклем у тэатры вырашылі закрыць 88-ы сезон.**

Пастаноўка і сапраўды здзівіла прыхільнікаў тэатра сваёй грандыёзнасцю, маштабнасцю. Зала на прэм'еры пляскала ў далоні нават самаму, што ні ёсць, сапраўднаму каню, які бездакорна "выканаў" сваю партыю — мірна жаваў сена ў дэкарацыях на заднім плане, не кажучы ўжо пра вакалістаў, чые галасы гучалі ярка, гарманічна ўпісваліся ў музычную канву дзеі. А пра фінал і казаць — не хапае слоў. Перапоўненая зала ўзрушана, шчаслівыя ўсмешкі ўсіх выканаўцаў і пастаноўшчыкаў спектакля, букеты кветак і, вядома ж, бесперапынныя авацыі задаволенай публікі. Прыемна адзначыць, што нават у такую анамальную спякоту, неўласцівую нашым шыротам, адданыя тэатру гледачы не прамянялі высокае мастацтва оперы на прахалодныя вадаёмы ды ціхія вечары на прыродзе.

Напярэдадні прэм'еры оперы Уладзіміра Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха" не будзе лішнім згадаць, як ствараўся першы спектакль у 1989-м, які ўжо стаў легендарным, і хто былі першымі выканаўцамі галоўных партый, як працавала пастановачная група. Так сталася, што асабіста я на свае вочы бачыла, якой радаснай была аўтар лібрэта Святлана Клімковіч, калі завяршыла працу над ім. Мы тады поруч з ёй працавалі ў Саюзе тэатральных дзеячаў. Святлана была пісьменніцай, перакладчыцай, да таго ж і нарадзілася ў Мінску (1935) у сям'і вядомага пісьменніка Міхася Клімковіча. Мая калега была на той час адказным рэдактарам бюлетэня Беларускага тэатральнага аб'яднання (з 1987- га — Саюза тэатральных дзеячаў) "Тэатральны Мінск", а мы, маладзейшыя, працавалі ў СТД кансультантамі. Трэба было бачыць, з якім піетэтам яна расказвала і пра гістарычны дэтэктыў Уладзіміра Караткевіча, па якім пісалася лібрэта, і пра рэпетыцыі спектакля, які неўзабаве стаў музычнай класікай, і пра геніяльнасць кампазітара Уладзіміра Солтана. Па розных абставінах на прэм'еру оперы я не патрапіла, і потым адчайна зайздросціла, калі ў наступны дзень чула захопленыя водгукі маіх калег пра спектакль. Казалі, ля тэатра дзяжурыла нават конная міліцыя: ахвочых патрапіць на прэм'еру было больш, чым магла змясціць тэатральная зала. Унікальнай для Беларусі таго часу з'явай стала выкананне оперы і ў "жывых" дэкарацыях Траецкага прадмесця ў Мінску. Прэм'ера і далейшыя паказы спектакля на сцэне Вялікага ішлі пры поўных аншлагах. Жыццё той оперы ў ім доўжылася 22 гады. У 1989-м спектакль двойчы паказвалі ў Вялікім тэатры Расіі.

Опера стала легендай. Пра яе адметнасці можна было распытаць напярэдадні прэм'еры асабіста ў артыстаў, якія мелі да пастаноўкі прамое дачыненне. Сустрэча з імі прахо-



Сцэна з першай дзеі



Марта Данусевіч
(Надзея Яноўская)



Уладзімір Пятроў
(Андрэй Беларэцкі)



Юрый Гарадзецкі
(Андрэй Свеціловіч)



Дзмітрый Шабеця
(Рыгор Дубатоўк)

дзіла 7 ліпеня ў Камернай зале Вялікага тэатра. Пра ўражанні ад працы над операй, пра камандны дух на рэпетыцыях і пра тое, як прымаўся публікай спектакль, расказваў Віктар Скорабагатаў — першы выканаўца партыі Беларэцкага, чалавек, без якога, магчыма, і не было б гэтай оперы, заслужаны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік "Беларускай Капэлы". Дзяліўся згадкамі дырыжор-пастаноўшчык оперы "Дзікае паляванне караля Стаха", цяпер мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі, народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў. Пачулі мы і першага выканаўцу партыі Дубатоўкі, народнага артыста Беларусі, рэжысёра-педагога Уладзіміра Экнадзіёсава, і выканаўцу партыі Надзеі Яноўскай, заслужаную артыстку Беларусі, загадчыцу Камернай залы Вялікага тэатра Тамару Глаголеву. Дарэчы, у 1990-м праца кампазітара Уладзіміра Солтана і пастаноўшчыкаў спектакля (дырыжораў Яраслава Вашчака і Аляксандра Анісімава, рэжысёра Вячаслава Цюпы, мастака Эрнста Гейдэбрэхта і выканаўцаў галоўных роляў Наталлі Кастэнкі, Віктара Скорабагатава і Уладзіміра Экнадзіёсава) была адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Як праходзіла праца над новай версіяй оперы "Дзікае паляванне караля Стаха" — пра тое журналісты даведаліся на прэс-канферэнцыі, прысвечанай прэм'ернаму паказу. Па традыцыі сустрэча пастаноўшчыкаў спектакля з журналістамі праходзіла на сцэне сярод дэкарацый. Нават іх фрагменты — скажам, з бліскучага металу змайстраваныя коні — абяцалі відовішчнасць. Сваімі думкамі аб працы над операй дзяліліся дырыжор-пастаноўшчык Андрэй Іваноў, рэжысёр-пастаноўшчык Ганна Маторная, хормайстар-пастаноўшчык, народная артыстка Беларусі і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Ніна Ламановіч, мастачка па касцюмах Таццяна Лісавенка. На жаль, не змагла прысутнічаць Вольга Костэль, балетмайстар-пастаноўшчык: захварэла кавідам. ***Дырэктар тэатра Вячаслаў Гарбузаў***, які першым узяў слова, адзначыў:

— "Дзікае паляванне караля Стаха" — складаны для ўспрымання, не забаўляльны твор. Ён прымушае нас задумацца, асэнсаваць нейкія важныя рэчы, у тым ліку, магчыма, і асабістага парадку. І пастановачная група зрабіла ўсё магчымае, каб глядач мог паглыбіцца ў прастору твора Уладзіміра Караткевіча, і ў яе інтэрпрэтацыю тэатрам".

Дырэктар таксама трохі гаварыў пра планы Вялікага ў новым сезоне. Пра тое, у прыватнасці, што ў афішы Вялікага мы ўбачым другую рэжысёрскую працу Аксаны Волкавай. Заслужаная артыстка Беларусі рыхтуе да пастаноўкі оперу французскага кампазітара Каміля Сен-Санса "Самсон і Даліла". Прэм'ера прызначаная на снежань. Балетмайстар Юрый Траян ставіць балет "Канёк-Гарбунок", прэм'ера чакаецца ў канцы кастрычніка. І яшчэ ў рабоце опера Вольфганга Амадэя Моцарта "Басцьен і Басцьена" ў пастаноўцы маладога рэжысёра Дар'і Пататуркі — прэм'ера плануецца на Камернай сцэне.

***Дырыжор-пастаноўшчык Андрэй Іваноў:***

— Партытура Уладзіміра Яўгенавіча Солтана — гэта шэдэўр, гонар нашай краіны. Мы можам ганарыцца і партытурай, і тым, што ў Беларусі жыў такі вялікі кампазітар. У нашай пастаноўцы будзе гучаць найбольш поўны варыянт твора. І мы з Ганнай Дзмітрыеўнай (Маторнай. — **Аўт.**) казалі ўжо раней пра тое, што пастараемся аднавіць і выкарыстаць увесь матэрыял, які быў ім напісаны. Як вядома, партытура была страчана і аднаўлялася па аркестравых галасах у вельмі сціслыя тэрміны, і ў яе не ўвайшлі некаторыя фрагменты. Таму мы іх, якія не прагучалі ў першай пастаноўцы, і ўключылі. Гэта чатыры арыі з другой дзеі. Дарэчы, яны пісаліся кампазітарам яшчэ ў 1987-м. І мы, паўтаруся, уключылі іх у спектакль замест тых, якія выконваліся ў 1989-м. Гэта песня Рыгора ў суправаджэнні аркестра. І арыя Беларэцкага, якая характарызуе персанажа зусім па-іншаму: ён у такім варыянце найбольш блізкі да задумы, вобраза Караткевіча. У выніку гэтага маналога мы разумеем: перад намі — жывы чалавек са сваімі страхамі, эмоцыямі, уласцівымі кожнаму. І ён ўсё роўна прыходзіць да думкі: акрамя яго разабрацца ў д'ябальшчыне, якая адбываецца навокал, выратаваць сітуацыю і Яноўскую, якой ён сімпатызуе, — няма каму. Узялі мы і арыю Яноўскай замест той, вядомай, выдатнай, якую можна пачуць па радыё і на канцэртах. Хутчэй гэта нават яе маналог, які драматургічна выбудаваны інакш. І гераіня раскрываецца паступова, што таксама вельмі блізка, на наш погляд, да Караткевіча. І арыя Свеціловіча прагучыць зусім у іншым ключы, бо ў Караткевіча гэты вобраз вырашаны ў гераічных, вельмі чыстых і светлых фарбах. І яна адлюстроўвае ўнутраны свет персанажа. Акрамя таго, і ў першым дзеянні будзе шэраг новых музычных фрагментаў, акрамя арый, і ў другім. Гэта сведчыць пра тое, што мы вельмі беражліва

і з вялікім піетэтам пастараліся падысці да працы кампазітара і максімальна поўна прадставіць яго музыку на нашай сцэне. Была праведзена вялікая праца па наборы клавіра Солтана, па камп'ютарным наборы ўсёй партытуры і аркестравых галасоў. Мы нават можам сказаць, што ўвесь матэрыял Уладзіміра Солтана будзе прадстаўлены ў поўным аб'ёме. Што да іншых фрагментаў, то, да прыкладу, рукой Солтана на клавіры ў першай карціне было напісана: тут павінна гучаць жалейка. І мы запрасілі спецыяліста, каб ён зрабіў гэты інструмент і каб задума кампазітара прагучала ў поўным аб'ёме. Вядома, лейтматывам палявання і нашай пастаноўкі, як і ў першай, стануць сурмы. Гэтыя доўгія трубы для спектакля спецыяльна вырабіў майстар Алесь Лось. Будзем выкарыстоўваць і трубы з першай пастаноўкі — зрабіў іх народны майстр Уладзімір Пузыня. Музыка будзе ўпрыгожаная вось такімі не характэрнымі для класічнага аркестра гукамі. Дзесьці яны будуць палохаць, недзе — апускаць у таямнічую атмасферу, дзесьці выклікаць здзіўленне...

Зробім невялічкае адступленне ды звернемся да слоў самога Уладзіміра Якаўлевіча Пузыні, які неяк згадваў у размове: "Я і інструменты рабіў, каб яны маглі быць не сольнымі, а аркестравымі. Вось у сімфоніі, у оперы і загучалі — у "Дзікім паляванні караля Стаха"... А як здарылася? Сустрэў Солтана ў Саюзе кампазітараў, з папкаю ўсё лётаў. І ён мне паказаў партытуру — як пачынаецца паляванне, то павінны быць валторны. Я кажу — хай сурмы! Той прыйшоў да мяне ў майстэрню, і калі я сыграў, кажа: "Ты так нагадаў маю Радзімку!" І калі як гакнулі ў тэатры 6 сурмаў, усе спалохаліся — такі гром!". Вечная памяць майстру!


Сцэна з другой дзеі

Далей Андрэй Іваноў выказаў задаволенасць, што ў тэатры працуюць выдатныя вакалісты: і заслужаныя, і маладыя. Практычна на кожную партыю ў оперы ёсць тры склады, а ў праграмцы пазначаны нават чатыры. "І ўсе яны раўназначныя. Яшчэ хачу сказаць пра тую выдатную атмасферу, якая панавала на рэпетыцыях. Мы ўсе адчувалі, што матэрыял, з якім працавалі, гэта наша роднае, глыбока нацыянальнае. І мы ўсе робім вельмі важную і патрэбную справу. Па працы аркестра, салістаў, хору можна казаць пра тое, што яна намі глыбока перажыта... І мне хочацца, каб наш спектакль прагучаў і заняў годнае месца на афішы тэатра і стаў яго ўпрыгажэннем.

***Рэжысёр-пастаноўшчык Ганна Маторная:***

— Для нас усіх праз партытуру Уладзіміра Солтана рамантычная сага Уладзіміра Караткевіча, з яе глыбіннымі падтэкстамі і падзейнымі паваротамі, ператварылася ў дзівосна пранізлівую і шчымліва праўдзівую гісторыю пра жывых людзей. Мне здаецца, што Караткевіч, стварыўшы "Дзікае паляванне караля Стаха", вывеў беларускую культуру, беларускую літаратуру ў зусім іншую прастору. І можна разважаць пра людзей, якія ў ёй жывуць. Можна іх любіць ці ненавідзець. Але не адчуваць эмоцыі немагчыма. Яшчэ, па-мойму, гэты твор разбурае страхі, дазваляе ўсім нам наблізіцца да нечага вельмі важнага — да ўсведамлення сябе, усведамлення той атмасферы, у якой кожны з нас жыве. Штодня мы сутыкаемся з радасцю і подласцю, з людзьмі, якія нас любяць альбо ненавідзяць. І ў гэтай барацьбе з'яўляецца магчымасць гартаваць свой характар. Таму вельмі важна сёння знайсці тую тонкую нітку, якая можа людзей аб'яднаць. Калі ўсё разбураецца, на руінах вельмі цяжка нешта будаваць. І мне здаецца, што гэты твор — якраз пра тое, што ёсць свет масак і нягоднікаў, а ёсць і свет шчымліва тонкіх дачыненняў паміж людзьмі, здольнымі на геройскія ўчынкі. І гэта важна ва ўсе часы, і тычыцца не толькі беларусаў. Мы ўсе разам пабудавалі, стварылі гэты свет. І пастараліся захаваць галоўную ідэю Караткевіча — любоў выратуе свет і ўсіх нас. Галоўнае — любоў да гэтай зямлі, на якой жывём. Мы таксама гаворым пра непаўторную атмасферу Беларусі, яе традыцыі, яе людзей праз рэканструкцыю абрадаў і легенд. Мы хочам, каб у свеце ведалі пра велізарны пласт беларускай культуры, пра выдатных асоб, пра традыцыі. Рысы гатычнага рамана, містычнай, гістарычнай і рамантычнай драмы — усё гэта ёсць і ў рамане Караткевіча, і ў лібрэта Святланы Клімковіч, і, вядома ж, у музыцы Уладзіміра Солтана. Дырыжор Андрэй Іваноў працаваў з арыгінальнай партытурай твора. Купюр, як ён сказаў, мінімум, таму што ў нас ёсць вялікае жаданне даць магчымасць выказацца менавіта кампазітару. Атрымалася ці не, рассудзіць глядач і час. Але я лічу, што ўсе мы здзейснілі подзвіг, працуючы над гэтым геніяльным творам. Мы ўкладвалі ўсе свае сілы напрыканцы тэатральнага сезона, каб годна яго закрыць. Асобна хачу сказаць пра хор. Калі ў лютым я задала яго кіраўніку Ніне Ламановіч пытанне: "Ці можам мы абысціся без балета?", яна адказала сцвярджальна. І вы ўбачыце гэты таленавіты калектыў, убачыце, як артысты спяваюць і адначасова рухаюцца: лётаюць, скачуць, танцуюць... Яны ствараюць і дзікае паляванне, і свет простага народа... Мы паспрабавалі візуалізаваць усё, пра што гаворыцца ў Караткевіча.


Дзмітрый Трафімук (Рыгор)

***Хормайстар-пастаноўшчык Ніна Ламановіч:***

— Мы можам ганарыцца тым, што ў нашым рэпертуары, акрамя "Сівой легенды" з'явіўся спектакль "Дзікае паляванне караля Стаха". Мне пашчасціла быць чарговым хормайстрам, калі вялася праца над папярэдняй операй. Мы з Валодзем Сол-

танам былі ў вельмі добрых стасунках. І для мяне яго сыход з жыцця — маладога, таленавітага кампазітара — стаў вялікай трагедыяй. Вядома ж, тады быў зусім іншы спектакль. Я нават не збіраюся параўноўваць гэтыя дзве оперы. У сённяшнім столькі важных для ўсіх беларусаў, для краіны рэчаў. Не ўсё пакуль што мы можам усвядоміць. Але, думаю, з кожным спектаклем яны будуць раскрывацца. Галоўнае ў ім — думка. Для мяне важна, што ў оперы гучаць такія словы: "Хочам гнёзды віці на сваёй зямліцы, хочам ваду піці з роднае крыніцы". Гэта такое роднае, наша, беларускае... Спектакль ставіўся хутка, таму патрэбен яшчэ час, каб у ім усё загучала ярчэй, больш аб'ёмна. І так будзе, я ўпэўнена. А хор наш дзівосны. Яго ўдзельнікі і спяваюць, і выдатна рухаюцца. Не раз нават крытыкі памыляліся, кажучы пра хоры як пра балет. Вольга Костэль — выдатны балетмайстар-пастаноўшчык. Заўважу, што яна выдатна працуе з хорам. І ў гэтым спектаклі ў яе ўсё атрымалася. Самі пабачыце.

***Мастачка па касцюмах Таццяна Лісавенка:***

— На шчасце, я была на прэм'еры "Дзікага палявання караля Стаха" ў 1989 годзе. І нават не думала пра тое, што вось мне прыйдзецца з гэтым творам працаваць асабіста. Караткевічам усе мы былі захопленыя ў юнацтве, таму я з радасцю пайшла на тую оперу. Уражанні ад яе незабыўныя. Праца над цяперашняй была складанаю: часу малавата, і былі яшчэ іншыя моманты...



Шляхтічы забаўляюцца (у масцы Ілля Пеўзнер, на ім — Аляксандр Гелах)

Я не хацела паказваць гістарычны касцюм у чыстым выглядзе. Касцюмы для першага дзеяння трансфармаваныя. У іх я вырашыла выкарыстоўваць арнаменты беларускіх абразоў. Само адзенне мае карнавальны характар. Адной з ідэй было выкарыстаць чыста тэатральныя тэхналогіі, якія для Вялікага тэатра вельмі характэрныя. А калі зайшла потым у касцюмерны цэх, то падалося, што трапіла ў каралеўства: колькі там фантастычна-прыгожых касцюмаў! Што да галоўных герояў, то я вырашыла "паляванне" апрануць ў чорнае, а Яноўскую — у белае. Бо яна як белая галубка, на якую замахваецца чорная зграя варання. Візуальны шэраг оперы багаты, ён глабальна інфармацыйны. І не адразу можна тое ўбачыць. Думаю, гэты спектакль трэба будзе глядзець не раз. У другім акце гучыць тэма народа. І я паспрабавала максімальна зблізіць рашэнне касцюма да таго адзення, у якое апраналіся нашы продкі на працягу многіх стагоддзяў. У аснове касцюма была ідэя выкарыстаць лён.

Сустрэча з пастановачнай групай "Дзікага палявання караля Стаха" напярэдадні прэм'еры была як нельга дарэчы. Мы прыйшлі на спектакль падрыхтаванымі. Ды сталі сведкамі, паўтаруся, грандыёзнай прэм'еры, сапраўды ўбачылі вялізную і годную працу Вялікага тэатра. Дэкарацыі ашаламляюць, музыка зачароўвае: у яе хочацца ўслухоўвацца і ўслухоўвацца, да таго ж аркестр іграе віртуозна, салісты і хор на вышыні... І ўсё, пра што на прэс-канферэнцыі гаварылі пастаноўшчыкі, мы бачым у цудоўным сімбіёзе.

У афармленні сцэны мастак-пастаноўшчык Андрэй Меранкоў выкарыстаў колеры і матывы слуцкіх паясоў. Мы ўбачылі вобразы старадаўніх замкаў, іх унутранае ўбранне з бібліятэкай, камінам, падвеснымі сталамі. Паўсталі на сцэне злавесныя балоты, пусткі, занесеныя снегам. Відэакантэнт спектакля — найбагацейшы, насычаны вобразнасцю. Адным з сюрпрызаў спектакля для гледачоў, паўтаруся, быў жывы конь. Вялікае значэнне таксама нададзена сімвалам. Да прыкладу, гадзіннікі паўстаюць як вобраз часу, які бесперапынны і хуткаплынны, а чорна-белае пакрыццё ў цэнтры сцэны падказвае вобраз вечнай гульні, якую вядуць людзі.

У касцюмах, пра што казала Таццяна Лісавенка, бачым цікавыя рэканструкцыі — адгадваюцца прынты з беларускіх абразоў XV—XVI стагоддзяў.

Крыху пра завязку спектакля. Нагадаем, што само дзеянне адбываецца ў канцы XIX стагоддзя. Малады гісторык і філолаг, навуковец-фальклярыст Андрэй Беларэцкі (Уладзімір Пятроў), збіўшыся падчас буры са шляху, трапляе ў родавы шляхецкі замак Яноўскіх — Балотныя Яліны. Яго там прымае



Дзмітрый Шабеця (Дубатоўк)

гаспадыня замка, Надзея Яноўская (Марта Данусевіч), апошняя прадстаўніца свайго старажытнага роду. Дзяўчына змучана жахам нашэсця страшнай конніцы пад правадырствам караля Стаха. Як сведчыць фамільнае паданне, той Стах быў па-здрадніцку забіты на паляванні сваім сябрам Яноўскім-старэйшым — і вось цяпер узяўся помсціць усім членам яго роду. Але праніклівы Беларэцкі адчувае: нешта тут не так. І любоў да Надзеі Яноўскай, якая ўспыхнула ў ім, падахвочвае маладога чалавека дзейнічаць...

Як паведаміў дырэктар тэатра Вячаслаў Гарбузаў на сустрэчы з журналістамі, "Дзікае паляванне караля Стаха" ў верасні адкрые ў Вялікім новы, 89-ы па ліку тэатральны сезон. І мы з нецярпеннем будзем чакаць адкрыцця, каб паслухаць таксама іншых выканаўцаў галоўных партый. І напэўна ж убачым і тыя дэталі, якія на першым спектаклі не зусім нам яшчэ адкрыліся, і вастрэй праз музыку Уладзіміра Солтана адчуем і ўсвядомім глыбінны падтэкст рамантычнай сагі Уладзіміра Караткевіча.

Валянціна **Ждановіч.**

Фота прадастаўлены Вялікім тэатрам Беларусі

# *ВАЛЯНЦІН ГУБАРАЎ:* "МАСТАЦТВА ПАВІННА БЫЦЬ ШУРПАТЫМ. З ГЛЯНЦАВАЙ ПАВЕРХНІ ЎСЁ САСКОКВАЕ..."

**Валянцін Губараў — адзін з самых вядомых сучасных беларускіх мастакоў. Яго імя добра ведаюць знатакі выяўленчага мастацтва як у краіне, так і за яе межамі. Крытыкі называюць яго "беларускім Брэйгелем", яго творчасці прысвечаны адзін з альбомаў папулярнай серыі "Лепшыя сучасныя мастакі". Сведчаннем прызнання творчасці Валянціна Губарава ў Заходняй Еўропе можа служыць той факт, што прэстыжная французская галерэя Gallerie Bertheas Les Tournesols на працягу многіх гадоў мае з ім эксклюзіўны кантракт.**

Асноўная тэматыка творчасці Валянціна Губарава, што пацвердзіла і нядаўняя персанальная выстава ў Нацыянальным мастацкім музеі, — паўсядзённае жыццё простых людзей. Правінцыйныя гарады і мястэчкі, вузкія вулачкі з малаэтажнымі дамамі, маленькія падворкі і невялікія, проста абстаўленыя пакоі, людзі, якія займаюцца сваімі штодзённымі справамі або адданыя простым чалавечым радасцям. Хаця бытавыя сцэнкі мастака — гэта не натуралістычнае побытаапісанне. Работы Губарава выкананы ў наіўнай, амаль лубачнай манеры, фігуры людзей, іх жэсты і паставы выглядаюць гратэскава, колеры — яркія і сакавітыя. Усё гэта стварае атмасферу свята, мары, нават фантасмагорыі. Пражываючы звычайнае паўсядзённае жыццё, персанажы губараўскіх карцін —простыя, нічым не характэрныя людзі — падсвядома мараць пра нешта большае, пра нейкае лепшае, выдатнае жыццё. І аўтар паказвае нам гэтых летуценнікаў са шчырай цеплынёй і добрай іроніяй.

Творчасць Валянціна Губарава часта адносяць да наіўнага жывапісу. Але яго працы зусім не "наіўныя" ў звычайным сэнсе гэтага слова. Уяўная прастадушнасць — гэта форма, пры дапамозе якой ствараецца наравістая "губараўская" атмасфера рамантыкі ў штодзённасці, здольная прыцягваць гледачоў рознай ступені спакушэння ў мастацтве. Але бездакорная дакладнасць і вытрыманасць стылю, змястоўная насычанасць кожнай працы кажуць аб высокім прафесійным майстэрстве аўтара. У працах Губарава няма стылізацыі пад народны прымітыў, "наіўнасць" тут глыбока прадуманая і па-майстэрску выбудаваная. Наогул губарэўскія сюжэты складваюцца з мноства старанна прапісаных дробных дэталяў. Але пры гэтым кампазіцыя кожнай працы застаецца ўнутрана цэльнай і гарманічнай. Карціны Валянціна Губарава ў розных гледачоў здольныя выклікаць самыя розныя пачуцці: у кагосьці настальгічныя ўспаміны, у каго — іронію, смех, здзіўленне ці захапленне, пачуццё расчуленасці, а кагосьці можа навесці на сур'ёзныя разважанні аб сэнсе чалавечага існавання.

***Валянцін Губараў нарадзіўся ў Горкім (цяпер — Ніжні Ноўгарад) 14 красавіка 1948 года. Вучыўся ў Горкаўскім мастацкім вучылішчы, а потым на факультэце графікі Маскоўскага паліграфічнага інстытута. З 1975 года жыве і працуе ў Мінску. Сябра Беларускага саюза мастакоў. Ганаровы сябра мастацкай асацыяцыі "Шэдэўр" (Вюрцбург, Германія). З 1994 года мае эксклюзіўны кантракт з галерэяй Gallerie Bertheas Les Tournesols (Францыя). З 2005 года ўдзельнічае ў аўкцыёнах Christie's (Лондан), Drouot-Richelieu (Парыж), Kinsky (Вена). Персанальныя выставы з поспехам прайшлі ў многіх краінах Еўропы. Творы В. Губарава знаходзяцца ў Музеі мастацтва Санкт-Пецярбурга (Расія), музеі Zimmerli Art Museum (ЗША), галерэі ProArt Gallery (ААЭ) і ў іншых музеях, а таксама ў шматлікіх прыватных калекцыях у Беларусі, Расіі, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Германіі, Аўстрыі, Японіі, Ізраілі і іншых краінах.***

Вядома, персанальная выстава Валянціна Губарава ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі — маштабная падзея, якая дала магчымасць пазнаёміцца з творчасцю мастака бліжэй. Так, ён піша такую знаёмую ўсім штодзённасць, напоўненую цёплымі вобразамі з дзяцінства. У яго карцінах пануе атмасфера шчырасці і рамантыкі, якая міжволі прымушае ўсміхацца. Губараўскія палотны, выпрашаныя з натуральнасцю і добрай іроніяй, робяць на гледачоў розны эфект: хтосьці акунаецца ва ўспаміны, хтосьці ад душы смяецца над сюжэтамі, а хтосьці пачынае разважаць пра вечнае.

Сёння беларускі мастак Валянцін Губараў — вядомы, самастойны, і, як лічаць калегі, паспяховы. А пачыналася ўсё са звычайнага тэлефоннага званка з Масквы 20 гадоў таму. Валянцін тады падняў трубку, і прыемны жаночы голас пацікавіўся ў яго, ці жывы яшчэ мастак Губараў? Потым, калі ён сустрэўся з французамі, гаспадарамі вядомай галерэі, усё ўстала на свае месцы. Высветлілася, што ім выпадкова (ці невыпадкова?) трапіў у рукі маленькі каталог на дрэннай паперы з яго карцінамі. Работы невядомага мастака з Мінска іх здзівілі і зацікавілі. Быў прапанаваны не вельмі цяжкі кантракт, які ён падпісаў, пачаўшы працаваць. Усё гэта Валянцін звычайна распавядае з усмешкай, у якой і здзіўленне, і радасць, і лёгкая, ледзь улоўная іронія. Расказчык ён цудоўны, назіральны, бесстаронні да сябе:

— *Некаторыя крытыкі пра мяне пішуць: "Асноўная асаблівасць яго творчасці — у банальным бачыць небанальнае". А гэта, напэўна, сапраўды*



Валянцін Губараў





так. Мне цікава зазірнуць у невялікі дворык, непарадны пад'езд, звычайную кватэру, дзе цячэ штодзённае жыццё, а ў інтэр'ерах пануюць прадметы, знаёмыя ўсім. І на аснове ўбачанага паспрабаваць зрабіць твор мастацтва. У мяне няма батальных сцэн. Затое заўсёды на карціне ёсць людзі і адносіны паміж імі, часам адзінота... Як правіла, на маіх карцінах жывуць сваім жыццём невялікія правінцыйныя гарады, простыя людзі, якія чакаюць спагады, разумення. Я ні ў якім выпадку не смяюся над сваімі героямі. Я іх люблю, перажываю разам з імі. Я не навуковец-гісторык і не рэжысёр, які здымае гістарычнае кіно, дзе ўсё павінна адпавядаць той ці іншай эпосе. Яго могуць папракнуць у тым, што ён швейную машынку не той мадэлі ў кадр паставіў. А для мяне галоўнае — мастацкі вобраз. І калі некаторыя неадпаведнасці дапамагаюць мне выказаць лепей ідэю, я іх выкарыстоўваю.У асноўным, абапіраюся на памяць, вядома ж, далёка не ідэальную, якую праношу праз сваё жыццё — дзяцінства, юнацтва, дарослаць. Бо чалавек выткан з цяперашняга, мінулага і будучага.

Калі я быў студэнтам Горкаўскага мастацкага вучылішча (цяпер Ніжні Ноўгарад), я адкрыў для сябе імпрэсіяністаў, постімпрэсіяністаў, узмоцнена пісаў нацюрморты, пераймаючы ў Сезана. Потым, у пошуках сябе, прайшоў захапленне кубістамі. Мне ўсё падабалася і хацелася хоць бы трохі наблізіцца да іх. І толькі потым, падчас вучобы на факультэце графікі Маскоўскага паліграфічнага інстытута я намацаў свой почырк. Можна навучыцца гравюры рабіць, афорты, але мастаком пры гэтым не быць, таму што мастак — гэта не тэхнічныя ўменні, гэта ўнутранае "я".

У Мінск прыехаў яшчэ да заканчэння інстытута — на практыку ў вы-











*давецтва "Мастацкая літаратура". Потым атрымаў сюды размеркаванне, хоць былі запрашэнні застацца ў Маскве, у Саратаве выкладаць у інстытуце. Але я прыехаў на радзіму жонкі, з якой пазнаёміўся яшчэ на другім курсе. Я працаваў у выдавецтве, ілюстраваў кнігі, быў мастацкім рэдактарам. Марыў стаць свабодным мастаком і нават вызначыў для сябе рубікон, калі гэта адбудзецца. Вядома ж, я займаўся асабістай творчасцю, але гэтыя мае працы не экспанаваліся на выставах — лічылася, што яны не ў фармаце. Ужо была перабудова, але карціны амаль заўсёды адхілялі па прычыне "недарэчнай іроніі". Тыя графічныя работы, якія часам траплялі на выставы, крытыкі заўсёды лаялі. Але мне ўсё роўна было прыемна, што мяне заўважылі.*

*Напрыклад, неяк я зрабіў амаль рэалістычны партрэт сантэхніка з птушкафабрыкі. Просты хлопец, аматар грыбоў, рыбалкі — чалавек без каменя за пазухай. Я ганарыўся тым, што я ў ім убачыў і перадаў на палатне. Гэта не карыкатура была, у гэтым партрэце выявіліся менавіта тыя якасці, якія характэрныя для маёй творчасці — а мяне за іх якраз і лаялі. Таму што ў той час партрэт на выставе павінен быў паказваць пасяховых, знакамітых людзей. Маленькаму чалавеку было не месца на такіх выставах.*

*Першая праца, якая раптам прагучала на вялікай выставе, называлася "Гульні ў галоснасць". Я нікому не казаў пра свой удзел у той выставе, таму што, калі б сказаў, усе знаёмыя прыпуліліся б да экранаў, а там зноў крытыка. Сяджу адзін, гляджу, і раптам маю працу паказваюць на ўвесь экран і кажуць, што гэтая карціна стала цэнтрам усёй выставы.*

*Назвы карцін для мяне важныя. Было два-тры выпадкі, калі назва "бегла" наперадзе карціны. Але часта бывае, што праца зробленая, а назвы няма. Называць працу "Вечарэла" або "Змяркалася" не хочацца, але і літаральныя назвы таксама не падыходзяць. Я імкнуся, каб была прастора для гледача, яго фантазіі. Назваў, якія перапяваюць радкі з твораў масавай культуры, я пазбягаю, таму што гэта штампы, хоць, справядлівасці дзеля трэба сказаць, што адно ў мяне ўсё ж такі маецца. Часам людзі, называючы свае карціны або фатаграфіі ў інтэрнэце, выкарыстоўваюць гатовыя клішэ, якія на слыху, але гэта самы лёгкі шлях. Вось, напрыклад, у мяне ёсць карціна, на якой намаляваная дзяўчынка ў зімовым яблыневым садзе — я не мог назву прыдумаць вельмі доўга. Хтосьці прыйшоў і кажа, ды ўсё ж проста — яблыкі на снезе. Але ж гэта банальна. А карціну ўжо трэба было перадаваць на выставу. Не здолеў прыдумаць нічога асаблівага, назваў проста "Сад".*

*Калі б мне сёння сказалі: трэба некалькі вашых карцін для вельмі важнага зборніка — з двухсот я выбраў бы ўсяго чатыры ці пяць. Калі трэба апублікаваць свае працы, пачынаеш сумнявацца: у гэтай я не дамогся таго, чаго хацеў, а гэтая нейкая прахадная, а тут сюжэт дробны, а гэтая па тэхніцы не дацягвае. Хоць некаторыя карціны для сябе я ацэньваю, як хрэстаматыйныя, тытульныя. Неяк я прыехаў у Аўстрыю, мне ўручылі каталог аўкцыёну "Крысціс" у Лондане. І я са здзіўленнем убачыў на вокладцы адну з маіх любімых карцін "Аглядальнік".*

***— Усё ж такі, як даўно вы прыйшлі да сваёй карыкатурнай манеры?***





***Якія творчыя эксперыменты гэтаму папярэднічалі?***

— У мяне зусім тыповы для мастака шлях — маляванне з дзяцінства, студыя выяўленчага мастацтва, гіпсавыя арнаменты, Венера Мілоская, Сакрат, Давід, нацюрморты з васковымі яблыкамі і збанамі, пудзіла сарокі... Жаданне было адно: намаляваць "так, як ёсць на самой справе".

Імпрэсіяністы і постімпрэсіяністы — гэта адкрыццё зрабіла на мяне вялікае ўздзеянне. Аж да паступлення на факультэт графікі Маскоўскага паліграфічнага інстытута, я з энтузіязмам асвойваў жывапісную манеру Манэ, Сезана, а затым Ван Гога, Маціса і Рэнуара. Потым плаўна перайшоў да кубістаў, да Пікаса. Цяпер я разумею, што так працягваўся шлях маёй самаадукацыі і пошуку уласнай творчай харызмы.

***— Вы згадвалі, што ў свой час на вашы працы паставілі кляймо "недарэчнай іроніі". Як думаеце, чаму так адбылося?***

— Іронія ва ўсе часы насцярожвае чыноўнікаў. Так было і так будзе заўсёды. А калі да іроніі дадаецца гратэск — гэта палохае. Спакайней, калі прадмет мастацтва выклікае ў гледача толькі блажэннае задавальненне.

***— Але і сярод гратэскавых работ вашы — не палохаюць, па меншай меры, гледача. Скажыце, вы наўмысна задумваецеся над такой падачай?***

— Калі пісаць карціны — гэта мастацтва, то вылучыць з банальнага небанальнае — гэта вялікае мастацтва.

***— Дзе вы чэрпаеце матэрыял для адлюстравання чалавечага жыцця?***



— Мае персанажы на карцінах — гэта звычайныя людзі. У некаторых крыху не хапае шчасця, але яны пра гэта нават не згадваюцца. Я сам люблю такіх людзей: простых і добрасардэчных, гатовых дапамагчы і спачуваць, якія не ўмеюць крывадушнічаць і інтрыгаваць.

***— Не ловіце сябе на тым, што ствараеце працы, якія патэнцыйна могуць стаць дзівам для замежнікаў?***

— Я шчаслівы ў творчасці чалавек. Таму што ніколі не працаваў, улічваючы нечыя інтарэсы і густы. У гэтым плане я зусім безадказны, пішу толькі тое, што падабаецца самому. Гэта такі сумленны і самазабыўны працэс, як песня якой-небудзь лясной птушкі. А ўжо калі аналізаваць, то будзе ясна, што звернуты мастак перш за ўсё да нашага гледача. Таму што ён пазнае там свой дом, сваё першае спатканне, сваё зорнае неба над галавой. А галоўнае — ён пазнае там сябе. Для мяне Радзіма — гэта не новыя тралейбусы або пункты абмену валюты. Гэта нешта вечнае. Тое месца, дзе любяць і раўнуюць, дзе на берагах туманных азёр сядзяць рыбакі, а на лавачках паранейшаму цалуюцца парачкі... Гэта тое месца, дзе прайшлі маё дзяцінства і юнацтва. І гэта ўсё мне дорага і ў гэтым я чэрпаю натхненне. Нарадзіся я на Каўказе, — пісаў бы горы, а жыў бы ля мора-стаў бы марыністам. Іншымі словамі, гэта экалагічна чыстае мастацтва, заснаванае на асабістых перажываннях. Прычым вельмі глыбокіх. Мастацтва -гэта не спорт і не кулінарыя. Толькі "загразнуўшы" ў ім глыбока, можна чагосьці дамагчыся. Пабудаваць мост без апор, вырашыць цяжкую тэарэму, стварыць кірунак у жывапісу... Левітан "заграз" у пейзажах, і ў гісторыі мастацтваў ён застанецца як непераўзыдзены пейзажыст.







Мастак ўсё жыццё можа пісаць толькі кветкі, не прыгнятаючыся думкай, што да яго ва ўсе стагоддзі гэта ўжо рабілі.

***— На вашых карцінах жанчыны заўсёды намаляваныя пышачкамі — гэта асабістая пераважнасць?***

— Я звяртаю ўвагу на жанчын з формамі, якія якраз і адрозніваюць жаночую фігуру ад мужчынскай. Жанчына павінна быць жаноцкай! І на мае карціны трапляюць не дзяўчаты з мадэльных подыумаў, больш падобныя на лыжныя палкі, а менавіта тыя дамы, якіх я сустракаю ў ашчадкасе, у метро, у супермаркеце. Плюс — невялікі гратэск.

***— Тады скажыце, хто вашыя любімыя мастакі сёння?***

— Мне падабаецца творчасць многіх мастакоў, як далёкага мінулага, так і сучаснасці. Назаву некалькі імёнаў: Вермеер, Ван Эйк, Рублёў, Леанарда Да Вінчы, Люсьен Фрэйд.

***— А калі вас называюць "беларускім Брэйгелем", згаджаецеся?***

— Хай завуць, як хочуць. Хай Брэйгелем, хай Пятровым-Водкіным... Раблю сваю справу.

***— Ці ўдала прадаваліся вашы карціны на аўкцыёнах, якія вынікі ўдзелу ў іх?***

— У мяне быў паспяховы вопыт удзелу ў буйных аўкцыёнах Еўропы. Сярод іх адзначу продаж карцін на "CHRISTIES" у Лондане, а таксама "DROUOTRICHELIEV" у Парыжы.

***— Нярэдка пасля выстаў або навін аб продажах на прэстыжных аўкцыёнах мастак атрымлівае выгадныя заказы. Ці ствараеце вы працы на заказ, і, як лічыце, наколькі гэта шкодзіць ці карысна мастаку?***

— Асабіста я не люблю працаваць на замову. Напэўна, проста распешчаны тым, што ёсць магчымасць увасабляць у жыццё свае мары і ідэі. Таму праца і прыносіць мне задавальненне. Каб з задавальненнем працаваць над заказной тэмай, трэба палюбіць яе як сваю, а гэта не заўсёды ўдаецца. Хоць сама па сабе "праца на заказ" зусім не шкодзіць мастаку — наадварот, узбагачае яго новым вопытам і дае сродкі на існаванне.



***— Ваша стаўленне да жыцця змрочным не назавеш, ці не так?***

— Мая жыццёвая філасофія наогул складаная: жыццё кароткае. Чыстыя намеры, праведныя ўчынкі і каханне ў сэрцы — гэта тое, што робіць яе не выпадковай.

*А вось як аўтар, якога вельмі палюбілі ў Францыі, распавядае пра тое, чым беларускія музеяў адрозніваюцца ад французскіх:*

— Французы па-іншаму ставяцца да мастацтва. Нашы людзі прыходзяць на выставы падрыхтаваныя: маўляў, ну што вы зараз пакажаце? Замежнага гледача прыцягвае сама творчасць. Ён можа ісці дадому пасля працы і забегчы ў галерэю за ўражаннямі. Яны радуюцца любой праяве мастацтва, радуюцца і прадчуваюць задавальненне.

*Так, заходнія крытыкі празвалі Губарава "беларускі Брэйгель", але сам мастак лічыць, што з-за таго, што французы не да канца разумеюць наш менталітэт, рэцэнзіі ў замежных выданнях атрымліваюцца павярхоўнымі.*

— Там пра мяне пішуць шмат, але я асабліва не сачу. Я спадзяюся, што водгукі станоўчыя. Думаю, яны такія, раз працы замаўляе галерэя. Бо яна не будзе псаваць сабе рэпутацыю. Цяпер нават вернісаж ужо не адзін дзень робіцца, а два. Першы — для пакупнікоў і тых, у каго ўжо ёсць мае працы, а другі — для ўсіх. Крытыкам падабаецца, што гэта арыгінальна. Але менталітэт яны не разумеюць да канца. Яны ўспрымаюць толькі станоўчую энергетыку, дабрыню.

*Валянцін Губараў дастаткова самакрытычны. Вось як ён разважае аб сваёй творчасці:*

— Я лічу, што калі ты ёсць, ты якбы ствараеш свой мікракосмас. Мае працы, спадзяюся, запамінальныя. Мастацтва ж, па маім цвёрдым перакананні, павінна быць шурпатым. З глянцавай паверхні ўсё саскоквае. А шурпатае мастацтва прымусіць спыніцца, паглядзець, а потым калі-небудзь успомніць пра гэта.

Веніямін **Міхееў.**

Фота аўтара.



Захад сонца над Свіслаччу

# КРАІНА
# Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ




## Часопіс для тых, хто жадае ведаць больш

ISSN 0320-7544